BYELORUSSIAN BASIC COURSE

# INSTRUCTIONAL MATERIALS ON READING AND LISTENING

## IN SUPPORT OF THE FLO SUBSKILLS (*GISTING, TRANSCRIPTION, SUMMARIZING, TRANSLATING, ANSWERING QUESTIONS, ETC.*) REQUIREMENTS

(42-nd through 44-th week of instruction)

AUGUST 30, 1995

EAST EUROPEAN SCHOOL I

# Acknowledgment

Some text and graphics used in the Byelorussian basic course have been taken from the following Byelorussian publications, which have given written permission to use them:

Byelaruski Chas
Chyrvonaja Zmena
Litaratura i Mastactva
Respublika

1. Паважаныя чытачы! Шэсць дзён засталося каб зрабіць падпіску на нашу газету з дастаўкай з 1 студзеня 1994 года. Падпіска зробленная пасля 15 лістапада, дасі вам магчымасць атрымліваць «Рэспубліку» толькі з лютага.

   Спазненне толькі на адзін дзень пакіне вас без газеты на месяц. Падпіска прымаецца без абмежаванняў усімі аддзяленням і сувязі і органамі друку. Кошт падпіскі на 6 месяцаў — 5800 руб., на год —10600 руб.

2. Галоўным універсітэтам Расіі завецца Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя М. В. Ламаносава. Яго гісторыя налічвае без малога тры стагоддзі. Заснаваны ў сярэдзіне 18-га стагоддзя ўніверсітэт па праву ганарыцца сваімі выпускнікамі і прафесарамі. Тут вучылася шмат вядомых вучоных, зрабіўшых адкрыцці ў розных галінах навукі і тэхнікі. Цяжка нават пералічыць усе спецыяльнасці, якія дае ўніверсітэт сваім выхаванцам. Цікава і архітэктура самаго будынка.

3. Паводле даных замежнага друку, у 1982-1986 гадах ваенна-паветраныя сілы ЗША атрымалі звыш 1700 крылатых ракетаў паветранага базіравання, маючых максімальную далечыню палёту 2600 км, дакладнасць стральбы 30 м і адзерную баявую частку магутнасцю 200 кілатон.

4. Спартсмены зборнай Аўстрыі у адборачным матчы чэмпіяната свету (2-я еўрапейская група) на сваім полі перамаглі каманду з Албаніі — 3:2(2:0). Унічыю - 1:1(1:1) згулялі ў Цюрыхе каманды футбалістаў зборных Даніі і Балгарыі (1-я еўрапейская група).

5. ЕРЭВАН. 31 кастрычніка. Сёння ў 15 гадзін 34 мінуты па мясцоваму часу ў Арменіі адбыўся землятрус. Яго эпіцэнтр знаходзіцца ў 8-мі кіламетрах ад раённага цэнтру Гукасян, у рэгіёне, дзе ў снежні мінулага года таксама быў моцны землятрус. Як паведамляе штаб землятрусу, моц штурчка вагалася паміж 5—5,5 балаў па шкале Рыхтэра.

6. Паўднявая Карэя і Польшча наладзілі дыпламатычныя адносіны ў поўным аб'ёме і, таксама, падпісалі гандлёвае пагадненне. Такім чынам, Польшча стала другой дзяржавай з краін Усходняй Еўропы пасля Венгрыі, якая наладзіла дыпламатычныя адносіны з Сеулам.

7. Узімку ў Мінску магчыма ўбачыць гэтакую незвычайную карціну. Нават ў дваццаціградусны мароз не спыняюць трэніровак зімовым відам плавання маржы — гэтак клічуць сябе аматары гэтага віду спорта. Клічуць сябе гэтак у гонар марскіх жывел, якія жывуць на Поўначы і не страшацца лютых халадоў. Вы можаце ўбачыць як азартна плаваюць у плынях не толькі спартыўнага целаскладу мужчыны, але і жанчыны і, нават, маленькія дзеці.

   Калі хочаш быць здаровы — загартоўвайся. І гэта сапраўды так. Аматары зімовых відаў спорту прыхільны гэтаму цалкам.

8. Гаворка пойдзе аб расійскіх антарктычных экспедыцыях, якія ў той час працавалі з палярнікамі іншых краін. У тым ліку і з амерыканцамі, і з італьянцамі. Вам, напэўна, вядома, што такая садружнасць існуе яшчэ з 30-х гадоў. Тады, калі разам з расійскімі палярнікамі, на Паўночным полюсе ў Арктыцы, працавалі выратавальнікі з розных краін у пошуках вядомай экспедыцыі генерала Нобіле. Але, на жаль, тады іх напаткала няўдача.

9. Эль-Кувейт. Кувейтскі танкер «Саўдыя » падвергнуўся нападзенню з боку іранскага вайсковага карабля ў Армузскім праліве, паведамляе мясцовы друк. На танкеры ўзнікнуў пажар, аднак дзякуючы намаганням судоў Амана полымя ўдалося загасіць, экіпаж быў выратаваны. Усяго за перыяд так званай танкернай вайны з красавіка 1984 года было пашкоджана каля трохсот цывільных судоў, у выніку чаго загінула больш за сто чалавек.

10. Першапачаткова прыняцце на ўзбраенне новай ракеты, атрымаўшай індэкс AGM-129 A, было запланавана на 1992 год, але з-за няўдачы на першых выпрабаваннях гэты час быў адкладзены. Мяркуецца да 1995 года. У бягучым годзе, паведамляе тыднёвік «Джэйн'с дифэнс», у ракеты зноў знайдзены цэлы рад канструктыўных недахопаў, у выніку чаго толькі 50 працэнтаў пускаў, ажыццяўляемых у асноўным з бамбардзіроўшчыка B-52H, з'явіліся паспяховымі.

11. Швецыя. Пяць палотнаў Пабло Пікасо і дзве карціны аднаго з заснавальнікаў кубізму Жоржа Брака выкрадзены са стакгольмскага Музея сучаснага мастацтва. Іх агульны кошт перавышае 62,5 мільёна даляраў. Паліцыя вядзе расследаванне.

12. Рым. Павадка і засуха — гэтыя прыродныя з'явы бягучай восені — бушуюць адначасова ў розных раёнах Італіі. Калі на Поўначы пакутуюць ад лішка вады, дык на Поўдні — ад нястачы вільгаці. З першага верасня ў Неапалі рэзка абмежавана падача вады. Прычына склаўшагася цяжкага становішча, як піша газета «Віва», не толькі ў цяперашней моцнай засухе, але і ў затрымке будаўніцтва новага вадаправода, які будуюць ужо 10 год.

13. У мінулым годзе ў Чэхіі нараджальнасць склала 13,8 дзіця на кожную тысячу жыхароў, у той час калі ў 1980 годзе — 16,3. Панізілася смяротнаць. Гэта прывяло да некаторага павялічэння сярэдней працягласці жыцця ў краіне. Сярод мужчын яна дасягнула ў мінулым годзе 67,5 года, сярод жанчын — 74,9. Наогул, у Еўропе гэтыя паказчыкі складаюць адказна 70 і 77 год.

14. Самалёт-выратавальнік берагавой службы прыняў на борт 25 членаў экіпажу польскага грузавога судна, якое ў выніку няспраўнасці рухавіка страціла кіраванне і пад уплыбам моцнага ветру дрэйфавала ў бок скалістых

берагоў Нарвегіі, паведамілі мясцовыя ўлады. Астатнія 9 чалавек каманды карабля спрабуюць ліквідаваць няспраўнасць.

15. Рэдкае відовішча: вялікія сланы вядуць зусім маленькага слоніка. Тут адразу бачны прынцыпы паводзін у слановай сям'і: найбольш слабых — у сярэдзіну, максімальная ахова — дзецям. Пры наяўнасці пяшчотных адносін сланоў да свайго патомства (а яны традыцыйна такія) і клапатлівых адносін з боку людзей магчыма спадзявацца, што гіганты зямлі, не вельмі страцаць у ліку, і разам з людзьмі ўступяць у трэцяе тысячагоддзе.

16. У Кіёта вялікай вядомасцью карыстаецца «Дзідаі Мацуры» — свята мінулых стагоддзяў. У кастрычніку па вуліцах горада праходзіць святочная працэсія, якая налічве да двух тысяч удзельнікаў. Адзінаццаць стагоддзяў гісторыі японскай сталіцы — з VIII да XIX стагоддзя — адлюстраваны ў касцюмах працэсіі, вылучанных, з гістарычнага пункту гледжання, з найвялікшай дакладнасцю. З кожным годам свята праходзіць усё больш узрушана. І гэта сапраўды: прыйшоў 1994 год, а з ім — дата, калі японцы святочна сустрэлі 1200 год са дня існавання Кіёта.

17. Агенцтва Рэйтар перадае з Дамаску: Афіцыйная сірыйская газета «Сірыя таймз» надрукавала артыкул, у якім рэзка крытыкуюць егіпецкія ўлады, якія аддалі загад аб арышце сына Гамаль Абдель Насэра. Халед Абдэль Насэр абвінавачваецца ў тым, што ён даваў грошы групу, якая праводзіла тэрарыстычныя акты супраць ізраільскіх і амерыканскіх службовых асоб. Тры месяцы таму ён пакінуў Егіпет.

18. Пасажырскі цягнік, які ішоў у Мапуту з Ресана-Гарсія, горада на мяжы паміж Мазамбікам і Паўднёва Афрыканскай рэспублікай, пацярпеў крушэнне, узарваўшыся на міне, а потым быў атакаваны бандытамі з так званага «мазамбікскага нацыянальнага супраціўлення». Як паведаміла радыё Мазамбіка, гэта здарэнне адбылося прыкладна ў 40 км ад сталіцы. У выніку тэрарыстычнага акту загінулі прыкладна 8 пасажыраў, 35 былі паранены. Як мяркуюць, прычынай аварыі стала выбуховае прыстасаванне з дыстанцыйным кіраваннем.

19. Сёння Пінск можна смела назваць горадам банкаў. Днямі тут адбылася прэзентацыя яшчэ адной такой установы, ужо дзевятай па ліку, установы — Пінскага філіяла акцыянернага камерцыйнага банка «Пошук». Установа гэта новая, але заяўляе сёння аб сабе сур'ёзна. На сённяшні дзень «Пошук» прапаноўвае вельмі неблагія працэнтныя стаўкі: ад 100 да 250 працэнтаў.

20. «Чума» XX стагоддзя - СНІД — нечаканым чынам уплываў на маральныя асновы датчан, паведамляе агенцтва Франс Прэс, са спасылкай на апытанне, праведзенае ў гэтай краіне інстытутам Гэлапа. На думку большасці апытаных, змагацца супраць СНІДА патрэбна не толькі пры дамамозе прапаганды процізачатковых сродкаў, але ў першую чаргу

шляхам абароны сям'і і ўзмацнення маральнага клімата ў грамадстве. Падкрэсліваецца таксама, што свабода нораваў, асабліва характэрная для пачатку сямідзесятых гадоў, не зрабіла людзей больш шчаслівымі.

21. Урокі роднай мовы атрымаюць для сябе курсанты Мінскага вышэйшага ваеннага інжынернага вучылішча, пазнаёміўшыся з аднайменным дапаможнікам, падрыхтаваным Л. Карабельнікавай і Н. Снагоўскай. Наклад яго, праўда, не такі і вялікі, усяго 700 асобнікаў. Ды, як кажуць, для сваіх людзей і гэтага хопіць. Галоўнае ж, што ў вучылішчы разумеюць — у беларускай дзяржаве і войска мусіць быць сваім, беларускім, а, значыць карыстацца і роднай мовай.

22. Будзьце вясёлыя, шчаслівыя, не засмучайцеся і не злуйце! — Добрая парада, толькі як гэта зрабіць у наш, такі напружаны час? Як гэта выканаць — кожны вырашае для сябе сам, але сапраўды, што пад гэтым «рэцэптам» ляжыць тэарытычная база, навуковы факт. Доктар Рэдфорд Уільямс з універсітэта Д"юка (ЗША) ажно 25 гадоў працаваў над праблемай шматгоддзя. Сакрэт вечнай маладосці ён, па праўдзе кажучы, не разгадаў, затое выявіў, што ў людзей схільных да сварак, незадаволеных, раззлаваных у 5 разоў больш шанцаў не дацягнуць да пяцідзесяці гадоў, чым у людзей вясёлых. Такім чынам, усміхайцеся!

23. Настольнай кнігай стане для кожнага дзелавога чалавека бізнес-даведнік «Уся Беларусь». Ён павінен выйсці ўжо сёлета восенню з дапамогай фінскага выдавецтва «Турун Санамат». Даведнік уключае ў сябе разнастайную інфармацыю аб прадпрыемствах, арганізацыях, кампаніях, фірмах, усіх відах уласнасці, якія дзейнічаюць на тэрыторыі рэспублікі, ён будзе неабходным дапаможнікам для кожнага, хто займецца бізнесам, дазволіць лёгка зарыентавацца, то ёсць на беларускім рынку. Плануецца. што бізнес-даведнік «Уся Беларусь» выйдзе тыражом 50 тысяч экземпляраў і будзе распаўсюджвацца не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах СНД і Еўропы.

24. Вынаходніцтва ў вайсковай справе, напэўна, мала чым адрозніваецца ад вынаходніцтва ў цывільным свеце. Усюды канкурэнтная барацьба, скандалы вакол фіктыўных сааўтараў. На самой справе вынаходнікаў кулямёта не менш чым вынаходнікаў веласіпедаў.

Нагадаем адзіны случай — можа стацца самы кур'ёзны з усіх. У 1718 годзе англійскі юрыст Джэймс Пакл запатэнтаваў машыну, якая магла лічыцца папярэднікам (ажно за паўтарастагадоў) сучаснага кулямёта. Машына выпускала па кулі кожную хвіліну.

25. Ва Узбекістане арыштавана і асуджана злачынная група, якая выкрадала дзяцей з мэтай выкупу. Па паведамленню пракуратуры Узбекістана, тры маладыя жанчыны, якія ўкралі 7-гадовага хлопчыка і 6-гадовую дзяўчынку, прыгавораны да 8 гадоў пазбаўлення волі. Праваахоўныя органы ўзбекскай сталіцы вярнулі дзяцей бацькам.

26. Вядучая ў нашай краіне арганізацыя па барацьбе з аўтамабільным «смогам» — узялася за аснашчэнне звычайнага аўтарухавіка цэлым комплексам сродкаў, зніжаючых яго таксічнасць. Да справы далучыліся і балгарскія спецыялісты.

27. Да непазнавальнасці змяніўся адзін з самых прыгожых гарадоў Амерыкі — Сан-Францыска пасля разбуральнага землятруса моцнасцю ў 7 балаў па шкале Рыхтара. Падземны штуршок быў зарэгістраваны сейсмолагамі ў 17 гадзін 4 мінуты па мясцоваму часу ва аўторак. Ягоны эпіцэнтр знаходзіўся прыкладна ў 120 км на поўдзень ад Сан-Францыска, побач з курортным горадам Санта-Круз. Наогул, у гарадах і насельных пунктах загінула калі 300 чалавек і прыкладна 1000 атрымалі раненні.

Найбольш цяжкія пашкоджанні ў Сан-Францыска атрымаў жылы раён Марына, дзе абрушыліся 45 будынкаў сярэдняй вышыні. Адзін будынак узарваўся з-за ўцечкі газа.

28. Сафія. Як паведаміў у суботу мясцовы друк, 3 верасня затрыманы парушальнік балгарска-грэчэскай граніцы, які пры затрыманні спрабаваў карыстацца зброяй і быў забіты. Знайдзенныя дакументы сведчаць, што гэта турэцкі жыхар. Па інфармацыі грэчэскіх пагранічных улад, ён учыніў забойства на тэрыторыі Грэцыі — аднаго чалавека забіў і другога параніў. Параненыя ў час перастрэлкі два балгарскія пагранічнікі дастаўлены на верталёце ў Сафію для аказання ім медыцынскай дапамогі.

29. 12 красавіка - Сусветны дзень авіяцыі і касманаўтыкі. Для Беларусі гэтае вята мае асаблівае значэнне, бо сярод першых дзесяткаў людзей, якія ведалі адсутнасць зямнога прыцягнення, ёсць і два беларусы - Пятро лімук і Уладзімір Кавалёнак, бо, урэшце, і першы касманаўт Зямлі Юрый Гагарын таксама крыху беларус — ён ураджэнец Смаленшчыны, зямлі, якую спрадвеку называлі беларускай.

30. Новыя віды прадукцыі: 4 мадэлі тумбаў для тэле-радыёапаратуры і абутку — прапаноўвае галандскім спажыўцам Мазырская мэблевая фабрыка. Усе гэтыя вырабы вызначаюцца дызайнам і высокай якасцю выканання. Агульны аб'ём паставак у Галандыю па дагаворах, якія заключаны, складзе 26 % ад усяго аб'ёму вырабаў мэблевай фабрыкі. Гэта тым больш выгадна прадпрыемству, паколькі мясцовыя заказчыкі — гандлёвыя прадпрыемствы Беларусі — не маюць грошы, каб плаціць (неплацежаздольныя).

31. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета за вялікі і выключны ўклад ў развіццё фізкультуры і спорту, дасягненне высокіх спартыўных вынікаў на XVII зімовых Алімпійскіх гульнях у Ліллехамеры заслужанаму майстру спорта Ігару Жэлезоўскаму прысвоіць ганаровае званне «Заслужаны працаўнік фізічнай культуры і спорту Рэспублікі Беларусь».

32. Брытанскі парламент прыняў новы закон, які выкараніць хуліганскія выпадкі футбольных аматараў. У адпаведнасці з законам, паведамляе газета, уводзяцца асабістыя карткі для аматараў усіх 92 ангельскіх клубаў. Яны стануць своеасаблівым пропускам на стадыёны, дзе будуць усталяваны спецыяльныя электроныя турнікеты, якія будуць чытаць і трымаць у памяці прозвішчы аматараў. Заўважаныя ў хуліганскіх выхадках будуць пазбаўлены не толькі сваіх картак, але і доступа на футбольныя матчы.

33. Вольга Іпатава была госцем чытачоў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Прысутныя мелі магчымасць нямала даведацца не толькі пра паэтычную і празаічную працу пісьменніцы, а таксама пра яе паездку ў Злучаныя Штаты Амерыкі, пасля якой разам з рэжысёрам телебачання Валерыяй Скварцовай была падрыхтавана серыя перадач, што паказвалася на Нацыянальным тэлебачанні. А яшчэ, як прызналася на сустрэчы Вольга Міхайлаўна, вынікамі паездкі стаў яе паэтычны цыкл «Эмігрант».

34. Даўнюю задумку ажыццявіў калектыў настаўнікаў і вучняў першай і пакуль што адзінай у горадзе Маладзечна беларускай гімназіі. Тут адкрыта «Беларуская хатка» — музей-кабінет нацыянальнай культуры і быту. Дарослыя і дзеці з густам аформілі «пад даўніну» адзін з класаў, сабралі арыгінальную ручной работы мэблю, прадметы сялянскага ўжытку і быту .

Значную фінансавую дапамогу ў стварэнні «Беларускай хаткі» аказалі гімназіі спонсары з ліку дзяржаўных і камерцыйных структур. На цырымоніі адкрыцця «хаткі» прадстаўнікі гарадскіх улад паднеслі гімназіі палатно вядомага мастака Харашэвіча «Ускраіна Маладзечна».

35. Здаецца, што ўдзел у культурным жыцці нашай краіны выдатных амерыканскіх музыкантаў становіцца добрай традыцыяй. Зусім нядаўна Беларусь наведваў дырыжор Ніл Сталберг, і вось амаль следам — славуты піяніст Джозэф Банавец. Спадар Банавец — прафесар Паўночнатэхаскага ўніверсітэта. У Беларусь ён быў запрошаны для правядзення майстра- класаў у Акадэміі музыкі і канцэртнага выступлення, якое адбылося 27 сакавіка ў Вялікай зале філармоніі. Сваім артыстызмам і выкананнем ён проста зачараваў аўдыторыю.

36. Дыплом за ўдзел у III Міжнародным фестывалі атрымалі беларускія выканаўцы. Фестываль быў наладжаны з 2 па 17 красавіка, канцэрты праходзілі ў Расійскай акадэміі мастацтваў, музеі Шаляпіна, культавых будынках і г.д. Больш за 10 краін былі прадстаўлены ў фестывальнай мазаіцы: Італія і Украіна, Англія і Беларусь, ЗША і Паўднёвая Карэя... Беларускі інструментальны дуэт меў канцэрт у арганай зале музея імя М. Глінкі. Выступаў таксама наш выдатны піяніст Ігар Алоўнікаў. У інтэрпрэтацыі беларускіх майстроў гучала такая папулярная сёння старадаўняя еўрапейская музыка...

37. Нядаўна ў Японіі ўбачыла свет чарговы дапаможнік па этыкету. Тут важна падкрэсліць, што гэта менавіта японскі дапаможнік, і ў іншых краінах яго наўрад ці ацэняць. Важная частка правілаў добрага паводжання ў Японіі — паклоны. Прынамсі, пятнаццаці паклонаў, напрыклад, дастаткова для трывіяльнага прывітання. Каб зрабіць добрае ўражанне, трэба кланяцца сорак пяць разоў, асаблівую пашану выказваюць сяммюдзесяццю пяццю паклонамі, а самую паважаную асобу вітаюць пакланіўшыся дзевяноста разоў запар.

38. Збяднела выглядаюць у выхадныя дні вуліцы раённага цэнтра Іванава. Няма звычайнага ажыўлення таму, што не едуць сюды вяскоўцы.

Віноўнік гэтага — мясцовы аўтапарк. З 6 сакавіка яны ўвялі на суботу-нядзелю і святочныя дні выключна камерцыйныя рэйсы на ўсе прыгарадныя аўтобусныя маршруты. Хочаш ехаць плаці 100 рублёў за адзін кіламетр. Ну, а паколькі ніякіх ільгот і скідак не прадугледжана, то пераважна пенсіянерскае насельніцтва вёсак вымушана пакуль што забыць дарогу ў раённы цэнтр.

38. Ажыццяўленне плана па скарачэнню Ўзброеных Сіл Беларусі знайшло сваё адлюстраванне ў жыцці беларускага калгаса «Мара». Калгас атрымаў участак зямлі, дзе да нядаўняга часа знаходзілася вайсковая часць, якая была ліквідавана. У вядзенне калгаса перайшлі таксама і шляхі, гаражы і іншыя будынкі. Зараз ідзе перабудова вайсковых будынкаў пад півавараны і ліманадны цэхі, у адным з памяшканняў будзе каўбасны цэх і іншыя сельскагаспадарчыя вытворчасці.

39. Як паведамляе двухмоўны беластоцкі «Часопіс», у гайнаўскім агульнаадукацуйным ліцэі з беларускай мовай навучання абвешчаны Першы агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы «Дэбют». Вучняў, якія да канца красавіка прадставяць творы, напісаныя беларускай літаратурнай ці дыялектнай моваю, чакаюць тры грашовыя прэміі: за 1-е месца — паўмільёна злотых, за 2-е месца — 300 тысяч злотых, за 3-е месца — 200 тысяч злотых. У журы конкурсу ўвайшлі вядомыя літаратары з Беластоку. Апеканне «Дэбютам» узяў дырэктар ліцэя ды Клуб беларускіх спраў...

40. Што такое смецце? Кожны можа адказаць па рознаму, але вось дакладныя лічбы па Велікабрытаніі. Смецце — гэта мінімум 20 тон адходаў у год, паступаючых з жылых дамоў, крамаў і прамысловых прадпрыемстваў. Усю масу пажадана знішчыць, пахаваць ці утылізаваць. Скажам, што рабіць з 9 міліярдамі кансервных бляшанак — зразумела: каляровыя металы патрэбны для індустрыі. А як стацца з 6 міліярдамі бутэляк? Перапрацоўка іх — змяльчэнне і выпрацоўка новай шкляной масы — патрабуе столькі ж энергіі, колькі і выпрацоўка новага посуда. Праблема...

41. Незвычайны і вельмі каштоўны падарунак немаўлятам падрыхтаваў вядомы дзіцячы пісьменнік Уладзімір Ліпскі. Ён пераказаў у цікавых гісторыях самую старажытную кнігу — Біблію. Прычым упершыню пасля Францыска Скарыны зрабіў гэта на роднай беларускай мове. Кнігу з цудоўнымі малюнкамі мастака Уладзіміра Пашчасцева, якую выпусціла выдавецтва «Беларусь», высока ацаніў Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт — патрыяршы экзарх усея Беларусі.

42. Карэспандэнт Рэйтар перадае з Злучаных Штатаў: прэзідэнт ЗША падпісаў законапраэкт аб далучэнні ЗША да міжнароднай канвенцыі, накіраванай супраць генацыду.

Агенцтва адзначае, што канвенцыя была прынята ААН у 1984 годзе, а законапраэкт ад далучэнні ЗША да яе быў у тым жа годзе падпісаны прэзідэнтам Трумэнам. Але кансэрватыўныя сілы ў кангрэсе выступілі супраць, лічучы , што далучэнне да дагавору «ушчамляе суверынітэт» краіны. Толькі ў 1986 годзе сенат ратыфікаваў законапраэкт.

43. Усім вядома, што лекі нельга захоўваць бясконца, з часам яны страчваюць сваю эфектыўнасць. Але ці ведаеце вы, што тое ж самае датычыць і медыцынскіх тэрмометраў.

У артыкуле, які нядаўна надрукаваў «Амерыканскі часопіс дагляду за хворымі», ідзе гаворка пра іспыты больш за двесці градуснікаў. Спачатку, калі яны былі зусім новыя, з іх знялі паказанні ўпершыню, а потым зноў праверылі пасля 10 месяцаў, але імі карысталіся толькі першыя два месяцы, а потым восем месяцаў імі ніхто не карыстаўся і яны ляжалі без справы. Вынікі здзівілі дактароў. Калі яны былі новыя, амаль усе градуснікі паказвалі тэмпературу з дакладнасцю да адной дзесятай, а праз дзесяць месяцаў высвятлілася, што чвэрць усіх тэрмометраў даюць недакладныя лічбы.

44. Хатнім арсеналам агністрэльнай, выбуховай і халоднай зброі, выпадкова выяўленага кампетэнтнымі органамі на кватэры дырэктара бабруйскай фірмы «Белшынасувязь», бадай, можна было б узброіць цэлы атрад: пісталет Макарава, рэвальвер, вінчэсцер, баявая граната, міліцэйская дубінка, набор далёка не кухонных нажоў, патроны, наручнікі і іншае — усё гэта канфіскавана ва ўзброенага да зубоў, скажам там, «аматара-калекцыянера» ... Цікава, якое тлумачэнне ён дасць праваахоўным органам наконт такой больш чым дзіўнай калекцыі ?

45. Беларусь у адпаведнасці з Дагаворам аб звычайных Узброеных Сілах у Еўропе да 24 чэрвеня павінна пераабсталяваць 15 баевых самалёта, пасля чаго яны працягнуць службу толькі ў якасці вучэбна-матэрыяльнай часці. Пераабсталёўваць будуць толькі тыя самалёты, якія ўжо выпрацавалі свае матарэсурсы і якія маюць мяжу трываласці. Два «МІГі» — «27-ы» і «29-ы» складуць экспазіцыю ў будучым музеі Узброеных Сіл рэспублікі.

46. На думку сібірскіх вучоных, існуе залежнасць паміж землятрусамі і змяненнем траекторыі полюса Зямлі. Геаграфічныя палюсы планеты рухаюцца і «малююць» спіралі, якія часам пашыраюцца, часам сыходзяцца. Калі-некалі ў павольным малюнку ўзнікаюць адхіленні. Вызначылася, што яны суадносяцца з падземнымі штуршкамі. Калі радыус траекторыі малы, моцных землятрусаў не здараецца. Час ад змянення траекторыі да падземных штуршкоў — ад 10 да 13 дзён. Перамяшчэнне палюсоў звязана і вывяржэнне вулканаў.

47. За два месяцы навучылі сямікласнікаў адной са школ сталіцы размаўляць на французскай мове пяцікурснікі інстытута замежных моў.

Галоўнае ў іх метадыцы наступнае: замест урокаў — гульня. Выключэнні складалі толькі першыя урокі, на якіх з дапамогай мімікі і жэстаў быў дадзены першы «зарад» лексікі і тэхнікі вымаўлення. Спачатку браліся сітуацыі лёгкія: размова на вуліцы, у гарадскім транспарце, з прадаўцом у краме. Потым больш цяжкія: напрыклад, настаўнікі — гіды, а вучні — французскія турысты.



### ЗДАРЭННІ

Участак дарогі Санкт-Пецярбург — Адэса каля вёскі Копці Віцебскага раёна ў апошні час стаў найбольш аварыйным. Не праходзіць і тыдня, каб у зводках ДАІ не фіксаваліся даныя аб дарожна-транспартных здарэннях на гэтым участку.

Вось і нядаўна вадзіцель аўтамашыны «МАЗ» Сяргей Раганаў выехаў на паласу сустрэчнага руху, дзе і сутыкнуўся з аўтамабілем «Жыгулі». Два чалавекі загінулі, паранены двое дзяцей.

Аналагічны выпадак адбыўся і з кіраваўшым «Хондай» жыхаром Прыбалтыкі, які пры абгоне выехаў на паласу сустрэчнага руху і ўрэзаўся ў «ЗІЛ». Абодва вадзіцелі загінулі, а два пасажыры цяжка паранены.

**Фота Аляксандра ХІТРОВА, Белінфарм.**

# КРЫЖЫ НА ДАРОГАХ

Напэўна, сёй-той прыкмячаў на абочыне шашы самотныя крыжы з невялічкай агароджай або кветкамі. Упершыню ўбачыўшы гэтыя знакі былой трагедыі, знаходзячыся ў камандзіроўцы на Любаншчыне. На паўтаракіламетровым участку паміж вёскамі тры знакі бяды. Як паведамілі, разбіліся юнакі-матацыклісты. На Правілы дарожнага руху вясковая моладзь не зважае. Гойсаюць па вёсках без нумарных знакаў, засцерагальных шлемаў. Што можа зрабіць Дзяржаўтаінспекцыя з двухтрох штатных супрацоўнікаў, якім, праўда, час ад часу дапамагаюць участковыя інспектары, калі самі ўладальнікі «стальных каней» не клапоцяцца пра ўласную бяспеку? А прыміце пад увагу тэхнічны стан аўтамабільных дарог, гарадскіх вуліц з выбоінамі і каляінамі.

Старшы інспектар УДАІ МУС РБ маёр міліцыі Анатоль Савошка як спецыяліст сваёй справы са здзіўленнем адказвае:

— Гэтае ўшанаванне загінуўшых блізкімі набыло масавы характар. Узбоч аўтамагістралі каля Маскоўскіх могілак стаіць вялікі крыж. Ля Мікашэвіч на месцы трагічнага здарэння ўзвялі сапраўдную архітэктурную пабудову. Многа знакаў бяды на Брэстчыне, у Баранавіцкім раёне. Пры нездавальняючым тэхнічным стане шашэйных дарог, самай высокай сярод краін Еўропы аварыйнасцю, хутка абочыны нашых дарог будуць нагадваць могілкі. Яны не папярэджваюць удзельнікаў руху пра небяспеку, а, наадварот, адцягваюць увагу вадзіцеляў. Выстаўлены на агляд разбітыя аўтамабілі не маюць выхаваўчага эфекту. Толькі пасажыр можа паразважаць, што можа здарыцца ў дарозе. Вадзіцель ведае і без таго, як лёгка стаць ахвярай дарожнага здарэння.

На мой погляд, аўтаінспектар мае рацыю. Многія нашы традыцыі не садзейнічаюць выхаванню. Бядой, як вядома, не ганарацца, не выстаўляюць напаказ. Мясцовыя органы самакіравання, дарожныя службы павінны паклапаціцца, каб шасейныя дарогі, як і вясковыя вуліцы, былі добраўпарадкаваны, мелі належны эстэтычны выгляд.

**Аляксандр ДЗЕРАВЯНКА.**

**ЗША.** 950 мільёнаў даляраў — такія памеры ўрону, які нанеслі штату Каліфорнія бушаваўшыя там да нядаўняга часу пажары.

Калі ж улічваць і незастрахаваную маёмасць, што загінула ў полымі, то ўрон перавысіць 1 мільярд даляраў. Пажары знішчылі 1241 пабудову і "злізалі" амаль 80 тысяч гектараў лясных масіваў.

# МАЛАНКА СУПРАЦЬ МАЛАДЫХ

**ГОМЕЛЬ. Не думалі дзве маладыя пары, якія адпачывалі на беразе Сожа, што назад яны вернуцца не ў поўным саставе.**

**Маланка патрапіла прама ў будан, дзе закаханыя хаваліся. У выніку адна дзяўчына загінула, а астатнія адпачываючыя змешчаны ў бальніцу з моцнымі апёкамі.**

# Спаць на збожжатаку небяспечна для жыцця

Кожны год пад час уборкі па чужой ці ўл... неасцярожнасці гінуць людзі. Вось трагічная хр... жніва ў Магілёўскай вобласці.

* * *

У час уборкі пшаніцы сарваўся з пад... камбайна рабочы калгаса імя Куйбышава Кіраў... раёна, які памёр у бальніцы.

* * *

На збожжатаку саўгаса "Барок" Магілёў... раёна загінуў 34-гадовы Анатоль Цяпляков, вырашыў паспаць у бункеры са збожжам, ... выгрузцы якога ён задыхнуўся.

* * *

У калгасе "Маяк камунізму" Магілёўскага р... на цёплым збожжы вырашылі адпачыць 25-га... Уладзімір Камарынкін і 16-гадовы Дзмітрый Ліс... Пры выгрузцы збожжа з бункера апошні загіну...

Юрась ПІВУН...

11

## ШЭСЦЬ ЧАЛАВЕК НА МЕСЦА

*За першыя два месяцы бягучага года ў рэспубліцы зафіксавана звыш 32 тысяч працаздольных са статусам беспрацоўнага. Між тым, на пачатак сакавіка ў службы занятасці па дапамогу звярнуліся каля 109 тысяч чалавек. Гэта — 2,2 працэнта эканамічна актыўнага насельніцтва, што сведчыць аб павелічэнні колькасці беспрацоўных у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года амаль у паўтара раза. Кожны шосты беспрацоўны звольнены з прадпрыемстваў і арганізацый у сувязі са скарачэннем штатаў.*

Як паведамляе Міністэрства статыстыкі і аналізу Беларусі,патрэбнасць у работніках, заяўленая прадпрыемствамі і арганізацыямі ў службы занятасці, складала ў лютым 19,5 тысячы чалавек. У цэлым па рэспубліцы на адно свабоднае рабочае месца(вакансію)прэтэндавала каля 6 беспрацоўных. У тым ліку на адну вакансію служачага — больш чым 9 чалавек.

Дапамогу па беспрацоўю на пачатак сакавіка атрымлівалі звыш 56 тысяч чалавек. Гэта трошкі больш за палавіну агульнай колькасці беспрацоўных. Затраты на выплату дапамог, арганізацыю грамадскіх работ, навучанне і матэрыяльную дапамогу склалі ў лютым бягучага года 5,9 мільярда рублёў.

БЕЛІНФАРМ.

## ПА 4 КАНДЫДАТЫ НА МЕСЦА

*Напружанай будзе перадвыбарчая барацьба ў парламент краіны па трох выбарчых акругах Жлобінскага раёна. У кожнай з іх маюць намер змагацца за месца ў Вярхоўным Савеце не менш 3—4 кандыдатаў, як ад розных партый, так і працоўных калектываў і незалежных кандыдатаў.*

У ліку кандыдатаў ёсць і даволі вядомыя ў краіне асобы. Так, па Жлобінскай-Металургічнай выбарчай акрузе № 96 працоўны калектыў мясцовага Беларускага металургічнага завода будзе прадстаўляць яго генеральны дырэктар Юрый Феакцістаў. Па Жлобінскай-Чыгуначнай выбарчай акрузе № 97 мае намер змагацца прэзідэнт Беларускага саюза прадпрымальнікаў Уладзімір Карагін.

## БЕЗ СПОНСАРА НЕ ПАТАНЦУЕШ

*Рэгулярна аказвае спонсарскую падтрымку мясцовай СШ № 9 Жлобінская фірма "Апагей".*

Нядаўна толькі дзякуючы фінансавай дапамозе прадпрымальнікаў школьнікі здолелі набыць танцавальныя касцюмы для мастацкай самадзейнасці.

Мікалай ШУКАНАЎ.

## КАМПЕНСАЦЫЯ ПУЦЁВАК

*Група ўрачоў і медыцынскіх сясцёр з Оршы перыядычна працавалі ў раёнах, пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Згодна рашэння Урада Рэспублікі Беларусь яны маюць права бясплатна атрымаць пуцёўкі на курорты, у санаторыі і дамы адпачынку.*

Праўда, па розных прычынах, не ўсе медыкі маюць магчымасць адпраўляцца на адпачынак і лячэнне. У такім выпадку за імі застаецца права на кампенсацыю. Аршанскі гаркам прафсаюза работнікаў аховы здароўя выдаткаваў чарнобыльцам 5 мільёнаў рублёў у якасці кампенсацыі за нявыкарыстаныя пуцёўкі.

## КАБ НЕ ПАДВЯЛА ЗБРОЯ...

*У Оршы адкрылася майстэрня патроннай зброі.*

Работнікі вытворча-камерцыйнай фірмы "Белка", якім гарвыканкам даў дазвол на арганізацыю такой майстэрні, лічаць, што кліенты ў іх будуць. У першую чаргу яны спадзяюцца на паляўнічых, работнікаў пазаведамаснай аховы, навучальных устаноў, дзе вывучаюць вайсковую справу, а таксама на тых, хто мае газавыя пісталеты.

Ісак КОГАН.

## У ТЭАТРЫ ДАХ ЦЯЧЭ...

*Да Міжнароднага дня тэатра прымеркавалі коласаўцы чарговы тэатральны марафон. На гэты раз збіраюцца сродкі на рамонт... даху. Бо ў Міністэрства культуры і друку рэспублікі няма грошай на рамонт. Такім чынам, тэатр імя Якуба Коласа ў Віцебску праявіў уласную ініцыятыву.*

У тэатральным марафоне прымаюць удзел знакамітыя танцавальныя ансамблі, рок-гурты, іншыя самадзейныя і прафесійныя мастацкія калектывы.

Уладзімір МІХНО.

## ЦЯКУЦЬ ГРОШЫ З... БУТЭЛЬКІ

*У калгасе "Рачкавічы" Слуцкага раёна на мясцовым спіртзаводзе пабудавалі гарэлачны цэх. Ужо вядзецца мантаж абсталявання.*

Пасля ачысткі спірту будзе вырабляцца гарэлка пад назвай "Колас". Штодзённа з канвеера будзе сыходзіць 40 тысяч бутэлек гэтага напою. Яго дастаткова, каб задаволіць патрэбу двух раёнаў — Слуцкага і Салігорскага. За мінулы год спіртзавод рэалізаваў прадукцыі больш чым на 2 мільярды рублёў пры сярэднегадавым сабекошце аднаго дэкалітра 6420 рублёў. А на прадпрыемстве занята ўсяго 45 чалавек. Ну проста "дармавыя" грошы цякуць у калгасную касу.

Анатоль РАМАНОВІЧ.

## Курсы валют на 29 сакавіка

| | Даляр ЗША | | Ням. марка | |
|---|---|---|---|---|
| | Скупка | Продаж | Скупка | Продаж |
| "Комплекс" | 11400 | 11700 | 7980 | 8320 |
| "Прыор" | 11500 | 11700 | 8110 | 8200 |
| "Дукат" | 11450 | 11800 | 7900 | 8500 |

# ЯК АД АГНЮ ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ?

**Даўно заўважана, што як толькі апускаецца ртутны слупок тэрмометра, колькасць загінуўшых у агні пажараў значна ўзрастае. Цяпер кожны дзень ахвярамі агню становяцца 3—5 чалавек, а часам і значна больш. Вось некалькі такіх паведамленняў.**

У вёсцы Міроненкі Калінкавіцкага раёна загінулі трое дзяцей трактарыста калгаса імя Кірава В. Захаранкі.

Жыхарка вёскі Андронавічы Віцебскага раёна Н. Гамсяроўская даверыла сваіх малых дзяцей суседцы - шызафрэнічцы. Вынік гэтай памылкі вельмі сумны. Калі Н. Гамсяроўская вярнулася, яе дом быў ахоплены агнём і двухгадовага Сашу і на год маладзейшага Косцю выратаваць было ўжо немагчыма.

У Мінску па вуліцы Убарэвіча ў кватэры І. Лаўнік у адным з пакояў усчаўся пажар. Пажарныя, якія прыбылі на месца здарэння, знайшлі на лесвічнай пляцоўцы нежывых гаспадыню гэтай кватэры, двaіх яе дзяцей і іх суседку. Пацярпеўшыя маглі б выратавацца, каб шукалі паратунак не на верхніх паверхах, а на ніжніх. Але іх гэтаму ніхто не навучыў. На Захадзе, напрыклад, проціпажарны ўсенавуч пачынаюць праводзіць з дашкольнага ўзросту. Потым чалавек праходзіць такое навучанне і ў школе, і ў вышэйшых навучальных установах, і на рабочым месцы, і ў сям'і. А што ў нас? Раней хоць аглядавыя камісіі, створаныя пры выканкомах Саветаў народных дэпутатаў, у нейкай меры вучылі гэтаму людзей. Цяпер і яны, па сутнасці, распаліся.

Пытанне навучання насельніцтва правілам пажарнай бяспекі павінна вырашацца на дзяржаўным узроўні, на што неабходна выдзяляць сродкі. Іншая справа, што распарадзіцца імі трэба па-гаспадарску. Цяпер, напрыклад, таксама траціцца нямала грошай на правядзенне аглядаў проціпажарнага стану жыллёвага фонду, адрываюцца дзеля гэтага людзі ад асноўнай работы. Вынікі ж навучання правілам пажарнай бяспекі невялікія. Чаму? Галоўнае, на наш погляд, у тым, што людзі, якія прыцягваюцца для правядзення такіх аглядаў, не спецыялісты ў пажарнай справе. Да таго ж, сапраўдных энтузіястаў, якія б душой хварэлі за вынікі такой работы, адзінкі. А ці не лепш дзяржаве знайсці сродкі і ўвесці ў кожным раёне двух-трох штатных работнікаў пажарнай аховы, якія займаліся б толькі праверкай проціпажарнага стану жыллёвага фонду і навучаннем насельніцтва правілам пажарнай бяспекі? Усё гэта ў рэшце рэшт акупіцца за кошт скарачэння колькасці пажараў і страт ад іх у жыллёвым сектары.

**Васіль БАГАМ'Я,**
**галоўны спецыяліст ГУПА МУС Беларусі.**

**Выпуск падрыхтавалі: Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Ігар КАРНЕЙ, Аляксандр КОКТЫШ, Анатоль СЛАНЕЎСКІ, Станіслаў СУЛКОЎСКІ, Ігар ШЧУЧЭНКА.**

# СТРАТЫ АД АГНЮ ЎСЁ ПАВЯЛІЧВАЮЦЦА

Паводле даных Галоўнага ўпраўлення ваенізаванай пажарнай службы МУС РБ, толькі за адны суткі па рэспубліцы зарэгістравана 45 пажараў, страты ад якіх склалі больш як 60 мільярдаў рублёў.

Так, у калгасе «Чырвоны сцяг» Валожынскага раёна ад электраводападгравальнага катла загарэлася ферма. Матэрыяльныя страты склалі 3 мільёны рублёў. У саўгасе «Сялецкі» Пухавіцкага раёна ў выніку ўспыхнуўшага пажару быў пашкоджаны кавальскі цэх. Страты — 2 мільёны рублёў. У калгасе імя XXII з'езда КПСС Крычаўскага раёна пры ўборцы канюшыны загарэўся і быў пашкоджаны камбайн «Дон-1500». У садаводчым таварыстве «Энергетык» Смалявіцкага раёна знішчаны агнём дачны домік. У агні загінуў чалавек.

# ПАЛАЕ "ЗОНА"

*З пачаткам вясенне-летняга сезона зноў, як і ў мінулыя гады,пачаліся пажары ў зоне адсялення раёнаў, што пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Іх адбылося ўжо звыш сямідзесяці. Пажарамі знішчана 132 пабудовы, у агні загінулі два чалавекі.*

Віноўнікі ўсяго гэтага — самасельцы, жыхары адселеных вёсак, якія самавольна вярнуліся ў "зону". Жадаючы расчысціць ад леташняй травы прысядзібныя ўчасткі пры дапамозе агню, яны і дадаюць клопатаў пажарным. Становішча ўскладняецца яшчэ і тым, што ў час пажараў разам з дымам у паветра падымаецца вялікая колькасць радыеактыўных рэчываў, якія разносяцца на вялікія тэрыторыі.

Як вядома, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, які пабываў нядаўна ў "зоне", паабяцаў самасельцам, што высяляць іх з наседжаных месцаў ніхто не будзе. Аднак спецыялісты Галоўнага ўпраўлення пажарнай аховы рэспублікі лічаць, што ў такім выпадку на адселеных тэрыторыях неабходна ствараць поўную інфраструктуру, уключаючы пажарныя часці.

БЕЛІНФАРМ.

АФІЦЫЙНА

# ШЭСЦЬ МІЛЬЯРДАЎ РУБЛЁЎ ВЫДЗЕЛІЎ УРАД БЕЛАРУСІ ДЛЯ ЛІКВІДАЦЫІ ВЫНІКАЎ СТЫХІЙНАГА БЕДСТВА

На парадку дня пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, якое адбылося 10 жніўня, пытанне аб мерах па ліквідацыі вынікаў у затопленых раёнах стала асноўным, бо стыхійнае бедства нанесла велізарны ўрон: толькі ў Гомельскай і Брэсцкай абласцях загінула каля 230 тысяч гектараў пасеваў, затоплены каля 9 тысяч сялянскіх двароў, размыты многія дарогі, дзе-нідзе пашкоджана сувязь...

Нягледзячы на складаныя ўмовы, сітуацыя ў небяспечных рэгіёнах была аператыўна ўзята пад кантроль. Перш за ўсё на месцах паклапаціліся пра людзей і потым узяліся за рамонт разбураных стіхіяй аб'ектаў, уборку ўраджаю. Высветлілася, што лепш за іншых паказваюць сябе на палях камбайны "Дон-1500". Менавіта іх і перакінулі ў Столінскі і Лунінецкі раёны, якія пацярпелі больш за іншых. Ахвярам стыхіі ў першую чаргу выдзелілі тэхніку, гаруча-змазачныя матэрыялы. Адным словам, гэта той выпадак, калі ацэнка "Праведзена велізарная работа" не нацяжка, а сапраўднае адлюстраванне таго, што адбывалася на самай справе.

Вядома, былі і недахопы. Паводле звестак Мінсельгаспрода, у дзвюх абласцях загінула пасеваў на 15 мільярдаў рублёў, а вось застрахаванымі з іх аказаліся толькі на 1 мільярд. Пасля таго, як адмянілі абавязковую страхоўку, многія кіраўнікі вырашылі: а можа і так "пранясе", хоць дзяржава палавіну страхавачных сум брала на сябе. Але такой бестурботнасцю пакаралі самі сябе.

Гаварылі і пра аварыйна-выратавальныя батальёны. Відаць, яны ёсць толькі ў Віцебскай і Гомельскай абласцях, ды і там укамплектаваны напалову, сучаснай тэхнікай не забяспечаны. Такая "эканомія", на жаль, прыносіць велізарныя страты.

Прамоўцы гаварылі пра неабходнасць у самыя кароткія тэрміны распрацаваць адзіную методыку ацэнкі ўрону, інакш выдзяляемыя на кампенсацыю сродкі не будуць размеркаваны аб'ектыўна: адны здолеюць "вырваць" больш, другія будуць забяспечаны па мінімуму.

Такім чынам, урад вырашыў першапачаткова выдзеліць 6 мільярдаў рублёў. У бліжэйшыя дні яны будуць пералічаны на спецыяльныя рахункі. Грошы пойдуць на фінансаванне работ па ліквідацыі вынікаў стыхійнага бедства, будуць раздадзены людзям на аднаўленне гаспадаркі. Старшынствуючы на пасяджэнні першы намеснік кіраўніка ўрада Міхаіл Мясніковіч асабліва адзначыў такі момант — рамонт жылля вяскоўцаў павінен быць зроблены да надыходу халадоў, кампенсацыю за ўрон неабходна выдаваць аператыўна. Адным словам, на першым плане і ў далейшым павінны быць клопаты пра канкрэтных людзей.

БЕЛІНФАРМ.

■ Грамадзянская абарона

# ЦІ ГАТОВЫ ДА СТЫХІЙ?

**Не так даўно ў г.Салігорску прайшлі комплексныя вучэнні сіл грамадзянскай абароны /ГА/. Якія вывады можна зрабіць? Па-першае, зладжаная работа калектыву штаба горада, якім кіруе палкоўнік С.Васілеўскі, усяляе ўпэўненасць, што яны здольныя вырашаць задачы па абароне насельніцтва і дзяржаўных каштоўнасцей ад надзвычайных сітуацый /НС/ у мірны і ваенны час.**

Ёсць неабходныя і абгрунтаваныя планы па большасці аб"ектаў народнай гаспадаркі, створаны камісіі на выпадак стыхійных бедстваў ці катастроф, тэрытарыяльныя фарміраванні. Па-другое, мы пераканаліся, што нядрэнна падрыхтаваны кіруючы састаў гарвыканкома, кіраўнікі многіх прадпрыемстваў і арганізацый. З задавальненнем адзначаем дырэктара хлебазавода І.Кудравец, галоўнага ўрача горада В.Палішчука, генеральнага дырэктара ВАЖКГ -- намесніка старшыні гарвыканкома Б.Крычмана, галоўнага інжынера РВС В.Істоміна.

Разам з тым чарговы раз даводзіцца канстатаваць, што ўвага да ГА з боку многіх кіраўнікоў значна знізілася, асабліва да яе практычнай дзейнасці, калі вырашаюцца галоўныя задачы па правядзенню выратавальных і іншых неадкладных работ. Узнік разрыў паміж кіруючым саставам і выканаўцамі, у выніку ГА пачала страчваць сваё значэнне. Аб гэтым сведчыць той факт, што падрыхтоўка насельніцтва да дзеянняў у надзвычайных сітуацыях мірнага і ваеннага часу праводзіцца вельмі слаба. Заняткі носяць эпізадычны характар, з нізкай якасцю і мінімальным ахопам навучэнцаў. На многіх аб"ектах народнай гаспадаркі яны зусім не праводзяцца, напрыклад, у гархарчгандлі і канцэрне "Салігорскае грамадскае харчаванне".

Не праводзяцца і перыядычныя трэніроўкі з неваенізаванымі фарміраваннямі хімічна небяспечных аб"ектаў і насельніцтва, што пражывае вакол іх. На многіх аб"ектах народнай гаспадаркі дакументацыя ўстарэла, а на некаторых так і не адпрацавана ў поўным аб"ёме, напрыклад, у сумесным прадпрыемстве "Белком-калій". А ў грамадскім харчаванні пасада начальніка грамадзянскай абароны наогул скарочана, яго абавязкі ўскладзены па сумяшчальніцтву на другарадную асобу.

Задачы па ліквідацыі вынікаў надзвычайных сітуацый выконваюць асноўныя сілы -- неваенізаваныя фарміраванні. Такія фарміраванні створаны. Ёсць нават зводная тэрытарыяльная каманда павышанай гатоўнасці. Але план прывядзення яе ў гатоўнасць не дазваляе ва ўстаноўленыя тэрміны падрыхтавацца да дзеянняў. Схема апавяшчэння асабовага саставу неканкрэтная і не прадугледжвае апавяшчэнне ў выпадку неабходнасці ў нерабочы час.

У большасці фарміраванняў трэста "Шахтаспецбуд" такі план зусім адсутнічае, і як вынік -- вельмі нізкая падрыхтоўка асабовага саставу.

Але ж усім кіраўнікам трэба ўлічваць, што наша грамадства цяпер перажывае не проста складаны час, але і надзвычай небяспечны: дзейнасць многіх кіраўніцкіх структур і на аб"ектах народнай гаспадаркі з"явіліся элементы безадказнасці, абыякавасці, нядбайнасці. Абсталяванне многіх прадпрыемстваў устарэла і працуе на грані, так што ў любы момант можа ўзнікнуць надзвычайная сітуацыя --

пажары, аварыі і катастрофы тэхнагеннага і экалагічнага характару. 6 красавіка г.г. у Томску-7 узарвалася ёмістасць з уранавым растворам і адбылося радыеактыўнае забруджванне мясцовасці на вялікай плошчы.

Салігорск і яго раён з"яўляюцца, бадай, адзіным рэгіёнам Беларусі, дзе могуць, паводле нашых прагнозаў, узнікнуць надзвычайныя сітуацыі экалагічнага характару. Гэта ставіць асаблівыя, спецыфічныя задачы не толькі перад камісіяй па надзвычайнай сітуацыі, але і перад грамадзянскай абаронай горада ў цэлым.

Іван ГРЫШЧАНКА,
намочнік начальніка штаба ГА Мінскай вобласці па выхаваўчай рабоце і інфармацыі.

# Хіт-парад кур"ёзаў

## Бабулю голымі рукамі не возьмеш!

*"Яна ўдарыла мяне разоў дзесяць. Мне трэба накласці на раны швы". Гэтая скарга Джэймса Брауна ні ў кога не выклікала спагады. Бо справа адбывалася ў судзе, а 39-гадовы амерыканец — зусім не ахвяра, а дробны злодзей. Дасталося ж яму "на арэхі" ад Віртэл Джоўнс, 79-гадовай бабулі, але зусім не "божага адуванчыка".*

*Джоўнс упусціла Брауна ў сваю кватэру таму, што той папрасіў у яе некалькі таблетак аспірыну. Пакідаючы яе, злодзей не ўпусціў шанц сцягнуць тое, што "дрэнна ляжала", — дзве запісныя кніжкі. Дробязь, вядома. Але старая, выявіўшы прапажу, кінулася ў пагоню. Яна дагнала мужчыну, які ў два разы маладзейшы за яе, і дала яму дыхту. Гэта надоўга запомніцца злачынцу.*

*А захаваць бадзёрасць не толькі духу, але і цела Джоўнс, напэўна, дапамагло тое, што ў маладосці яна была танцоўшчыцай.*

## Сабачыя "сувеніры"

**Як сумясціць любоў да "братоў нашых меншых" з шырокавядомай прыхільнасцю немцаў да чысціні і парадку, якая даходзіць часам да абсурду? Ці парушаюць закон тыя ўладальнікі сабак, якія, выгульваючы іх на вуліцах і ў парках нямецкіх гарадоў, "дазваляюць" сваім любімцам спраўляць натуральныя патрэбнасці? Гэтыя пытанні сталі прадметам сур"ёзнага разгляду судовых органаў зямлі Гесэн.**

**...Адміністрацыйны суд Франкфурта-на-Майне прыгаварыў уладальніцу англійскага бульдога да штрафу ў памеры 205 марак. У яго рашэнні ўказана, што гаспадыня павінна несці поўную адказнасць за выдаленне з вуліц "прадуктаў жыццядзейнасці" сабакі, якія застаюцца там пасля яго выгулу.**

**Прыняўшы да разгляду апеляцыю па гэтай справе, вышэйшы зямельны суд Гесэна — да вялікай радасці ўсіх абаронцаў чатырохногіх сяброў чалавека — ануляваў "прыгавор". На думку суддзяў, было б недапушчальным абавязваць уладальнікаў ліквідоўваць "па гарачых слядах" натуральныя вынікі выгулу сабак. Тым не менш прадстаўнікі гэтай судовай інстанцыі абумовілі магчымасць прыцягнення гаспадароў хатніх жывёлін да адказнасці ў выпадках "празмернага забруджвання мясцовасці"...**

## Міні-нованароджаны змагаецца за жыццё

ЛОНДАН. Значна павялічыліся шанцы на выжыванне ў самага маленькага на Зямлі нованароджанага — Тайлера Дэвісана (рост —15 см, вага — 312 грамаў), што з'явіўся на свет у Нотынгеме. Мініяцюрнае дзіця, якое змяшчаецца на далоні бацькі, знята з машыны штучнага дыхання і цяпер дыхае самастойна, хоць працягвае заставацца ў стэрыльным інкубатары пры радзільным доме.

Тайлер нарадзіўся неданошаным — на 7-м месяцы цяжарнасці. Ён — меншы з двайнят. На датэрміновых родах шляхам кесарава сячэння настаялі ўрачы, паколькі, як яны ўстанавілі, Тайлеру пагражала гібель ва ўлонні: усе жыццёвыя сокі маці эгаістычна спажываў яго брат.

## Купюры ў якасці будматэрыялу

**Хто сцягнуў у Чэнь Цзіньшу яго кроўныя дзевяць тысяч юаняў? Два дні паліцыя беспаспяхова спрабавала выйсці на след выкрадальніка, пакуль адзін з сышчыкаў выпадкова не знайшоў... пацука, які "рамантаваў" 100-юаневай купюрай сваё жытло.**

**Расказваючы аб гэтым сапраўды анекдатычным выпадку, газета "Новости общественной безопасности" піша, што разявака вырашыў прыхаваць свае грошы ў шчыліну, якая ўтварылася ў сцяне паміж цаглінамі. Гэтае ж месца, як высветліла ў выніку паліцыя, аблюбаваў сабе і пацук. Грызун, шануемы ў Кітаі за розум, палічыў купюры самым зручным будаўнічым матэрыялам для свайго "гняздзечка".**

## Дым коштам 65 тысяч долараў

*Аўстралійскі суд прыняў беспрэцэдэнтнае ў сусветнай юрыдычнай практыцы рашэнне, задаволіўшы іск 64-гадовай Лізель Шолем. Яна запатрабавала кампенсацыі ўрону, нанесенага яе здароўю за 12 гадоў работы сярод курыўшых калег.*

*У судзе гэтая рашучая служачая дэпартамента аховы здароўя паведаміла, што пакутуе астмай і яе хвароба абвастрылася за апошнія гады. У выніку судовага разбору начальнік Шолем быў прызнаны вінаватым у "злачыннай нядбайнасці", паколькі не змог пазбавіць сваю падначаленую ад згубнага тытунёвага дыму. Сума кампенсацыі вызначана ў 65.000 долараў.*

*Паводле слоў выйграўшай працэс шаноўнай дамы, матэрыяльная кампенсацыя для яе — далёка не самае галоўнае. Вынесены вердыкт, растлумачыла Шолем, мае вялікае значэнне для ўсіх тых, хто не курыць.*

16

Адукацыя

# Хто трапіць у Ганконг?

*Аляксандра БРАЦЕННІКАВА, метадыст РЗФМХШ*

Адказаць на гэтае пытанне і проста, і складана. На Міжнародную матэматычную алімпіяду летам 1994 года ў Ганконг трапяць, вядома ж, удзельнікі каманды лепшых юных матэматыкаў Беларусі. Калі дзяржава ці зацікаўленыя асобы знойдуць грошы на шлях да Ганконга, а таксама да Балгарыі і Швецыі, дзе пройдуць у ліпені гэтага года міжнародныя алімпіяды па біялогіі і інфарматыцы. Што значна цяжэй.

Адбор у каманду рэспублікі традыцыйна складаецца з чатырох этапаў -- школьных, раённых, абласных ці мінскай гарадской, рэспубліканскай алімпіяд. Трэба адзначыць, што I і II этапы "алімпійскага марафона" ўжо пройдзены. Пад час зімовых канікул вызначацца пераможцы абласных і мінскай гарадской алімпіяд, якія і памераюцца сіламі ўжо на веснавых вакацыях. Рэспубліканская алімпіяда па хіміі ў гэтым годзе адбудзецца ў Брэсце, біялогіі -- у Мінску, па інфарматыцы -- у Віцебску, па фізіцы і матэматыцы -- у Баранавічах. Вядома, з іх пераможцаў і будуць складзены каманды.

Зразумела, што перамога на спаборніцтве такога ўзроўню -- вялікае дасягненне, да якога вядзе ўпартая і мэтанакіраваная праца. Але перад тым, як адправіцца за мяжу, пераможцы яшчэ збіраюцца на трохтыднёвыя трэніровачныя зборы, на якіх займаюцца па шэсць гадзін штодзень. Інакш кажучы, пачэсныя ўзнагароды і медалі проста так не даюцца. Розум, талент, няспынная праца -- абавязковыя крыніцы поспеху.

А цяпер пра самае цяжкае пытанне -- грошы. У Ганконг, як я ўжо казала, беларуская матэматычная каманда пападзе ў тым выпадку, калі знойдзе на кожнага вучня па 1000 долараў. Паўстануць, вядома, фінансавыя пытанні і перад юнымі інфарматыкамі, хаця шлях да Швецыі карацейшы і таннейшы -- 100 долараў на чалавека. А хацелася б яшчэ адправіць прадстаўнікоў рэспублікі ў якасці наглядальнікаў на міжнародныя алімпіяды па хіміі ў Нарвегію і па фізіцы ў Кітай. Каб праз год Беларусь магла прыняць у іх удзел сваімі ўласнымі камандамі. Хадзіць з працягнутай рукою па дзяржаўных і камерцыйных структурах не вельмі прыемна. На наш погляд, аптымальным быў бы такі варыянт, каб у кожнай беларускай каманды з'явіўся ўласны спонсар. Бо, ведаеце, ніхто і нішто так не праслаўляе сваю краіну, як таленавіты чалавек. Беларусі ёсць кім і чым ганарыцца.

І ёсць час да лета даказаць гэта.

5

# Цішэй! Ідуць экзамены

Вядома, што сярод шасці школьных экзаменаў па рашэнню Міністэрства адукацыі рэспублікі абавязковым з'яўляецца беларуская літаратура. Другі з абавязковых прадметаў вызначаецца кіраўніцтвам школ.

У Стаўбцоўскім раёне другім абавязковым выпускным экзаменам у большасці школ стала беларуская мова. Што ж, бадай, гэта лагічна: абавязковы ўступны экзамен у ВНУ – беларускае сачыненне, у ім наўрад ці можна раздзяліць веданне літаратуры і мовы.

Яна ВЕРАСЕНЬ, БелаПАН.

2

# Іспыты — гарачая пара

У вышэйшых навучальных установах Магілёва, як і па ўсёй Беларусі, зараз час уступных іспытаў. Найбольшы конкурс у пединстытуце (сярэдні паказчык – 2,7). Найбольш абітурыентаў на спецыяльнасці "Гісторыя з замежнай мовай" – каля 6 чалавек на месца. Крыху менш – 5 чалавек – на факультэце пачатковых класаў. Самы малы конкурс (1,5 чалавека на месца) на аддзяленні дашкольнага выхавання.

Юрась ПІВУНОЎ.

3

# Новае пакаленне выбірае ВНУ

Усеагульная страсць да лёгкай нажывы, як ні дзіўна, не адбіла ў маладога пакалення цягі да адукацыі – аб гэтым красамоўна сведчыць колькасць пададзеных заяў ад жадаючых вучыцца ў трох магілёўскіх ВНУ. Так, у машынабудаўнічым інстытуце сярэдні конкурс склаў 1,6 чалавека на месца. У тэхналагічным інстытуце сярэдні конкурс крыху вышэй – 1,8. Але самы вялікі сярэдні конкурс назіраўся ў пединстытуце – 2,7 абітурыента на месца.

БелаПАН.

4

# БДУ: юрысты — у пашане, кібернетыкі — у загоне

15 ліпеня ў Белдзяржуніверсітэце была завершана работа прыёмнай камісіі. Паводле звестак членаў камісіі, за месяц не было пададзена столькі заяў, колькі ў апошнія два дні. Абітурыент, яшчэ не стаўшы студэнтам, ужо мае звычку рабіць усё ў апошні момант. Па ўмовах прыёму, атэстат можа быць прыняты, калі ў ім менш за тры "двойкі". Але, як паведамілі карэспандэнту БелаПАН, да падліку "двоек" справа не дайшла – скрозь "харашысты" ды "выдатнікі".

Колькасць чалавек на месца ў цэлым па універсітэту аказалася вышэйшай, чым год назад, у 1,5-2 разы. Самым прэстыжным працягвае заставацца факультэт правазнаўства (юрфак). Па колькасці заяў, пададзеных на 14 ліпеня, сярод абітурыентаў на кожнае месца – па два "медалісты". Пры наборы ў 125 чалавек пададзена 538 заяў, з іх 274 абітурыенты маюць медаль або дыплом з адзнакай.

Дастаткова вялікі конкурс і на матэматычны факультэт – 5 чалавек на месца. Крыху здаў пазіцыі філалагічны: на самае прэстыжнае ў мінулым годзе аддзяленне беларускай мовы і літаратуры конкурс крыху меншы чым два чалавекі на месца. А самы маленькі конкурс на факультэт эканамічнай кібернетыкі (1,4 чалавека на месца). Не ў пашане цяпер кібернетыка?..

Святлана ЛІЦКЕВІЧ, БелаПАН.

# Замежны тэлетайп



На думку Пентагона, у выпадку ўзброенага канфлікту на Карэйскім паўвостраве войскі КНДР менш чым за два тыдні перамогуць аб'яднаныя амерыкана-паўднёвакарэйскія сілы і захопяць Сеул. Такія вынікі дало праведзенае экспертамі міністэрства абароны ЗША звышсакрэтнае разыгрыванне на камп'ютэры магчымых варыянтаў развіцця ваенных дзеянняў на Карэйскім паўвостраве.

**ЗША.** Прэзідэнт Клінтан паведаміў, што ЗША разглядаюць планы пераносу прыцэлу амерыканскіх ядзерных ракет з ваенных аб'ектаў у Расіі на адкрытыя акіянскія прасторы. Гэты план будзе рэалізаваны толькі ў тым выпадку, калі Расія таксама вырашыць змяніць прыцэл сваіх ракет і прадставіць апісанне гэтай працэдуры.

**ЛІТВА.** Дацкі ўрад фінансуе 13 энергетычных праектаў у Літве, агульны кошт якіх складае 24 мільёны крон. Ужо да канца гэтага года будзе завершаны першы праект – у горадзе Маляты запрацуе дацкая кацельня.

**У АЗЕРБАЙДЖАНЕ** павялічаны цэны на нафту, нафтапрадукты і іншыя энерганосьбіты. З 30-ці да 160-170 рублёў у залежнасці ад маркі падаражаў літр бензіну.

**ІНДЫЯ.** У Дэлі адбылася прэзентацыя новага самалёта АН-38, створанага расійскімі і ўкраінскімі спецыялістамі пры ўдзеле фірм ЗША. Самалёт ідэальна падыходзіць для эксплуатацыі ў Азіі.

**ЭСТОНІЯ.** Прэзідэнт Эстоніі Ленарт Меры прыняў камандуючых сіламі абароны Латвіі, Літвы і Эстоніі. На сустрэчы абмяркоўваліся праблемы адзінай абароннай палітыкі балтыйскіх дзяржаў. На думку прысутных, неабходна стварыць "Балтыйскае НАТО", якое аб'яднала б узброеныя сілы і пагранічныя службы трох краін. Такое супрацоўніцтва, лічаць вайскоўцы, павінна пачацца з арганізацыі адзінага балтыйскага батальёна.

**ЗША.** "Помнікам гісторыі" краіны аб'яўлена плошча Дэйлі ў Даласе (штат Тэхас), дзе 30 год таму быў смяротна паранены прэзідэнт Джон Кенэдзі.

* * *

* * *

Прадстаўнік спецыяльнай камісіі ААН па ліквідацыі зброі масавага знішчэння заявіў, што ў распараджэнні інспектараў ААН няма непасрэдных сведчанняў выкарыстання Іракам хімічнай зброі. Эксперты былі накіраваны ў Ірак для расследавання сцвярджэнняў аб выкарыстанні рэжымам Багдада хімічнай зброі супраць сіл апазіцыі.

**АРМЕНІЯ.** 70 працэнтаў насельніцтва Арменіі жадаюць эмігрыраваць за межы рэспублікі. Паводле звестак незалежнага сацыялагічнага цэнтра, колькасць жадаючых выехаць расце з кожным годам. Калі ў 1991 годзе толькі тры працэнты апытаных выказвалі такое імкненне, а ў 1992 годзе – 10 працэнтаў, то ў гэтым – ужо 70. Выязджаюць у асноўным у Расію і ЗША. Большасць сярод выязджаючых складаюць бежанцы з Азербайджана і Нагорнага Карабаха.

Цэнтральнае разведвальнае ўпраўленне ЗША папярэдзіла прэзідэнта ЗША Біла Клінтана аб магчымасці ўзнікнення ў любы момант вострага палітычнага крызісу на Кубе з-за таго, што эканоміка гэтай дзяржавы знаходзіцца "ў стане свабоднага падзення". У краіне ўзрастае напружанасць, якая можа павярнуцца ваенным пераваротам.

* * *

**РАСІЯ.** Да мэра Масквы Лужкова звярнуўся прэзідэнт буйнейшай германскай фірмы з прапановай падарыць масквічам бязвыплатна да Новага года 100 тысяч скрынь з бананамі. Гэта складзе 10 мільёнаў штук бананаў, што значыць адзін банан на кожнага жыхара Масквы.

**ІСПАНІЯ.** Міністр абароны краіны Хуліян Гарсія Варгас паведаміў аб намеры прадаставіць у распараджэнне еўракорпуса, які фарміруецца, механізаванае падраздзяленне колькасцю ў 3500 чалавек. Германія, Францыя і Бельгія, якія з'яўляюцца ініцыятарамі стварэння агульнаеўрапейскіх узброеных сіл, накіруюць у еўракорпус кожная па 12 тысяч салдат да 1995 года. Прыход іспанскіх войскаў у еўракорпус можа яшчэ больш абвастрыць пытанне, на якой мове там будуць аддавацца каманды.



# "Ой, калядачкі, бліны, ладачкі!"



**Гэтыя словы з вядомай песні гучалі на Каляды, бадай, па ўсёй Беларусі. Мне ж давялося ўдзельнічаць у свяце і рабіць здымкі на Лепельшчыне.**

Ражство Хрыстова сустракала зямля з багатымі традыцыямі і працавітымі людзьмі. Каб усё прайшло весела і цікава, намаганні прыклалі загадчыца аддзела культуры райвыканкама Вера Закрэўская і яе супрацоўнікі. Адметная рыса Калядаў на Лепельшчыне -- так званая "жаніцьба Цярэшкі". Назіраў яе ў вёсцы Юркаўшчына. На цэнтральнай плошчы райцэнтра выступалі самадзейныя артысты. Свята ўражвала багаццем сталоў, накрытых тут жа на плошчы.

У прыцемках па вуліцах пайшлі калядоўшчыкі ў масках, з казой і мядзьведзем. Заўважу, што раней лічылася знявагай, калі яны не заходзілі ў які-небудзь дом, таму гаспадары вельмі рыхтаваліся да сустрэчы гасцей.

Свята адбылося, пакінула добры настрой, незабыўныя ўражанні.

*Аляксандр КУШНЕР*
*Фота аўтара*



## Фестывалі

# Усе мы родам з дзяцінства

**Імення святам юных талентаў стаў І Усебеларускі тэлефестываль «Усе мы родам з дзяцінства». Амаль год крочыў фестываль па гарадах і вёсках Беларусі. На ўсіх этапах яго правядзення ўдзельнічала каля 20 тысяч дзяцей і падлеткаў.**

29-30 мая ў Мінску прайшоў фінал тэлефестывалю. Удала выступілі ў ім дзіцячыя калектывы ўстаноў культуры прафсаюзаў. Пяць з іх сталі лаўрэатамі: узорны харэаграфічны ансамбль «Радасць» Палаца культуры завода штучнага валакна Магілёва, ансамбль сучаснага танца Палаца культуры металургаў Жлобіна, узорны вакальна-харэаграфічны ансамбль «Зорка» Палаца культуры прафсаюзаў Віцебска, цырк «Юнацтва» Палаца культуры «Нафтан» Наваполацка, Алена Наркевіч з Гродна (Палац культуры тэкстыльшчыкаў).

Вялікі інтарэс у удзельнікаў фестывалю выклікалі сваёй арыгінальнасцю і прыгажосцю спецыяльныя прызы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Вельмі добрую справу зрабіў з дапамогай добразычлівых людзей з дзяржаўных адукацыйных і культурных структур, грамадскіх арганізацый і спонсараў Беларускі фонд сацыяльнай падтрымкі дзяцей і падлеткаў «Мы — дзецям». Але галоўнае ў тым, што тэлефестываль аб'яднаў не толькі дзяцей, але і дарослых. Дапамог ім прыйсці да думкі, што дарослыя ў першую чаргу павінны клапаціцца аб дзецях, не шкадаваць для гэтага ні часу, ні сродкаў. Бо дзеці — наша будучае, а без будучага чалавек ніколі не будзе адчуваць сябе сапраўдным чалавекам.

**Анатоль СУША,**
**член журы тэлефестывалю «Усе мы родам з дзяцінства».**

# ЛЕПШ АДЗІН РАЗ УБАЧЫЦЬ, ТЫМ БОЛЬШ — БЯСПЛАТНА



*"Я з задавальненнем наведвала б музеі, каб не трэба было плаціць, бо зусім не да культуры, калі грошай няма.*
**Таццяна Д., студэнтка, г.Мінск".**




Духоўны спажытак не заўсёды такі дарагі, каб выключаць яго з "рацыёну". Тым больш, што Дзяржаўны мастацкі музей Беларусі кожную пятніцу можна наогул наведаць бясплатна — калі не заказваць лекцыю або экскурсію і абмежавацца праглядам пастаяннай экспазіцыі. Ну, а для тых, хто наведае музей у "платны" дзень, паведамляем кошт білетаў у снежні: школьны — 50, студэнцкі — 100, а для дарослага — 250 рублёў.

## Лятайце самалётамі!

Беларуская авіякампанія "Белавія" пачала ўкараняць стандарты абслугоўвання, якія прымяняюцца "Амерыкэн Эйрлайн". У прыватнасці, гэта датычыцца метаду рэзервавання і продажу авіябілетаў. Кампанія "Белавія" ўжо ўвайшла ў міжнародную сетку сувязі. Створаны камунікацыйны цэнтр. Ужо наладжана тэрміновае абслугоўванне, адпрацоўваюцца тэхналогіі кіравання чарговасцю рэйсаў, тарыфамі. Магчымасці ў гэтай сістэме каласальныя: пасажыр можа не толькі зарэзерваваць білеты на рэйсы многіх авіякампаній свету, але і забраніраваць месцы ў гасцініцах і нават заказаць таксі.

Адным словам — лятайце самалётамі.

**Святлана КУЛІКОВА.**

# ЯК ПАЗВАНІЦЬ НЯМЕЦКАМУ ПАСЛУ?

Вельмі проста. Дастаткова набыць персаніфіцыраваны каталог-даведнік "Беларусь адміністрацыйная і дзелавая", які выйшаў гэтымі днямі з друку.

Больш як дваццаць раздзелаў даведніка змяшчаюць падрабязную інфармацыю аб Вярхоўным Савеце і ўрадзе Беларусі, міністэрствах, дзяржаўных камітэтах, цэнтральных установах, абласных, гарадскіх і раённых органах улады з указаннем прозвішчаў, імён і імён па бацьку службовых асоб, прамых службовых тэлефонаў, факсаў, тэлексаў і тэлетайпаў.

Выданне змяшчае звесткі аб банках, біржах і гандлёвых дамах Беларусі з указаннем відаў дзейнасці і аб'ёмаў статутнага капіталу, прадстаўніцтвах замежных фірм і сумесных прадпрыемстваў, замежных пасольствах і дыпламатычных прадстаўніцтвах.

У каталогу прадстаўлены прадпрыемствы ўсіх галін прамысловасці, аграпрамысловага комплексу, малы бізнес, страхавыя арганізацыі і спецыялізаваныя медыцынскія ўстановы, сродкі масав[…] інфармацыі, кнігавыдання і рэкламы, прадпрыемс[…]вы сервісу і інш.

170 старонак еўрапейскага стандарту, больш [...] 40 тысяч адрасоў і тэлефонаў, зручнае размяшчэн[…] раздзелаў – усё гэта стане незаменнай падмог[…] у рабоце кіраўніка любога рангу, прадпрымальнік[…] дзелавога чалавека.

Кошт даведніка – 12500 рублёў. Грошы п[…]ралічвайце на разліковы рахунак ПКФ "Раскат", […] 3467666 у АКБ "Прыорбанк" у г.Мінску, код 74[…] Атрыманне даведніка – пасля прад'яўлення коп[…] плацежных дакументаў, па адрасу: Мінск, ву[…] Брылеўская, 15, каб. 226, 227, 228.

*Тэл. для даведак: 25-17-64, 23-90-29, 23-96-28.*

Гісторыя і Мы

# Што трэба ведаць кожнаму беларусу?

## Беларусу у грамадзянскім жыцці

Беларускае грамадзянскае жыцьцё твораць грамады, суполкі, таварыствы, установы, а такжэ наш тэатр, канцэрты, забавы, часопісі, промысел, гандаль, — гэта ўсе мейсцы публічнага грамадзянскага жыцця і лучнасьці.

Дык і трэба, каб усюды ў грамадзянскім жыцьцю беларус выступаў з гонарам і развагай, а глаўнае — справядліва і слушна. На сабраньнях і нарадах — будзь-то гаспадарскіх, купецкіх, духоўных, палітычных ці іншых — сьвядома беларус павінен судзіць аб усім, выходзячы з патрэб і карысьці беларускага народу.

Выбіраючы людзей на ўрады і прэдстаўніцтвы, трэба пільнавацца, каб ні выбіраць людзей чужых, ворагаў нашаго народу і нашай справы. Наадварот, трэба заўсюды старацца на ўсякія ўрады выбіраць добрых, сумленных і сьвядомых беларусаў. Васьцерагайцеся даваць уласьць над сабою людзям чужым і нівядомым!

## Як паступаць у ўрадах?

У ўрадах, валасьці, судзе і ўсюды трэба нам гаварыць толькі па-беларуску і бараніць свайго на гэта нацыянальнаго права.

## Чым можэм гардзіцца

Мы гардзімся, што мы беларусы. Бо мы народ здольны, з нашаго народу выйшло многа слаўных людзей, за якіх ніколі нівыплачэны доўг маюць перад намі і палякі (Касьцюшка, Міцкевіч, Сыракомля, Крашэўскі і шмат інш.) і маскалі (Дастаеўскі, Сымон Полацкі і шмат інш.) і іншыя нашы суседзі. Пра нашу здольнасьць сьведчаць такжэ нашы звычаі і абычаі, нашае будаўніцтво, ўсякія культурныя памяткі і інш..

Мы горды са свае мовы! Бо наша мова мэльодыйная, багатая і вельмі надаецца да песьні і паэзіі. А да таго-ж яна адна з найчысьцейшых славянскіх моваў.

Мы горды са свае песьні! Беларусы маюць вельмі многа песянь. Нота нашых песянь вельмі багата і адбівае ў сабе душу нашаго народу. Наша народная песьня займае адно з выдатнейшых мейсц між песьнямі ўсіх народаў съвету. Ёю цікавяцца вучоныя людзі чужых народаў.

Мы горды са свайго народу! Усякі іншы народ, жывучы ў такіх цяжкіх варунках, якія выпалі на нашу долю, загінуў-бы, а наш народ выказаў нізвычайную жыццёвую сілу. Ён ператрываў усякія злыбяды, ліхалецьце і напасьці ды перахаваў у сабе сваю родную мову і любоў да свае Бацькаўшчыны Беларусі. Наш народ любіць праўду і красу, — ён спакойны і разважны, а пры гэтым цьвёрды.

Мы горды са свае гісторыі! Наша гісторыя — гэта ніўпынная барацьба за волю, барацьба за захаванне свае нацыянальнае душы. Прытым, мы ніколі ні галіліся на чужое. Наша гісторыя — гэта Гольгота нашаго народу, якая чыніць яму чэсьць і славу.

Мы горды за сваю родную зямлю! Наша Бацькаўшчына — пекны край. Многа ў ёй красы: пекная ў нас весна і лето, восень і зіма. Нашы пушчы, лясы і абшары апавіты паэзіей, з якой праглядае наша мінуўшына.

Адным словам, мы горды, што мы беларусы.

В. ЛАСТОЎСКІ.

Менск, 1918 г.

Выданьне "Вольная Беларусь".

# Аб візах і не толькі аб іх

**У рэдакцыю «БЧ» паступаюць лісты, аўтары якіх скардзяцца на існуючы парадак атрымання віз для выезду ў Літву.**
**Наш карэспандэнт сустрэўся з Часова пaвераным у справах Літоўскай Рэспублікі ў Беларусі панам Альфонсасам АЎГУЛІСАМ і папрасіў яго адказаць на пытанні, якія хвалююць нашых чытачоў.**

— Я згодны з многімі нараканнямі грамадзян Беларусі ў наш адрас, — сказаў ён. — Сапраўды, мы пакуль не ў стане забяспечыць усіх жадаючых, прытым аператыўна, візамі. У першую чаргу іх атрымліваюць тыя, хто мае ў Літве сваякоў, блізкіх людзей. Ніякіх праблем для тых, хто вымушаны ехаць туды па тэлеграме з выпадку, не дай Бог, гора ці, наадварот, радаснай падзеі. Наогул, супрацоўнікі пасольства яшчэ зусім нядаўна за дзень выдавалі да 200 віз. Працавалі па 18 гадзін у суткі.

Цяпер каля будынка па вуліцы Варвашэні, дзе мы арэндуем некалькі пакояў, зранку збіраецца натоўп. Многіх людзей мы добра ведаем — гэта так званыя «чаўнакі», спекулянты, якія робяць бізнес шляхам вывазу прадуктаў з Беларусі ў Літву і «атаварвання» далярамі. Таму мы імкнемся стрымліваць іх і выдаваць дакументы на выезд тым, хто ўпершыню хоча пабываць у нашай краіне, хто едзе туды са шчырай душой, каго там вельмі чакаюць.

**— Спадар Альфонсас, нашы чытачы заклапочаны пытаннем: калі, нарэшце, будзе парадак на беларуска-літоўскай мяжы!**

— Ведаеце, гэта пытанне не да мяне, але ўсё ж паспрабую адказаць. Нядаўна мы з беларускім паслом панам Вайтовічам праехалі ўздоўж усёй мяжы, якая падзяляе нашы краіны, у 700 кіламетраў. Уражанні, мякка кажучы, самыя адмоўныя. І не таму, што ні з вашага, ні з нашага боку пагранічнікі і мытнікі не бралі пад казырок. Магчыма, гэта не віна іх, а бяда. Галоўнае — на мяжы, візітнай картцы любой дзяржавы, пануюць хабарніцтва, хамства, бяздушша да людзей, што перасякаюць граніцу. Значыць, не ўсё ў нас добра з падборам і расстаноўкай кадраў, на службу трапляюць выпадковыя асобы, гонар дзяржавы для якіх — пусты гук.

**— Хацелася б ведаць вашу рэакцыю на публікацыі газеты «Звязда» ад 14 чэрвеня, і ў прыватнасці на рэпліку «Дарэчы», у якой сцвярджаецца, што быццам бы Вы выгналі сілком маладых наведвальніц з будынку пасольства...**

— Як я ўжо казаў, мы арэндуем на трэцім паверсе некалькі пакояў. Пад выглядам супрацоўнікаў устаноў, якія тут, акрамя нас, знаходзяцца, у пасольства імкнуцца прашмыгнуць не толькі адпетыя спекулянты, але і асобы, якіх і блізка сюды нельга падпускаць: п'яныя, абы-як апранутыя... А гэта не што іншае, як непавага да маёй краіны. Існуе ж палажэнне, якое рэгламентуе парадак наведвання любой дыпламатычнай установы.

Дзяўчаты, аб якіх ідзе гаворка ў рэпліцы, з'явіліся сюды ў нейкіх парваных світках, спадніцах, што ледзь-ледзь прыкрывалі іх інтымныя месцы. Магчыма, аўтар публікацыі і ў захапленні ад такіх паненак, а для нас гэта абраза і абраза суверэннай дзяржавы. Мы будзем рабіць усё магчымае, каб нас паважалі. Асабіста ж я ніколі і нікога не выганяў. Няхай гэта «адкрыццё» будзе на сумленні журналіста.

**— Няўжо ў Мінску не знайшлося будынка, дзе б былі створаны больш-менш нармальныя ўмовы для работы дыпламатаў!**

— Напачатку пасольства знаходзілася ў гасцініцы «Арбіта». Цяпер вось арэндуем плошчу тут. Мы прасілі ўрад і Мінгарвыканком аддаць нам будынак аднаго з дзіцячых садкоў, які вызваліўся. Не, яго аддалі пад казіно. У той жа час зірніце, дзе знаходзіцца пасольства Рэспублікі Беларусь у Літве, — у шыкоўным асабняку ў цэнтры Вільнюса. Туды, упэўнены, ніколі не трапіць выпадковы чалавек.

Я толькі спыніўся на некаторых вострых пытаннях. А іх, на жаль, нямала. Напрыклад, чаму пісьмы з Вільнюса ў Мінск і наадварот ідуць праз Маскву? Каб ліст дайшоў хутчэй, чалавек вымушаны тайна перасякаць мяжу і апускаць канверт у паштовую скрыню, якая знаходзіцца ў беларускай вёсцы. Такая ж з'ява і з беларускага боку.

Спадзяюся, што нашы ўрады нарэшце зробяць усё, каб народы-суседзі жылі, як раней: мірна, спагадліва, з верай у дзень заўтрашні.

Гутарыў Янка ЗАРЭЧНЫ.

## Рэха Чарнобыля

## Медицина

## АРМІЯ ДЛЯ КАМАНДЗІРАЎ.

У сувязі з паступленнем інфармацыі з вайсковых часцей і гарнізонаў аб выкарыстанні службовымі асобамі ў войсках у асабістых мэтах (абагачэнне, будаўніцтва катэджаў, дач, гаражоў, апрацоўка дачных участкаў і г.д.) ваеннай тэхнікі, маёмасці і ваеннаслужачых тэрміновай службы, у тым ліку грамадзян Рэспублікі Беларусь, прычым у службовы час, прэс-цэнтр Беларускага Згуртавання Ваеннаслужачых (БЗВ) паведамляе, што Каардынацыйны Савет БЗВ на сваім пасяджэнні разгледзіў гэтую праблему і палічыў неабходным прыняць адпаведныя меры, накіраваныя на выключэнне з армейскай рэчаіснасці фактаў, якія дыскрэдытуюць у вачах беларускага народа Узброеныя Сілы рэспублікі.

## АДКРЫТЫ ЛІСТ МІНІСТРУ АБАРОНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Спадар генерал-палкоўнік! Дазвольце звярнуцца да вас па важнаму, на мой погляд, пытанню — аб месцы, ролі і значэнні афіцэраў запасу ў станаўленні беларускага войска. Мушу заявіць, што большасць з нас з задавальненнем успрынялі рашэнне Вярхоўнага Савета аб будаўніцтве нацыянальных Узброеных Сілаў. Для кожнага афіцэра, сяржанта, радавога лёс войска — гэта яго лёс. Канешне, для адных ён быў складаным, з муштрой і «дзедаўшчынай», для другіх — больш светлым і памятным. Тым не меньш служба, баявыя вучэнні сталі без перабольшвання школай мужнасці, гартавання, выхавання мужчынскай салідарнасці і дружбы.

Зволеныя ў запас, многія па-ранейшаму адчувалі сябе часцінкай войска, яго баявой адзінкай, гатовай па першаму загаду надзець гімнасцёрку і стаць у строй. Дастаткова ўспомніць чарнобыльскую катастрофу. Амаль чатыры гады «запаснікі» ці асабовы састаў так званага беларускага палка займаліся ліквідацыяй вынікаў трагедыі, не думаючы пра льготы і прывілегіі.

А чые мы цяпер і як нас называць? Кадравыя афіцэры прысягнулі на вернасць дзяржаве і беларускаму народу. Мы ж прысягалі верна служыць Савецкаму Саюзу. Палітыкі развалілі яго, у выніку чаго не стала Савецкай Арміі. Мы, «запаснікі», аказаліся лішнімі ў роднай краіне. Не дай Бог ніякіх трагедый ці войнаў, але ў выпадку іх мы не зможам стаць на абарону дзяржавы.
Я разумею, што цяпер міністэрству, якім вы кіруеце, не да нас. Няма, відаць, і сродкаў, каб арганізаваць зборы, дзе можна было б прыняць новую прысягу.

А можа, Вы мяркуеце ліквідаваць інстытут афіцераў запасу, а заадно сяржантаў і радавых? Тады аб гэтым трэба шчыра і адкрыта заявіць: так, маўляў, і так, беларускае войска становіцца прафесійным і няма патрэбы падтрымліваць сувязі з «запаснікамі». Сапраўды, ваенкаматы скарацім, а сродкі ад іх скарачэння пойдуць на падрыхтоўку прафесіяналаў.

Наогул, ці не замнога ў Беларусі афіцэраў запасу? Адных палітработнікаў цэлы полк набярэцца. А яны не тое што танкам кіраваць, а пісталет разабраць і сабраць не могуць. Вось такія кадры, па-мойму, якраз не патрэбны войску. Іншая справа вадзіцелі, хімікі, сувязісты, спецыялісты іншых тэхнічных прафесій. Яны павінны заставацца на вайсковым уліку.

З павагаю *Уладзімір Бацкалевіч, капітан запасу.*

ADDITIONAL READING. ЯК ЖЫВЕШ, АРМІЯ?

Вядома, што базай для пабудовы Узброеных Сіл нашай рэспублікі паслужыла Беларуская ваенная акруга. У свой час тут служыла каля 250 тысяч чалавек асабовага складу. Акрамя таго, на тэрыторыі Беларусі размяшчаліся і іншыя часці і злучэнні войск стратэгічнага назначэння былога СССР. А гэта яшчэ амаль 180 тысяч чалавек. Разам пад ружжом знаходзілася звыш 400 тысяч. Утрымаць такую армію маладой рэспубліцы пры 10-мільённым насельніцтве было яўна не па сілах. Вось чаму паралельна са стварэннем Узброенных Сіл тут пачаўся працэс кардынальнага скарачэння войскаў.

За тры апошнія гады было скарочана 465 часцей і злучэнняў, 726— рэфарміравана ў бок змяншэння колькасці. Увогуле за гэты перыяд ваенная групіроўка «пахудзела» на 76 тысяч вайскоўцаў. Толькі афіцерау звольнена ў запас 16803 чалавека. Акрамя таго, многія часці стратэгічнага назначэння былі выведзены ў Расію.

На сённяшні дзень ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь па штату 96 тысяч ваеннаслужачых, у тым ліку 23 тысячы афіцераў і 12 тысяч прапаршчыкаў. Аднак служыць тут нават некалькі меньш. Не хапае каля дзвух тысяч афіцераў, амаль столькі ж прапаршчыкаў.

Але Узброеныя Сілы — гэта не толькі ваеннаслужачыя, у нашай арміі яшчэ каля 64 тысяч рабочых, супрацоўнікаў ваенкаматаў, медыцынскіх, і дашкольных установ, спецыялістаў ваенных заводаў, служачых домакіраўніцтваў і г.д. Ці патрэбны гэтыя цывільныя асобы арміі? Канешне, не. Напрыклад, ваенныя завод дзіцячыя садкі і яслі, палікілінікі, дамакіраўніцтвы можна перадаць мясцовым органам улады. Карысць ад гэтага будзе несумненная. Бедны бюджэт ваеннага ведамства не дазваляе ўтрымліваць гэтыя установы на належным узроўні. Дарэчы, ужо 40 ваенных гарадкоў перададзены мясцовым органам улады. Толькі адна такая акцыя дазволіла сэканоміць Мінабароны 578 млн. рублёў.

Вельмі цікавая сітуацыя і з ваеннымі камісарыятамі. Іх 149, і ўсе яны на балансе Міністэрства абароны, хаця прызыў на службу ажыццяўляюць не толькі для Узброеных Сіл, але і для МУС, КДБ, памежных і чыгуначных войскаў. Чаму ж ўсе расходы, звязаныя з прызывам на тэрміновую службу, павінны класціся толькі на адно ваеннае ведамства?

Выхад адзін — паступова вызваляць армію ад выканання неўласцівых ёй задач і функцый. І такія прапановы ўжо падрыхтаваны. Перадаўшы дзяржаве ўсе гэтыя лішнія і часам грувасткія структуры, беларуская армія, нарэшце, перастане пужаць ўсіх сваёй колькасцю. І такім чынам можна будзе накіраваць вылучаныя ёй сродкі толькі на свае патрэбы, узняўшы тым самым баегатоўнасць войскаў.

Сяргей Верашчак, *супрацоўнік прэс-службы Міністэрства абароны.*

1

# У ВОЙСКА — "ЗАВОЧНА"?

*"Армія — добрая школа, але лепш яе прайсці, як кажуць, завочна. Адкажыце, калі ласка, хто вызваляецца ад службы?*

**Юра Г. г.Магілёў."**

У адпаведнасці з Законам "Аб усеагульным воінскім абавязку і ваеннай службе" не прызываюцца грамадзяне, прызнаныя па стану здароўя непрыгоднымі да ваеннай службы ў мірны час; людзі, якія адбываюць крымінальнае пакаранне і асобы, пазбаўленыя волі з тэрмінам выпраўленчых работ; адбыўшыя пакаранне за ажыццяўленне цяжкага крымінальнага злачынства; умоўна-датэрмінова вызваленыя ад прызначанага судом пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі або выпраўленчых работ — на працягу неадбытай часткі пакарання; асобы, вызначаныя судом для прымусовых мер медыцынскага характару — на працягу тэрміну дзеяння гэтых мер; людзі, у адносінах да якіх вядзецца дазнанне або следства, або крымінальная справа разглядаецца судом — да вырашэння іх справы.

Асобным катэгорыям у адпаведнасці з законам прадастаўляецца адтэрміноўка: па сямейнаму становішчу, па стану здароўя, для працягу адукацыі, атрымання ваенна-тэхнічных спецыяльнасцей, а таксама ў сувязі з дэпутацкай дзейнасцю.

Ад прызыву на ваенную службу вызваляюцца грамадзяне, якія служаць у органах міліцыі і ваенізаванай пажарнай ахове МУС, а таксама залічаныя на вучобу ў вучэбныя ўстановы гэтага міністэрства, грамадзяне, родныя браты якіх загінулі ці памерлі ў перыяд праходжання тэрміновай ваеннай службы.

3

2

# АДПАЧЫВАЙ, САЛДАТ

*"Зараз я праходжу тэрміновую службу ў войску. Адслужыў ужо шэсць месяцаў. Ці маю я права на водпуск і, калі так, то на колькі дзён?*

**У.САЛАВЕЙКА, г.Мінск".**

Безумоўна, маеце. У адпаведнасці з Законам "Аб усеагульным воінскім абавязку і ваеннай службе" ваеннаслужачым прадастаўляецца водпуск — 20 сутак салдатам і 26 сутак — сяржантам, не ўлічваючы часу праезду да месца правядзення водпуску і назад. У парадку заахвочвання водпуск можа быць павялічаны на тэрмін да 5 сутак. Працягласць яго памяншаецца на колькасць дзён арышту ваеннаслужачага ў дысцыплінарным парадку. Але ў любым выпадку водпуск не можа быць меншы за 10 сутак для салдата і 13 сутак — для сяржанта.

26.

## ПАДВЫШКА ТЫДНЯ

З 1 красавіка ўдвая падвышаецца кошт адной паездкі ў грамадскім транспарце. Талон і жэтон у метро будуць каштаваць 200 рублёў. Даражэй давядзецца плаціць за месячны білет і ў прыгарадных аўтобусах і электрычках.

## Пра «белвестаўскі» абутак я прыпеўкі вам складу

НАВАПОЛАЦК. Неверагодную рэкламную кампанію праводзіць гарадскі фірменны магазін «Белвест» на старонках «Новай газеты» — конкурс на лепшыя прыпеўкі пра абутак «Белвест» і непасрэдна пра гэтую фірменную гандлёвую кропку. Вынікі пераўзышлі ўсе чаканні: рэдакцыя штодзённа атрымлівае да 50 прыпевак. Прызавы фонд рэкламнага конкурсу вуснай народнай творчасці — тры талоны на права набыцця дэфіцытнага беларуска-германскага абутку.

JINGLE

## РАЗВЕДКА... ВУГАЛЕМ

Вытворчае аб'яднанне «Беларусьгеалогія» правяло работы па вызначэнню перспектыў вугальных пакладаў на Букчанскай плошчы ў Лельчыцкім раёне.

Геолагамі даследавана плошча ў 20 квадратных кіламетраў, на якой, паводле прагнозаў, рэсурсы бурага вугалю складаюць 16 мільёнаў тон.

Акрамя таго, геолагі распрацавалі тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне мэтазгоднасці правядзення дэталёвай разведкі Брынеўскага месца нараджэння бурага вугалю, што ў Петрыкаўскім раёне. Штогод тут можа здабывацца шахтным спосабам адзін мільён тон бурага вугалю. Прычым адпускная цана тоны бураўгальных брыкетаў складае 231,6 тысячы рублёў (у цэнах на лістапад мінулага года), а радавога вугалю — 129,9 тысячы, у той час як аптовая цана завозімага радавога вугалю значна вышэй — 200—220 тысяч рублёў за тону.

**Яўген ГРУБІЧ, БелаПАН.**

## Несці людзям палёгку

**21 САКАВІКА — ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ ГАНДЛЮ, БЫТАВОГА АБСЛУГОЎВАННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА І ЖЫЛЛЁВА-КАМУНАЛЬНАЙ ГАСПАДАРКІ.**

Пагадзіцеся, думаючы пра наш гандаль, бытавое абслугоўванне ці тую ж жыллёва-камунальную гаспадарку, уяўляеш вялікія чэргі, не зусім добрыя і гасцінныя адносіны да пакупніка ці наведвальніка-кліента, абязнелыя вітрыны і прылаўкі, блытаніну і цяганіну... Сапраўды, усё гэта пакуль ёсць у нашым сённяшнім жыцці, а яно, о-ох, якое не салодкае, з якога боку ні падыйдзі.

І ўсё ж не ўсё так чорна, як можа падацца з першага погляду. У кожнай з гэтых сфер ёсць адданыя сваёй справе людзі, чалавекалюбцы, ветлівыя гаспадары.

— Вышэйшую мэтанакіраванасць маёй працы, маёй дзейнасці бачу ў тым,— гаварыла мне днямі дырэктар магазіна садавіны і агароднiны № 1, што па вуліцы Данілы Сердзіча, Тамара Пятроўна Марціновіч,— каб несці людзям палёгку, радасць. На гэта і падначаленых скіроўваю.



Вось так: «несці палёгку» — каб усе так адносіліся да сваёй справы, не было б у нас суму на тварах.

СА СВЯТАМ!

Агенцтва інтэлектуальнай уласнасці «ІВІОР» добра вядомае ў рэспубліцы як надзейны партнёр у фінансавай, камерцыйнай, культурнай дзейнасці. Сёння агенцтва стала арганізатарам правядзення ў Мінску кірмашу «Вялікі Пекін», дзе пакупнікам прапануюцца больш за сто назваў тавараў шырокага ўжытку. Група бізнесменаў з Пекіна прывезла ў Беларусь трынаццаць тон такіх тавараў на продаж у розніцу, оптам і для паказу іх мясцовым прадпрымальнікам, якія пажадаюць зрабіць заказ на буйную партыю.

— Можна лічыць, што кірмаш удаўся,— сказаў кіраўнік агенцтва Юрый Іваноўскі,— але вынікі яго не толькі ў выгадным для абодвух бакоў продажы тавараў. Праграмай нашых адносін з кітайскімі бізнесменамі прадугледжана правядзенне ў Мінску надзвычай цікавай мастацкай выстаўкі. «Вялікі Пекін», безумоўна, стаў своеасаблівым мостам далейшых гандлёвых і культурных сувязей.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**

ЭНЕРГЕТЫКА

# «НАФТАН» ІДЗЕ ПА ШЛЯХУ «СЛАЎНАФТЫ»

Як паведамілі БелаПАНу ў канцэрне «Белнафтапрадукт», цяперашнім часам вядзецца работа па акцыяніраванню буйнейшага ў рэспубліцы нафтаперапрацоўчага камбіната — Наваполацкага вытворчага аб'яднання «Нафтан», а таксама стварэнню на яго базе супольнага беларуска-расійскага акцыянернага таварыства па здабычы, перапрацоўцы і рэалізацыі нафты і нафтапрадуктаў.

Першая супольная беларуска-расійская кампанія такога тыпу — «Слаўнафта» — створана і паспяхова функцыяніруе на базе акцыянерных таварыстваў «Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод» і расійскіх АТ «Мегіённафтагаз» і «Мегіённафтагазразведка». У рамках акцыянернага таварыства «Слаўнафта» мазырскі завод будзе атрымліваць і перапрацоўваць 6 мільёнаў тон нафты за год. Цяперашнім часам разглядаецца пытанне аб пашырэнні кампаніі за кошт уключэння ў яе некалькіх беларускіх прадпрыемстваў па рэалізацыі прадуктаў нафтазабеспячэння, такіх як ВА «Брэстаблнафтапрадукт» і ВА «Гомельаблнафтапрадукт».

Ірына САЗАНОВІЧ, БелаПАН.

## Вецер яшчэ нам паслужыць

Выкарыстанне ветру для вытворчасці электраэнергіі мэтазгоднае ў шэрагу раёнаў рэспублікі — да такой высновы прыйшлі спецыялісты энергетыкі.

Першыя ветраэлектрастанцыі, мяркуючы па ўсім, будуць устаноўлены ў Гродзенскай вобласці. Верагодна, першы вопыт у гэтай справе набудуць у горадзе Слоніме.

У жніўні група спецыялістаў-энергетыкаў рэспублікі сумесна з мэрыяй Слоніма наведае Германію. У нямецкім горадзе Ротвайлі існуе падобны прынцып самазабеспячэння энергіяй.

Ул.інф.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

**На Мінскім авіярамонтным заводзе пачалі рамонт новай авіяцыйнай тэхнікі для краін блізкага замежжа. Днямі на ўзлётна-пасадачную паласу аэрапорта "Мінск-1" прызямліўся самалёт "ЯК-42", што прыбыў з суседняй Літвы. Гэта яшчэ адзін крок да ўмацавання дзелавога і сяброўскага супрацоўніцтва паміж нашымі дзяржавамі і, вядома, новы фронт работ для мінскіх авіярамонтнікаў.**



**НА ЗДЫМКУ: авіялайнер, які трэба будзе адрамантаваць спецыялістам Мінскага авіярамонтнага завода.**

## Беларусь імкнецца гандляваць

Паводле звестак Дзяржкамітэта па знешніх эканамічных сувязях, за гады самастойнага існавання пасля распаду Савецкага Саюза Беларусь падпісала гандлёва-эканамічныя пагадненні з 27 краінамі. Звыш 100 — з'яўляюцца гандлёвымі партнёрамі рэспублікі.

За апошнія паўгода з Францыяй, ФРГ, ЗША, Вялікабрытаніяй былі падпісаны пагадненні і аб абароне інвестыцый.

## Купляем цукар за мазут і халадзільнікі

У мінулым годзе таваракабарот паміж Беларуссю і Вялікабрытаніяй склаў звыш 60 мільёнаў даляраў. Ён амаль што не знізіўся ў параўнанні з 1992 годам. Аднак змяніліся, толькі суадносіны экспарту і імпарту. Калі ў 1992 годзе Беларусь больш прадавала Англіі, чым купляла, то летась рэспубліка імпартавала тавараў на 42 мільёны даляраў, а прадала іх толькі на 19,4 мільёна. Што ж Беларусь адсылае на экспарт у Вялікабрытанію? У вялікай колькасці — мазут, аміяк, халадзільнікі і маразільнікі, трактары, шыны, фанеру, ільняную тканіну. Купляе ў англічан цукар, ячмень, запчасткі да аўтамабіляў і трактароў, каўчук, медыкаменты.

28.

# СТАЛІЧНАЯ ХРОНІКА

*ПА ПАВЕДАМЛЕННЯХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ «ДВ», АГЕНЦТВАЎ РІД, БЕЛАПАН, БЕЛІНФАРМ*

## З БЯДОЙ НЕЛЬГА ЗАСТАВАЦЦА АДЗІН НА АДЗІН

Намеснік Генеральнага сакратара ААН па гуманітарных пытаннях Пітэр Хансэн па выніках свайго знаходжання ў Мінску правёў прэс-канферэнцыю, удзел у якой прымалі таксама кіраўнік аддзялення ААН у Беларусі Мэцью Каханэ, супрацоўнік Чарнобыльскага сакратарыята ААН Давід Чыквандзе, міністр па надзвычайных сітуацыях і ахове насельніцтва ад вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Іван Кенік.

Паводле слоў Пітэра Хансэна, на наступным тыдні ў Жэневе па праблеме Чарнобыля адбудзецца сустрэча, удзел у якой возьмуць Расія, Украіна, Беларусь, а таксама краіны, якія аказваюць ім дапамогу. Будзе вырашаны шэраг пытанняў, звязаных з далейшым ажыццяўленнем праграмы ААН па пераадоленню вынікаў чарнобыльскай катастрофы.

Падчас візіту Пітэра Хансэна з прэм'ер-міністрам Беларусі Міхаілам Чыгіром былі абмеркаваны пытанні далейшага супрацоўніцтва ААН і Беларусі ў справе вырашэння шырокага спектра пытанняў, звязаных з Чарнобылем.

Як вядома, з 1991 года ААН пачала ажыццяўленне праграмы па аказанню дапамогі СССР. Пасля распаду Саюза кожная з краін вымушана была самастойна абараняць правы на атрыманне неабходнай дапамогі. Шмат намаганняў Беларусі спатрэбілася, каб Сусветная арганізацыя аховы здароўя на сваіх пасяджэннях паставіла кропку ў спрэчцы навукоўцаў-медыкаў, прызнаўшы, што рак шчытападобнай залозы мае радыяцыйнае паходжанне.

На Беларусі на сённяшні дзень, паводле слоў Івана Кеніка, дзейнічаюць тры рэабілітацыйныя цэнтры для пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы. Міністр па надзвычайных сітуацыях паведаміў, што, па прыблізных падліках, Беларусі неабходна каля 150 мільёнаў долараў ЗША толькі на закупку медыкаментаў і 500-600 мільёнаў долараў — на закупку абсталявання для штогадовага абследавання насельніцтва, якое падвергласся ўздзеянню радыяцыі і пражывае ў «радыеактыўнай» зоне.

**Андрэй СЕРАДА.**

(This is an excerpt from a real letter, sent from Belarus to relatives in the USA).

З кастрычніка я пайшла на пенсію. Здаецца, не вельмі своечасова, таму што пенсія маленькая, а цэны павялічваюцца і павялічваюцца. Але зараз ужо позна гаварыць аб гэтым: на працу вярнуцца не магу, таму што маё месца там ужо занята. Раней трэба было разважаць.

1. What happened in October? Is the author of the letter satisfied with the event? Why?

_______________________________________________

_______________________________________________

_______________________________________________

_______________________________________________

2. What does the writer regret? Why can't the situation be fixed?

_______________________________________________

_______________________________________________

_______________________________________________

_______________________________________________

Дочачка!

Я буду дома толькі пасля 6-ц
Не чакай мяне, паясі. Суп на пяч
мяса з макаронай на патэльні.
Разагрэй усё. Вазьмі ў халадзільні
сок і марожанае (у маразілцы).
І, калі ласка, калі паесі, не запа
мятай пазваніць урачу (Я не зма
заўтра быць у яго).
Ты абяцала мне гэта зрабіць

Цалую,
мама

1. What's for lunch?

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

2. What is the daughter supposed to do after lunch and why was she asked to do this?

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

______________________________________________

Зіна!

Ты што сёння робіш? Давай пойдзем у кіно, а? Табе не здаецца, што нам проста неабходна убачыцца: у апошні раз я бачыў цябе ў 11 вечара – учора. А зараз ужо 9 раніцы (наступнага дня!!!). Значыцца, мы не бачыліся ўжо 10 (дзесяць!) гадзін.

Калі не жадаеш у кіно, пойдзем куды хочаш. Добра?

Косця.

P.S. Адразу напішы адказ.

1. Where does Kostya invite Zina to?

________________________________________

2. What does Kostya write about the urgency of the meeting with Zina? (why? when did they see each other? etc.).

________________________________________

# Аб'ява

Збег маленькі сабачка, увесь чорны, толькі на спіне невялікая белая пляма і левае вуха таксама белае. Вочы вельмі разумныя.

Калі хто-небудзь знайшоў яго ці, можа быць, бачыў, патэлефануйце, калі ласка, Васілю: 354 - 60 - 73.

1. What is the topic of this announcement?

______________________________

______________________________

______________________________

2. What does this lost object look like?

______________________________

______________________________

______________________________

______________________________

______________________________

1. ПАХОДЖАННЕ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ.

Продкі беларусаў, рускіх і ўкраінцаў у перыяд Кіеўскай Русі складалі адзіную мову. У выніку распада Кіеўскай Русі ў XIV-XVI стагоддзяў сфарміраваліся тры брацкія народнасці, і адпаведна ў гэты перыяд утварыліся і мовы — беларуская, руская, украінская.

У Вялікім Княстве Літоўскім, у склад якога ўваходзілі беларускія землі (XIII—XVII стст.), мова беларусаў была прынята як дзяржаўная: на ёй вяліся дзяржаўныя справы, дыпламатычная перапіска, выдаваліся законы, вялося выкладанне ў школе; ствараліся літаратурныя творы, вучэбныя кнігі і інш. З таго часу захавалася многа рукапісных помнікаў.

2. ПЕРАПІС НАСЕЛЬНІЦТВА КІТАЯ.

Як паведаміла Дзяржаўнае статыстычнае упраўленне Кітая, на нуль гадзін 1-га ліпеня 1993 года ў Пекіне насельніцтва кантынентальнай частцы Кітая складае 1 мільярд 151.3 мільёна чалавек — гэта на 81 мільён больш у параўнанні з 1987 годам.

3. КАТАСТРОФА НА ШАШЫ.

Больш за 30 легкавых аўтамабіляў і грузавых машын сутыкнуліся на магістралі Брусель—Люксембург. Загінула некалькі чалавек. Адзін з вадзіцеляў згарэў зажыва. Прычына катастрофы — моцны туман на дарозе.

4. НЕ ПАКІДАЮЦЬ Ў БЯДЗЕ.

Па запрашэнню Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі ў Мінску знаходзіцца дэлегацыя штата Нью-Йорк на чале з сенатарам кангрэса ЗША Холандам Джзефам.

Прадстаўнікі грамадскіх арганізацый штата, а таксама кіраўнікі школы Рамапа, якая вось ужо некалькі гадоў дапамагае беларусам, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, пацвяржаюць прыхільнасць да беларускага народа і жаданне далейшага супрацоўніцтва і дапамогі не толькі на словах. На гэты раз яны прывезлі з сабой 67 скрынак медыкаментаў для беларускіх бальніц.

5. НАПАДЗЕННЕ ЭКСТРЭМІСТАЎ.

Егіпет. Раніцай 18 жніўня ў цэнтры Каіра адбылася спроба забойства міністра ўнутраных спраў Егіпта аль-Альфі. Некалькі тэрарыстаў ва ўпор расстралялі яго машыну. Міністр паранены ў руку. Некалькі яго асабістых целаахоўнікаў забіты. Групе экстрэмістаў пасля нападзення ўдалося ўцячы на аўтамашыне.

6. НОВАЕ МУЗЫЧНАЕ ШОУ.

Аматараў творчасці Луіса Армстронга чакае прыемны сюрпрыз. Музычны калек падрыхтаваў шоу, прысвечанае памяці выдатнага музыканта. Шоу называецца «Музычная легенда Амерыкі» і аснована на музычнай біяграфіі Луіса Армстронг У аркестры гэтага музычнага калектыву шмат вядомых выканаўцаў, аднак ёсць і таленавітыя музыканты-аматары. Шоу будзе паказана ў ЗША, у Японіі, у Еўропе

1. What kind of show was prepared?
2. What was this show based on?
3. Who will be among the performers?
4. Where will this show be staged?

7. БАЧЫЦЬ НОЧЧУ.

«Чалавек з начнымі вачамі» — так клічуць юнака з кітайскай правінцыі Хунань. Аднак суседзі не верылі ў яго здольнасць бачыць у цемры. Няшчастны выпадак даказаў гэта. Вёска была разбурана ураганам. У цемры юнак вывеў сваякоў і суседзяў у небяспечнае месца, дапамог параненым. Малады чалавек аднолькава добра бачыць і ўдзень і ноччу.

1. What unusual ability does this youth have?
2. What happened in the village?
3. How did the youth demonstrate his unusual ability?

8. У ПАЛОНЕ ЗАБАБОНАЎ.

Група амерыканскіх вучоных лічыць, што газеты, якія публікуюць астралагічныя прадсказанні, павінны указваць, што прадсказанні не маюць пад сабой навуковай асновы. Вучоныя занепакояныя тым, што паводле даных Інстытута Галлапа ў астралогію верацъ 55% юных амерыканцаў, тады як 6 гадоў таму такіх людзей было 40%.

1. What opinion do American scientists have regarding astrological predictions?
2. What is their concern?
3. What percent of Americans believe in astrological predictions?
4. What percent of Americans believed in them 6 years ago?

9. НОВЫ РУХАВІК.

Амерыканскія інжынеры жадаюць зрабіць рухавік для аўтамашыны, які б працаваў на сумесі вугалю і вады. Паводле звестак французскай газеты «Мате[illegible] яны здолелі сканструіраваць эксперыментальны рухавік, аднак ён занадта вялік[illegible] нават для сярэдніх грузавікоў. На думку спецыялістаў, выпуск такога рухавіка пачнецца гадоў праз 50.

10. АВІЯКАТАСТРОФА ВА ФРАНЦЫІ.

Шэсць чалавек загінула ў выніку авіякатастрофы ў раёне парыжскага аэрапорта ў Буржэ. Пілот невялікага прыватнага самалёта, узятага на пракат групай турыстаў, пры пасадцы ў густым тумане праскочыў узлётна-пасадачную паласу. Самалёт урэзаўся ў будынак мэблевага магазіна ў невялікім населеным пункце ў кіламетры ад аэрапарта.

11. НОВЫ РЭКОРД

24-гадовы егіпцянін О. А. Маіцца устанавіў новы рэкорд хуткасці па перасячэнню праліву Па-дэ-Кале ўплаў, паведамляе агенства Франс Прэс. Ён праплыў па маршруту Дувр-Кале-Дувр (64 кіламетры) за 21 гадзіну 37 хвілін. Аднак гэта рэкорд сярод мужчын. Першынство сярод жанчын трымае спартсменка з Аўстраліі. Яна праплыла гэтую адлегласць за 18 гадзін 15 хвілін.

12. КАМЕТА ЎПАЛА Ў МОРА.

Англійскі навуковы часопіс паведаміў, што геолагі знайшлі кратар на дне акеяну , недалёк ад узберэжжа Канады, дзе яны вялі пошук нафты. Дыяметр падводнага кратэру дасягае 11 з паловай кіламетраў.

Вучоныя лічуць, што кратары на дне мора з'яўляюцца пры падзенні метэарытаў. Вада займае 70% зямной паверхні, вось чаму метэарыты часцей падаюць у акіян, чым на зямлю.

13. ШКОЛА ТУРЫСТАЎ.

У Парыжы нядаўна адкрылася новая школа пад назвай «Прырода і здольнасць чалавека заставацца з ёю адзін на адзін». Яе дзверы адчынены для кожнага, хто любіць турысткія пешыя паходы, падарожжы на веласіпедах альбо вярхом, на лодках ці каноэ. Тры асноўныя прадметы ўваходзяць у праграму навучання, як самому пракарміцца, як пабудаваць жыллё, як перамяшчацца ў любых прыродных умовах: у лесе, у пустыне, па вадзе.

Парыжане называюць яе «Школай прыгод». Яна карыстаецца вялізарнай папулярнасцю, класы яе запоўнены людзьмі ўсіх узростаў і любых прафесій. Студэнты гавораць: ад камфорту і прагрэсу таксама патрабуецца адпачынак.

1. Who is the new school for?
2. What are the basic subjects taught in this school?
3. What was the Parisians' reaction to the opening of this school?

14. НА ЗЯМЛІ НЕБЯСПЕЧНЕЙ

Які від транспарту апасней — самалёт ці аўтамабіль? Брытанскія вучоны аўтарытэтна заяўляюць: аўтамабіль. Па статыстыцы на дарогах свету кожны го гіне каля 250 тыс. чалавек, а ў выніку авіякатастроф — менeй за 2 тысячы. Паводле гэтых падлікаў, самалёт у 125 разоў небяспечней за аўтамабіль.

15. ІТАЛЬЯНЦЫ ПАДРАСЛІ.

За апошнія 10 гадоў рост італьянцаў змяніўся. Яны сталі вышэй на 2 санціметры. У 1986 годзе сярэдні рост італьяцаў быў роўным 173 см., а ў 1993 — 175см. Розніца ў росце складае больш за 3 см. Рост самага высокага італьянца — 178 см, а самага нізкага — 169.

16. ЯПОНСКІЯ ДОЎГАЖЫХАРЫ.

У гэты час у Японіі жыве 1981 чалавек ва узросце звыш 100 гадоў. Спецыялісты лічуць, што колькасць доўгажыхароў да канца гэтага года павялічыцца да дзвух тысяч. Большасць доўгавечнікаў — жанчыны. Самай старэйшай з іх зараз 110 гадоў. Доўга жыхары на здаро'е не скардзяцца, выглядаюць здаровымі і энергічнымі.

17. КОЛЬКІ СМЯЮЦЦА ФРАНЦУЗЫ.

Аказваецца, французы раней смяяліся больш і дольш. У 1939 годзе француз у сярэднім смяяўся 19 хвілін у дзень, у 1980 — смяяўся 6 хвілін, а ў 1990 толькі адну хвіліну.

Французы зараз сталі песімістамі і бачаць усё ў чорным святле. Газеты лічаць беспрацоўе галоўнай прычынай зніжэння весялосці. А смех вельмі патрэбны і карысны для здароў'я. Некаторыя ўрачы сцвяржаюць, што хвіліна смеха і 45-мінутная зарадка прыносяць аднолькавую карысць здароў'ю чалавек

18. СТОЛ З СЮРПРЫЗАМ.

Жыхар Італіі Джон Кардзіні быў задаволены. За невялікую суму яму ўдалося купіць на аукцыёне ў горадзе Турыне амаль новы стол. Але калі ён знайшоў у стале 7.5 мільёнаў лір, ён не мог паверыць у сваё шчасце. Выяснілася, што аўкцыянер памылкова прадаў рабочы стол касіра. Суд прызнаў, што стол і ўсё, што ёсць у стале, належыць Джону Кардзіні.

A. John Cardini and the auctioner made a mistake.
B. John Cardini bought a new desk.
C. John Cardini boght thr desk for 7.5 million lira.
D. Everything in the desk belongs to Cardini.

19. ЗАКОН АБ ЗАБАРОНЕ КУРЭННЯ.

Парламент Англіі збіраецца ўнесці закон аб забароне курэння для вадзіцеляў машын, матацыклаў у час язды. Шмат якія лічуць, што гэта неабходна зрабіць, каб знізіць колькасць дарожна-транспартных здарэнняў.

20. У ЛЮСТЭРКУ СТАТЫСТЫКІ.

Працоўныя рэсурсы Беларусі склалі 6 мільёнаў чалавек альбо 58% агульнай колькасці насельніцтва. У народнай гаспадарцы занята 4,3 мільёна чалавек. Працягваецца працэс фарміравання новых рынaчных структур.

На пачатак красавіка ў службе занятасці знаходзілася на ўліку 52,4 тысячы беспрацоўных, дапамогу атрымалі 27,3 тысячы чалавек, або 52% агульнай колькасці беспрацоўных. На сацыяльную падтрымку грамадзян, якія маюць патрэбу ў працаўладкаванні, у першым квартале было зрасходавана 253,7 мільёна рублёў.

21. ПРАФЕСІІ І СТРЭС.

У газеце «Сандi Таймз» апублікаваны даныя, якія даюць ясную карціну, наколькі прафесія чалавека і яго псіхалагічнае здароў'е залежаць адзін ад другога. Найбольшаму стрэсаваму ўздзеянню падвяргаюцца лётчыкі і паліцэйскія. Яны стаяць першымі на карэляцыйнай шкале прафесій і стрэсаў. Вайскоўцы ў гэтай шкале займаюць перадапошняе месца, а настаўнікі — сярэдняе ... .

22. ГУМАНІТАРНАЯ ДАПАМОГА.

ЗША падорыць Грузіі 160 тысяч тон пшаніцы, аб'явіла міністэрства сельскай гаспадаркі Злучаных Штатаў. Безвыплатная пастаўка гэтай буйнай партыі збожжа коштам у 30 мільёнаў даляраў будзе праведзена ў рамках праграмы «Харчаванне ў імя прагрэсу», мэта якой— садзейнічаць развіццю прыватнага сектара эканомікі.

23. НОВАЯ ПАДВОДНАЯ ЛОДКА.

Па паведамленню часопіса «Інтэрнэшенел дыфэнс рев'ю», у Велікабрытаніі спушчана на ваду дзізельная падводная лодка тыпу «Апхолдзер». Яна павінна прайсці хадавыя іспыты ўгэтым годзе, а ў наступным вайсці ў баявы склад ангельскіх ВМС.

Да 1998 года ВМС Велікабрытаніі павінны атрымаць 10 падводных лодак тыпу «Апхолдзер».

24. КАМАРЫНАЕ НАШЭСЦЕ.

КАЗАХСТАН. Кіраўнік Кзыл-Ардынскай абласной адміністрацыі Сеплбек Шаўхаманаў вырашыў выдзяліць $100 тысяч для знішчэння... камароў. Гэтыя насякомыя сталі сапраўдным бедствам не толькі ў вобласці, але і ў самім абласным цэнтры, дзе яны цудоўна адчуваюць сябе ў хранічна затопленых падвалах дамоў. На выдзеленыя сродкі будзе закуплены ў Францыі прэпарат «Бытакс», з дапамогай якога і спадзяюцца перамагчы камарынае нашэсце.

25. НОВЫЯ МАНЕТЫ.

Сінгапур. Як паведаміла валютнае упраўленне Сінгапура, 28 верасня ў абарот (=абарачэнне) выпусцяць новыя манеты вартасцю 1 цэнт і 1 долар. Такім чынам, завяршыцца праграма замены ў краіне ўсіх металічных грошаў, якая пачалася яшчэ ў 1965 годзе.

Усе новыя манеты значна адрозніваюцца ад ранейшых як па канфігурацы так і па вазе. Яны маюць форму васьміграннікa і значна лягчэй.

1. Coins of what value will be issued?
2. What program was started in 1965?
3. How do new coins differ from the old ones?

26. ЗЕЛЯТРУС У ЯПОНІІ.

Токіо, 18 красавіка. Метэаралагічная служба Японіі паведаміла аб буйным землятрусе, які адбыўся на востраве Кюсю. Сіла зелятрусу склала 6,9 бала па шкале Рыхтэра. Паводле папярэдніх даных, адзін чалавек загінуў і чатыры параненыя. Разбурана шмат будынкаў.

Спецыяльныя атрады паліцыі і вайсковыя часці прымаюць удзел у аказанн дапамогі пацярпеўшым.

27. АВІЯКАТАСТРОФА Ў МЕКСІКЕ.

Лос-Мачыс, Мексіка, 30 студзеня. — Дзвухматорны вінтавы самалёт ДС-3 авіякампаніі «Аэра-Каліфорнія» ўрэзаўся ва ўзгорак і згарэў. Усе, хто знаходзіўся на борце самалёта — 18 пасажыраў і 3 члены экіпажу — загінулі. Усе яны былі мексіканскімі грамадзянамі.

Сведкі расказваюць, што самалёт, які павінен быў прыземліцца ў межнародным аэрапорце Лос-Мачыса, аднак не прыземліўся з-за густога туману, спрабаваў сесці на поле аэрадрома, якім карыстаюцца толькі самалёты сельскагаспадарчай авіяцыі. Не дацягнуўшы да пасадачнай паласы, ДС-3 урэзаўся ў прыгорак.

«Лётчык дзейнічаў на свой страх і рызыку (=на сваю адказнасць)>, сказаў журналістам генеральны мэнеджэр кампаніі «Аэра-Каліфорнія» Энрікe Гомес Ланос.

28. *КАНВЕРСІЯ.*

У рамках канверсіі на Гомельскім радыёзаводзе асвоены выпуск малагабарытных тэлевізараў. Першыя прыёмнікі найбольшы попыт знайшлі ў аўтамабілістаў. Прадпрыемства разлічвае ў месяц выпускаць не менш за тысячу блакітных малагабарытак, Праўда, сёння прагназіраваць нябяспечна: эканамічная сітуацыя непрадказальная.

29. АВІЯКАТАСТРОФА Ў ІНДАНЕЗІІ.

ДЖАКАРТА, 16 красавіка. Пры пасадцы ў аэрапорце Медзіны (востраў Суматра) ў пасажырскі самалёт ДС-9 ударыла маланка, пасля чаго ён згубіў вышыню і пачаў падаць. У выніку з 37 пасажыраў і 8 чалавек экіпажу — 28 загінулі, астатнія — паранены. Авіялайнер мясцовага злучэння ўжо заканчваў палёт па маршруту Джакарта — Маніла, калі пілот перадаў дыспетчару: «У нас трапіла маланка, мы губляем вышыню!»

Select the most appropriate statement:

A. The cause of the accident is unknown.
B. The accident was caused by lightning
C. As a result of the accident 37 passengers died and 8 were injured.
D. The accident occured during take off.

30. СТЫХІЯ ПРЫНЕСЛА БЯДУ.

Маніла. З Новай Гвінеі працягваюць паступаць паведамленні аб шкодзе, якую прычыніў моцны землятрус (7,4 бала па шкале Рыхтэра). Сотні дамоў разбураны поўнасцю на густанаселеным востраве Умбой. Целыя вёскі зраўнаваны з зямлёй. Стыхія знесла ўсе масты. Пакуль немагчыма дабрацца да раёнаў разбурэнняў, каб ацаніць усе вынікі катастрофы.

A. A powerful hurricane hit New Guinea.
B. Hundreds of homes have been completely destroyed.
C. All the power lines are down.
D. Damages are calculated to be in the millions of dollars.

31. ЦІТАНІК.

Прычынай гібелі «Цітаніка» было зусім не сутыкненне з айсбергам, а пажар, які ўспыхнуў на караблі за тры дні да трагедыі.

Гэтую сенсацыйную дагадку выставіў журналіст Іван Бразаў у перадачы, якую паказвалі ў нядзелю па пятаму каналу французскага тэлебачання. Згодна версіі журналіста пажар пачаўся ў адным з адсекаў судна, дзе захоўваўся вугаль, і трое сутак ніхто з пасажыраў не дагадваўся аб гэтым. На думку Бразова, фатаграфіі астаткаў карабля пацвярджаюць, што ў месцы пажару адбыўся ўзрыў.

1. According to the latest theory, what was the cause of the "Titanic" disaster?
2. When and where was this theory made public?
3. What do the photos of ships's remains confirm?

32. САЛОДКАЯ ЎЗНАГАРОДА.

На Расоншчыне інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны да 50-й гадавіны вызвалення краіны і раёна ад фашысцкіх захопнікаў кожнага ўзнагародзілі ... двума кілаграмамі цукру. Прычым бясплатна.

Ініцыятыву ўзяла ў свае рукі дырэктар малога прадпрыемства Людміла Уладзіміраўна Бубнова, якая звярнулася ў пасялковы Савет са спісамі і праз магазін атаварыла інвалідаў. Жанчыне трэба сказаць дзякуй. Для салодкага і шчаслівага жыцця, за якое змагаліся франтавікі, хапіла двух мяшкоў цукру.

33. ВАЕННАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА.

Начальнік галоўнага штабу ВПС Аргенціны генерал Эрнеста Крэспо навед Бразілію. Па паведамленню агенства Пренса Лаціна, у ходзе перамоў абмяркоў пытанні, звязаныя з сумеснай вытворчасцю новага самалёту СБА-123, а таксам набыццём 30 бразільскіх ваенна- вучэбных самалётаў «Тукано» для аргенцінскіх

1. Who visited Brazil? 2. What questions were discussed during the negotiations?
3. What does Brazil sell?

34. НАДВОР'Е.

Сёння ўдзень чакаецца цёплае надвор'е. Месцамі — кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра: у Віцебску— ад 10 да 12, Магілёве — ад 10 да 13, Мінску і Гродна —ад12 да14, Гомелі — ад 13 да 15, Брэсце — ад 14 да 16 градусаў цяпла.

У наступныя двое сутак у заходніх раёнах пройдуць кароткачасовыя дажд 17 красавіка — пераважна без ападкаў. Тэмпература ноччу — ад 5 да 10, удзен 9 да 14, у паўднёвых раёнах ноччу ад 7 да 12, удзень — ад 14 да 19 градусаў ця

35. ПАЖАР НА ТАНКЕРЫ.

Масква, 6 сакавіка. — Лонданскі штотыднёвік «Абсервер» паведаміў аб пажары на танкеры ў наварасійскім порце на Чорным моры. Газета піша, што пажар працягваўся 2 гадзін, але не дае сведак аб стратах ці аб ахвярах.

*Which statement best summarizes the passage?*

A) The fire broke out at 12 o'clock.
B) The fire didn't cause serious damage.
C) There no information about casualties.
D) The fire lasted for a few hours.

36. ВІЗІТ У ЗША.

Начальнік аб'яднанага камітэту начальнікаў штабоў Японіі генерал С. Морі адправіўся ў 10-дзённую паездку ў ЗША. У праграме яго прабывання (=знаходжання) перагаворы ў Пентагоне, агляд шэрагу амерыканскіх ваенных аб'ектаў. Афіцыйна аб'яўлена, што мэтай яго паездкі будзе «абмен меркаваннямі па пытаннях ваеннага супрацоўніцтва» .

37. ВЕНЕЦЫЯ.

Прысаромленыя венецыянскія гандальеры вярнулі грошы французскай сямейнай пары, з якой за гадзінную прагулку на гандоле ўзялі 340 даляраў. Звычайна ж кошт такога падарожжа — каля $50 гадзіну. Французы накіравалі ў муніпалітэт Венецыі скаргу. Паводле слоў гандальераў, яны не змаглі высветліць, хто загнуў непамерную цану, але яны прынеслі пацярпеўшым пісьмовыя прабачэнні і поўнасцю вярнулі ім грошы.

38. ДРУГІ РАЗ ПРАЗ АТЛАНТЫКУ.

Першым чалавекам, які рызыкнуў пераплыць Атлантычны акеян на вёславай лодцы, быў Том Маклін з Дубліна. Гэта здарылася ў 1969 годзе. А нядаўна адважны (=бясстрашны, смелы) Том, якому зараз 48 гадоў рашыў паўтарыць падарожжа на лодцы «Скола-1081». Застаецца толькі пажадаць яму шчаслівага плавання і нагадаць: рэкорд на веслах праз Атлантыку належыць Жерару д'Абавілю з Францыі —71 дзень і 23 гадзіны.

39. НА АЗДАРАЎЛЕННЕ Ў ГЕРМАНІЮ.

Мінск, Сярод пасажыраў авіялайнера, што з аэрапорта «Мінск-2» узяў курс на Германію, на гэты раз было 28 дзяцей — у аснаўным з чарнобыльскай зоны. Як і летась, іх запрасілі да сябе грамадзне Мюнхена, Гамбурга і іншых гарадоў Германіі.

А пачалося ўсё з паездкі туды экстрасенса Васіля Конанцова. Там ён праводзіў дабрачынныя сеансы бескантактнага лячэння. У адказ на гэта грамадкасць Мэнхена пачала збіраць сродкі для аздараўлення беларускіх дзяцей — пакутнікоў Чарнобыля. Летась такім чынам там адпачылі 170 дзяцей з зоны. Усе яны жылі ў нямецкіх сем'ях.

40. НАЧНЫ БАР У БАБРУЙСКУ.

У Бабруйску адкрыўся першы начны бар. Пад гэту пацяшальную ўстанову з семнаццаці гадзін вечара і да пяці раніцы аддадзена малая зала ў старэйшым гарадскім рэстаране. На ўпарадкаванне бара патрацілі некалькі мільёнаў рублеў. Цяпер гаспадары шукаюць добрага скрыпача.

41. МАНЕЎРЫ НАТО.

Буйныя манеўры ваенна-паветраных сіл НАТО под кодавай назвай «Сентрал Энтэрпрайз» прайшлі над Цэнтральнай Еўропай. Яны ахоплівалі паветраную прастору Германії, Францыі, Даніі, Бельгіі, Галандыі і Англіі.

Галоўнай мэтай манеўраў была «праверка баявой гатоўнасці, ваеннай магутнасці і ўзаемадзеяння ваенна-паветраных злучэнняў краін-членаў НАТО» .

42. МАНЕТЫ Ў ФАНТАНЕ.

«Каб зноў прыехаць у Рым, кіньце манетку ў фантан Трэві,» — гаворыць турыстам экскурсавод. І госці Рыма паслухмяна выконваюць гэтую параду. Вын Штогод перад пачаткам турысцкага сезону воду спускаюць, і служачыя муніцыпалітэта пачынаюць змятаць манеткі да кучы. Потым іх збіраюць і пераліче

У гэтым годзе сума, якая ляжала на дне «Трэві», склала — 46 тысяч даляра

43. МЕРЫ СУПРАЦЬ СНІДА.

Лівійскае агенства ДЖАНА са спасылкай на афіцыйнага прадстаўніка міністэрства аховы здароўя паведаміла, што ўсе хто ўязджае ў краіну павінны будуць мець пры сабе сэртыфікат, які сведчыць аб адсутнасці ў іх сіндрома набытага імунадэфіцыту (СНІД). Гэтая мера, указвае агенства, прызнана прадухіліць пранікненне апаснага захворвання ў Лівіі.

44. ЧАРГОВЫ КРАДЗЁЖ.

Двое ўзброеных асоб укралі ў пятніцу гравюры Пікассо і 26 карцін іншых аўтараў, якія знаходзіліся ў галерэі мастацваў ва Фларідзе, паведамляюць агенствы. У час нападу на музей злодзеі абязброілі і звязалі гаспадара музея і двух супрацоўнікаў, пасля чаго бесперашкодна скрыліся з месца злачынства.

45. НА ПАЛІГОНЕ Уайт-Сэндз (штат Нью-Мексіка) праведзены іспыты моцнага лазера. Як адзначыла міністэрства абароны ЗША, у ходзе іспытаў, праведзеных 2 лістапада, прамень хімічнага лазара, які працуе ў інфрачырвоным дыяпазоне, паразіў ракету-мішэнь у палёце і разбурыў яе «важныя кампаненты».

46. ПАДРАБЯЗНАСЦІ КАТАСТРОФЫ НА ЧЫГУНЦЫ.

«Звязда» паведамляе падрабязнасці катастрофы на чыгунцы, якая здарылася ў горадзе Жодзіна. Лакаматыў таварнага цяніка, ішэдшы з хуткасцю 140 км у гадзіну, наляцеў на апошні вагон пасажырскага поезда. Толькі некалькі чалавек у апошніх дзвух вагонах засталіся ў жывых. Афіцыяльна колькасць ахвяр не паведамлялася. Імёны загінуўшых пакуль не вядомы, паколькі не ўсе мелі пры сябе дакументы.

47. САМЫ ШУМНЫ ГОРАД.

Егіпетская сталіца — 12-мільённы Каір становіцца адным з самых шумных горадоў света. Як паказала апошняе даследаванне прафесара Салаха Сулеймана, у жылых раёнах горада ўзровень шума дасягае 88 дэцыбелаў. У дзелавой частцы горада ён перавышае 90 дэцыбелаў. Для параўнання можна сказаць, што шумавы бар'ер у Нью-Ёрке складае 87 дэцыбелаў. На думку вучоных, узровень шума ў 70 дэцыбелаў уяўляе значную небяспеку для здароўя чалавека.

48. НЕЗВЫЧАЙНАЕ ПЛЕМЯ.

Маніла. Інданізійская газета « Суара памбаруан» надрукавала паведамленне Куснера Эфендзі, які ўжо 32 гады працуе ў лесах на востраве Суматра. Ён сцвяржае, што там жыве ў пячорах невядомае племя. Рост людзей гэтага племені ўсяго каля метра. Харчуюцца яны сырой рыбай з рэк, усім прыдатным для яды (=ядомым), што можфна раздабыць у лесе, і не ведаюць, што такое аддзенне.

49. АКІЯНСКІЯ ВЕЛІКАНЫ.

Мапуту. Рыбакі звычайна любяць перабольшваць свае поспехі. Аднак на гэты раз шалі (=вагі) ў сталічным «Марскім клубе» на гарадской набяражнай пацвердзілі, што 4 аматары падводнай лоўлі сапраўды паставілі своеасаблівы рэкорд. Звыш за паўтоны рыбы — такая здабыча ўсяго за некалькі гадзін. 160 кілаграмаў важыла акула, якую падстралілі з падводнага ружжа каля патанулага карабля ў мапутскай гавані.

Толькі нямнога адстаў ад яе па вазе 150 кілаграмовы марскі акунь. Астатнюю «дробязь» злавілі на вудачкі.

50. ПАДАРОЖЖА.

Мінскае гарадское бюро падарожжаў і экскурсій арганізуе паездкі па наступных маршрутах:

Частка 1.

Паездка па сталіцах краін Сярэдняй Азіі. Працяг падарожжа — 21дзень, кошт пуцёўкі (уключаючы харчаванне, экскурсійнае абслугоўванне і г.д.) — 130 000 рублёў.

У час падарожжа турысты азнаёмяцца з вядомымі ва ўсім свеце помнікамі архітэктуры.

Частка 2.

Паездка па Малдове. Працяг падарожжа — 20 дзён. Маршрут пачынаецца ў Кішынёве — сталіце краіны сонца і вінаграда. Тут турысты прабудуць 5 дзён. За гэты час яны агледзяць горад, яго музеі, наведаюць адз з тэатраў, пабываюць у вінаробнай гаспадарцы. Потым на цеплаходзе адправяцца ўніз па Днястру. Падарожжа закончыцца на ўзбярэжжы Чорнага мора. 10 дзён турысты будуць адпачываць на турбазе, размешчанай у невялік пасёлку недалёка ад горада Адэса, наведванне якога ўваходзіць у праграму прабывання турыстаў.

Кошт пуцёўкі — ад 75 да 100 тысяч рублёў у залежнасці ад катэгорыі білетаў на цеплаходзе.

51. БЕЛАРУСКА-АМЕРЫКАНСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ.

Учора ў Мінску пачала працаваць беларуска-амерыканская навукова-практычная канферанцыя «Бізнес-94», на якой намечана абмеркаваць пытанні прыцягнення ў краіну замежных інвестыцый, развіцця знешнеэканамічнага супрацоўніцтва і абмену эканамічнай інфармацыяй.

У рабоце канферэнцыі, якая разлічана на тры дні, удзельнічаюць прадстаўнікі больш трыццаці замежных кампаній і каля 50 — з нашага боку.

52. ПАДПОЛЬНЫЯ СКЛАДЫ.

Каір. У выніку кампаніі па барацьбе з тэрарызмам і бандытызмам, у адн з правінцый Верхняга Егіпта былі выяўлены падпольныя склады зброі. Паліцэйскія канфіскавалі 13 буйнакаліберных кулямётаў, зенітныя кулямёты, некалькі сотняў адзінак аўтаматычнай зброі. Арэставаны 18 чалавек.

53. АЛКАГОЛЬ У СЯМ'І.

Сярэдняя амерыканская сям'я траціць у месяц 107 даляраў на падтрым здароўя і лячэнне кожнага члена сваёй сям'і. Калі ж у сям'і ёсць хаця б адзін алкаголік, выдаткі павялічваюцца амаль удвая — да 210 даляраў у месяц.

*The average American family*

A. spends $107 on alcohol.
B. spends more than 2$100 on medical expenses.
C. has at least one member with drinking problem.
D. will pay more than $ 200 for health insurance.

54. ШЭСЦЬ ШЧАСЛІВЫХ НУМАРОЎ.

Адміністрацыя латарэі паведаміла, што бежанец (=уцякач) з Лаоса, які пражывае ў Вебстэры, выйграў у сераду ў нью-ёркскую латарэю 10 млн. даляраў. Новага мільянера клічуць Самхіт Віласомг, ён майстар па рамонту гадзіннікаў, прыехаў у ЗША па праграме Аб'яднанай метадысткай царквы Вебстара. Шчаслівец на ломанай ангельскай мове расказаў, што ён не кожны тыдзень купляў латарэйныя білеты, аднак у гэты раз, даведаўшыся, што сума галоўнага выйгрышу будзе 10 млн. даляраў, рашыў купіць білет. Яго дзеці, 10-гадовы сын і 5-гадовая дачка, дапамагалі яму выбраць нумары. Ён пакуль не вырашыў, што будзе рабіць з нечаканым багаццем.

A. The new millionaire is a refugee from Webster.
B. He is a man without profession.
C. Having found out about the amount of the main prize, he bought a ticket.
D. His grown-up children helped him to pick the numbers.

55. АДНАВІЛІСЯ ПЕРАВОЗКІ.

Іранская паветраная авіякампанія аднавіла перавозкі пасажыраў у Ландан пасля тыднёвага перарыву. Яна заявіла пратэст супраць выкарыстання брытанскай мытнай службай сабак пры пошуку на борце самалётаў наркотыкаў і выбуховых рэчаў. Па мусульмансіх канонах, сабака — істота нячыстая.

Прадстаўнік мытнай службы Вялікабрытаніі заявіў карэспандэнту Рэйтар, што яны будуць выкарыстоўваць такія метады пры надглядзе самалётаў, якія яны палічаць неабходнымі.

56. САМЫ ВЫСОКІ.

Чаго толькі не робяць, каб трапіць у «Кнігу рэкордаў Гінеса». А вось жыхару Мазамбіка Габрыэлю Моуджане для гэтага нічога не трэба было рабіць. Ён проста рос і стаў самым высокім чалавекам у свеце. Яго рост 2м 45 см.

57. ВАЕННЫЯ РАСХОДЫ.

Ваенныя расходы Францыі складаюць 177.3 млрд. франкаў у год. Як адзначае друк са спасылкай на даныя міністэрства абароны, аснаўную частку гэтых расходаў (=выдаткаў) — 93.3 млрд. франкаў — плануецца выдзеліць на выраб ваеннай тэхнікі, ваенныя даследванні, развіццё інфраструктуры ўзброеных сіл.

58. ЛІЧБЫ І ФАКТЫ.

Самы моцны святлафор у свеце створан у Англіі. Ён стаіць ля ўвахода ў гавань і кіруе суднамі. Кожны каляровы ліхтар святлафора мае дзве лампы моцнасцю па 1,5 кілавата. Святло бачна ўдзень з адлегласці да 9,2 кіламетра, а ноччу — з адлегласці 46,3 кіламетра.

59. ПАРТРЭТ МАРГАРЭТ ТЭТЧЭР.

Віншаванне жыхарам Ліды прыслала былы прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Маргарэт Тэтчэр. Ад імя грамадскіх арганізацый «жалезную леді» запрасілі на свята горада, на якім збіраліся падарыць яе партрэт, напісаны мясцовым мастаком-аматарам Уладзімірам Мельнікавым. Спаслаўшыся на занятасць, Тэтчэр падзякавала за запрашэнне, пажадала лідчанам поспехаў у нацыянальны Адраджэнні, пад'ёме эканомікі і паляпшэння жыццёвага ўзроўню людзей. Партр які не ўручылі, цяпер знаходзіцца ў мясцовай карціннай галерэі.

60. ВЫПРАБАВАЛЬНЫ ЗАПУСК «ТРАЙДЭНТ-2».

Як паведаміла агенства ЮПІ, ракета была запушчана ўвечары ў пятніцу з мыса Канаверэл ва Фларыдзе. Як і ў ходзе папярэдніх іспытаў, далёкасць палёта ракеты і размяшчэнне мішэні былі засякрэчаны. Прадстаўнік Пентагана паведаміў, што ракета не несла баявога зарада. Гэтыя ракеты ўзяты на узбраенне атамных падводных лодак тыпа «Агайо» з 1989 года. ЮПІ адзначае, што «Трайдэнт-2» здольна несці сама меней 10 ядзерных боегаловак індывідуальнага навядзення.

61. ПАШТОВАЕ МЕТРО.

У Лондане, акрамя звычайнага пасажырскага метро, ёсць яшчэ і другое грузавое метро. Яно злучае 2 гарадскіх паштамта ў заходнем і усходнем раёнах сталіцы. Даўжыня лініі 10.5 кіламетра. Траса пралягае на глыбіні да 21 метра. На падземнай дарозе ёсць 5 прамежных прыпынкаў пад буйнейшымі вузламі сувязі Лондана.

За суткі па паштоваму метро перавозяць да 35 тысяч розных упаковак карэспандэнцыі.

A. In London, besides the regular subway there is a subway for freight.
B. The two subway lines are connected.
C. The subway system runs at a depth of 31 meters.2
D. The length of the subway line is 9.5 kilometers.

62. ВЫКРАДАЛЬНІК З СЯКЕРАЙ.

Незвычайная спроба выкрадання самалёта мела месца ў аэрапорце Сан Францыска. Як паведамляе Рэйтар, нехта Дж. Дрэйк прабраўся незадоўга да пачатка пасадкі ў «Боінг-767» канадскай авіякампаніі і, пагражаючы экіпажу сякерай ад супрацьпажарнага камплекта, патрабаваў адвезці яго ў Лондан. Праз тры гадзіны ён здаўся і на допыце паказаў, што спрабуе схавацца ад помсты мафіі.

63. ВЫБУХІ НА ВУЛІЦАХ.

Па паведамленню агенства Рэйтар з Рыма, два выбухі прагрымелі каля амерыканскай і ангельскай амбасадаў у Рыме.

Як адзначаюць відавочцы (=сведкі), выбухавыя зарады былі выпушчаны ў будынкі амбасадаў з дапамогай самаробных ракетных установак. Ахвяр няма.

A. Two explosions occurred in the American embassy.
B. Embassy buildings were the targets.
C. There is no report about casualties.
D. No one witnessed the explosion.

64. КІТАЙ.

У гэтай краіне паліцыя выявіла самую буйную ў свеце нелегальную сетку па вытворчасці парнаграфічных часопісаў. На поўначы краіны ў горадзе Хэбей быў знайдзены склад, дзе знаходзілася больш чым паўмільёна часопісаў з парнаграфічнымі фотакарткамі.

65. ЗГАРЭЛА БІБЛІЯТЭКА.

Як паведамляе агенства Рэйтар, пажар знішчыў бібліятэку універсітэта ў Ісфагане, дзе знаходзілася 85 тысяч унікальных кніг. Пажар у славутай бібліятэцы расцэньваецца як «бедства для культурнага і навуковага жыцця» краіны.

A. The Reuter agency was damaged by the fire in Isfagan.
B. 185,000 rare one-of-a-kind books were destroyed by the fire.
C. This is considered to be a great loss.
D. There were 85 fires in the history of the Isfagan University.

66. ПРАБУШАВАЎ УРАГАН.

Прынамсі 5 чалавек загінула, многія атрымалі сурьёзныя раненні, некалькі згінулі без весткі ў выніку разбуральнага ўрагана, які нечакана абрушыўся на паўднёва-заходняе ўзбярэжжа Гішпаніі.

Ураган паваліў сотні дрэў, перавярнуў дзесяткі аўтамабіляў.

67. ЗАХОПЛЕНА ТУРМА.

Зняволеныя ў шатландскім горадзе Перце захапілі будынак турмы і ўзялі некалькі заложнікаў. Як адзначае агенства Рейтар, гэта здарылася літаральна праз некалькі гадзін пасля таго, як паліцыя здолела падавіць бунт зняволеных у другім шатландскім горадзе Абердзіне. У гэтым годзе ў турмах Шатландыі было ўжо шэсць падобных інцыдэнтаў.

68. ЗНОЙДЗЕН СКЛАД ІРЛАНДСКІХ ТЭРАРЫСТАЎ.

Белфаст, 4 лютага. Паліцыя Паўночнай Ірландыі аб'явіла, яны знайшлі буйны ваенны склад, які належыць тэрарыстычнай Ірландскай рэвалюцыйнай арміі. Сярод захопленай зброі ёсць нават процітанкавыя ружжы рускай вытворчасці.

69. МІНСКІ АЭРАПОРТ — ДЛЯ БІЗНЕСМЕНАЎ.

У аэрапорце «Мінск-2» закончана будаўніцтва гасцініцы на 200 месцаў, разлічанай у асноўным на абслугоўванне айчынных і замежных прадпрымальнікаў. Да іх паслуг, у прыватнасці, будуць бізнес-клуб, кафэ, казіно. Пры гэтым улічваецца, што тэрыторыя аэрапорта прэтэндуе на свабодную эканамічную зону: ужо зараз там часта прызямляюцца ўласныя (лёгкаматорныя) самалёты бізнесменаў далёкага замежжа, якія не жадаюць марнаваць час на палёты па раскладу пасажырскіх самалётаў.

70. САВІНАЯ КЛІНІКА.

Жыхар Англіі Стыў Уінтан — вялікі аматар птушак. Але больш за ўсё дарагія яго сэрцу совы. Гэтыя начныя птушкі становяцца рэдкасцю на Брытанскіх востравах. Раненых соў, маленькіх савят, у якіх загінулі бацькі, прывозяць да містэра Уінтану з усёй Англіі. У сябе дома ён арганізаваў спецыяльную бальніцу, дзе лечыць трапіўшых у бяду соў. Ён вылечыў ужо больш сотні птушак. Большасць з іх ён зноў выпускае на свабоду. Тых жа соў, якія больш не могуць лятаць, Стыў пакідае ў сябе.

*A. Steve Wheaton finds sick birds and treats them in a special clinic.*
*B. Owls in Great Britain are considered endangered.*
*C. Steve Wheaton keeps over a hundred birds in his house.*
*D. Steve Wheaton releases some of the birds he heals.*

71. МАРАКІ ВЫРАТАВАНЫ.

29 лютага судавы аператар пасажырскага цеплахода «Дзмітры Шастаковіч» Э. Мацяш прыняў паведамленне, што ў Паўночным моры пры ветры ў 9 балаў і хваляванні мора 8 балаў пацярпеў крушэнне і затануў дацкі рыбалоўны траўлер. Маракі перабраліся на паўзатоплены плыток. Некалькі гадзін яны знаходзіліся ў лядзяной вадзе ў палоне стыхіі.

«Дмітры Шастаковіч», які належыць чорнаморскаму параходству, пад камандаваннем капітана Уладзіміра Шабанага неадкладна змяніў курс і накіраваўся да месца катастрофы.

72. КАНТРАБАНДА ЗАТРЫМАНА.

На дзесяткі мільёнаў рублёў затрымалі каштоўных грузаў пры спробе іх незаконнага вывазу за межы краіны супрацоўнікі Смаргонскага пагранатрада. Сярод кантрабанды пераважаюць каляровыя металы. Затрымана таксама 19 тон гаруча-змазачных матэрыялаў.

73. ВЫНІКІ АБСЛЕДАВАННЯ.

Згодна з вынікамі абследавання, праведзенага вучонымі Стэнфардскага універсітэта, адна гадзіна заняткаў фізкультурай павялічвае працягласць жыцця на 2-3 гадзіны.

1. What was being researched by the students at Stanford?
2. What were the results of the research?

74. ЗЛАЧЫНСТВАЎ СТАЛА БОЛЬШ.

Ангельскі Скотланд-Ярд надрукаваў статыстычныя даныя, якія сведчаць аб рэзкім павелічэнні колькасці ўзброеных нападаў і абрабаванняў у Лондане. У 1987 годзе такіх злачынстваў было 11594. У 1993 годзе гэтая лічба ўжо склала 13101 (рост на 13%).

75. АВІЯКАТАСТРОФА Ў ВІРДЖЫНІІ.

Віржынія Біч, Вірджынія, 22 траўня (ЮПІ). Марскі бамбардзіроўшчык А-6Е упаў на гарадскі бульвар і ўрэзаўся ў аўтамабіль. Два пілоты самалёта і шафёр аўтамабіля загінулі. Прычына катастрофы пакуль невядома. Лётчыкі загінулі ў той момант, калі спрабавалі катапультавацца. Бамбардзіроўшчык, уваходзіўшы ў склад 65-й эскадрыллі ўдарных сіл ВПС, накіроўваўся на паветраную базу ў Пуэрта-Рыка.

A. The accident occurred because of bad weather conditions.
B. As a result of the accident one person died.
C. Both pilots ejected successfully.
D. The cause of the accident is unknown.

76. У ГОНАР ЗЕМЛЯКА.

Маладзечанскі гарвыканком вырашыў увекавечыць памяць свайго земляка, вядомага гісторыка і краязнаўцы, былога кіраўніка Беларускага краязнаўчага таварыства Генадзя Каханоўскага, які заўчасна памёр у пачатку года. На доме, дзе жыў вучоны, будзе змешчана мемарыяльная дошка, а адна з новых вуліц горада стане насіць яго імя.

77. ТАЯМНІЧЫ ІНЦЫДЭНТ У ЭСТОНІІ.

Вашынгтон, 27 красавіка. — Газета «Вашынгтон таймз», са спасылкай на скандынаўскія крыніцы, паведаміла аб раптоўнай эвакуацыі ўсяго персанала з ракетнай базы бліз горада Кейла ў паўночнай Эстоніі. Усё абсталяванне, жылыя памешканні і нават ракеты спешна пакінуты. Праз некалькі дзён, у бліжэйшым раёне загінулі жывёлы. У мясцовага ляснічага зарэгістравана таямнічае захворванне крыві, якое патрабавала дзвух пераліванняў і прывяла да поўнага выпадання валасоў.

Ляснічаму і яго сям'і не рэкамендавалі карыстацца вадой з ракі. Шведскія станцыі сачэння не адзначылі павышэння ўзроўня радыёактыўнасці. Група шведскіх спецыялістаў вырашыла, што ўзнікла ўцечка хімічных рэчываў, маючых ваеннаё значэнне.

A. A planned evacuation of the misile base in Northern Estonia is taking place.
B. Sweden registered a rise in radioactivity.
C. The forester was advised to use only river water.
D. Treatment onvolved two blood transfusions.

78. РАБАЎНІКІ ЛЯ ТЭЛЕВІЗАРА.

У нідзерландскам горадзе Лаўвардэн быў абрабаваны банк. Паліцейскія па картатэцы хутка адшукалі прозвішчы магчымых рабаўнікоў. На допыце высвятлілася, што ва ўсіх трох было алібі. Яны сцвяржалі, што ўсю ноч сядзелі дома і глядзелі па тэлевізару святочную праграму. Следчыя былі ўпеўнены, што менавіта яны абрабавалі банк. Аднак падазроныя ўпеўнена расказвалі змест тэлеперадачы і адмаўляліся ад свайго ўдзела, пакуль паліцэйскія не знайшлі ў кватэры аднаго з іх партатыўны тэлевізар. Стала ясна, што грабежнікі рабавалі банк, не адрываючы позірка ад экрана.

79. ІДУЦЬ ТРАПІЧНЫЯ ДАЖДЖЫ.

Трапічныя ліўні абрушыліся на насельніцтва вострава Тайвань, перадае агенства Рэйтар. Пасля трох дзён няспынных дажджоў загінуў 21 чалавек і звыш 100 згінулі без весткі. Паліцыя і армейскія выратавальныя атрады вядуць пошукі ахвяр. Па даным метэрыалагічнай службы, узровень ападкаў склаў 350 міліметраў. Такіх дажджоў у гэтым раёне не было з пачатка стагоддзя.

80. ПАДАРУНАК ТУРЫСТАМ.

Падводная лодка для падарожжаў, якую заказала адна з турыстскіх фірмаў Фінляндыі, пабудавана фінскімі карабеламі на суднаверфі «Лайватэоліусус» у Турку. Яе першыя іспыты пройдуць у пачатку сакавіка пасля завяршэння прафесійнай падрыхтоўцы экіпажа, які будзе складацца з двух чалавек. Як мяркуюць у акцыянерным таварыстве «Падарожжа на падводнай лодцы», такі від водпуска будзе карыстацца папулярнасцю сярод турыстаў.

81. ХІТРЫКІ КАНТРАБАНДЫСТАЎ.

У гішпанскім порце Малага мытнікі вырашылі праверыць падгузкі груднога дзіцяці, якое спакойна спала на руках сваёй 23-гадовай маці. І не дарма. Яны знайшлі ў выніку гашыш на суму ў 8000 даляраў.

82. ПЕРАМОВЫ.

У дзень прыезда міністр знешняга гандля Беларусі нанёс візіт прем'ер-міністру Малайзіі. У час размовы адбыўся адмен думкамі. У першай палове дня ў будынку парламента пачаліся беларуска—малазійскія гандлёвыя перамовы. У ходзе перамоў абмярковываліся і іншыя пытанні. Міністр знешняга гандля Беларусі запрасіў міністра знешняга гандля Малайзіі наведаць Беларусь у бліжэйшы час.

83. НАЧНЫ ПАЖАР.

8 чалавек загінулі і адзіннацаць атрымалі раненні ў выніку пажара, які знішчыў частку псіхіятрычнай бальніцы ў прыгарадзе Парыжа, паведамляе Рэйтар. Пажар пачаўся глыбокай ноччу. Большасць загінуўшых задыхнуліся ва сне, пакольку знаходзіліся пад уздзеяннем заспакаяльных лекаў.

84. ПАПУГАЙ-СІМУЛЯНТ.

Адна дама з амерыканскага горада Хюстана, прынесла да ветэрынарнага ўрача свайго папугая, сцвяржаючы, што ён сур'ёзна захварэў. Птушка сапраўды бесперапынна кашляла. Аднак дыягназ быў не зусім звычайны. «Папугай па-майстэрску імітуруе кашаль заядлай курыльшчыцы, які дзейнічае яму на нервы, — заявіў урач азадачанай жанчыне. Калі вы перастаніце курыць, птушка хутка адвучыцца ад звычкі перадражніваць вас.»

85. ШПАРГАЛКІ ПА РАДЫЁ.

Бангкок. У старэйшым таіландскім універсітэце — Чулалангкорнскам, як заўсёды вясной, пачаліся прыёмныя конкурсныя экзамены. У гэтым годзе універсітэт сутыкнуўся з незвычайнай хітрасцю абітурыентаў. Радысты перахапілі перадаваўшуюся па радыё азбукай Морзе шпаргалку, якую запрасіў па мініперадатчыку хтосці з рыхтаваўшыхся да адказа. Запеленгаваць «радыста» не ўдалося. Спецыяльна вызванны з цэнтральнага радыётэлеграфа аўтобус неадкладна пачаў глушыць «кансультацыі».

86. ВЫБАРЫ Ў КАНГРЭС.

На адбыўшыхся 2 лістапада выбарах насельніцтва ЗША галасавала за новых прадстаўнікоў у Кангрэс. Пераізбіралася адна трэць сената, уся Палата Прадстаўнікоў і 36 губернатараў штатаў (з 50). Як заўсёды, на выбарах было шмат тых, хто ўстрымаўся.

87. ПРЫНЦ ЭДВАРД ВЫХОДЗІЦЬ НА ПРАЦУ.

Упершыню ў гісторыі бліжэйшы сваяк каралевы Англіі —у гэтым выпадку малодшы сын Елізаветы II 23-гадовы прынц Эдвард — пачаў служэбную кар'еру па-за ўброеных сіл краіны. Пакінуўшы ў мінулым годзе каралеўскія дэсантныя войскі, прынц Эдвард начаў працаваць памочнікам рэжісёра ў адным з буйнейшых лонданскіх тэатраў.

Паведамляецца, што на рабоце да прынца адносяцца як да звычайнага служачага, а не як да члена каралеўскай сям'і, але пры гэтым ён прыязджае на работу ў лімузіне і з ім пастаянна знаходзіцца асабісты целаахоўнік. Велічыня зарплаты прынца пакуль застаецца для друку невядомай, але ў якасці наследніка Віндзарскага дома ён атрымлівае 30000 даляраў у год.

88. ЧАРГОВАЯ КАТАСТРОФА.

Трэці раз за апошнія 6 тыдняў ТАСС паведаміў аб авіякатастрофе. На гэты раз разбіўся самалёт ТУ-134, на борце якога было 45 пасажыраў і 6 членаў экіпажа.

Прычына аварыі яшчэ не высвятлена. Самалёт здзейсняў пералёт з Мінска ў Сургут і па невядомай прычыне прызямліўся ў аэрапорце назначэння, не дацягнуўшы да пасадачнай паласы, у выніку чаго самалёт выбрасіла на пасадачную паласу ў круцячымся стане, потым ён разваліўся на часткі і загарэўся.

Аб колькасці ахвяр не паведамлена, аднак адзначаецца, што да месца катастрофы было вызвана 15 аўтамабіляў«хуткай дапамогі», і з Тюмені ў Сургут тэрмінова даставілі 8 спецыялістаў па лячэнню апёкаў.

89. ВЫБУХ ПРАДУХІЛЁН.

Па паведамленню з Гібралтара, тут у 500 метрах ад рэзідэнцыі ангельскага генерал-губернатара быў знойдзен аўтамабіль, у якім знаходзіўся зарад узрыўчаткі.

Выбух здолелі прадухіліць. Агенства Рэйтар перадала, што паліцэйскія застралілі трох тэрарыстаў, дзвух мужчын і жанчыну, якія, як мяркуюць, і намерваліся здзейсніць гэтую акцыю.

90. ПАПУГАЙ-ПАТРЫЯРХ.

Як вядома, большасць свойскіх жывёл жывуць меньш за сваіх гаспадароў. Выключэнне, бадай, складаюць толькі папугаі. Некатарыя іх віды жывуць да 60 гадоў. Але сапраўдным рэкардсменам стаў папугай Джыммі з Ліверпуля: яму 105 гадоў. Як кажа яго гаспадарыня, яе дзядуля злавіў Джыммі ў Амазоніі яшчэ ў васьмідзесятыя гады мінулага стагоддзя.

91. ПРЫЗНАНЫ ВІНАВАТЫМ.

Як паведамляе ЮПІ, былы губернатар Гуама Р. Бордалла прызнаны вінаватым у 10 з 17 прад'яўляных яму абвінавачванняў у карупцыі. Суд павінен адбыцца ў красавіку. Хабарніка чакае прыгавор, які пагражае 50 гадамі турэмнага зняволення.

92. АЎКЦЫЁН НЕРУХОМАСЦІ.

Усе чаканні арганізатараў пераўзышлі вынікі першага ў вобласці аўкцыёна нерухомасці, які адбыўся ў Баранавічах. З выстаўленых больш чым 20 стратных або недабудаваных аб'ектаў камунальнай уласнасці толькі на тры не знайшлося пакупнікоў. Было выручана каля 270 мільёнаў рублёў, што значна больш, чым планавалася атрымаць у горадзе ад прыватызацыі камунальнай уласнасці ў цэлым за год.

A. Auctioneers expected a much better results from the auction.
B. Auctioners sold only 20 items.
C. Only three buyers took part in the auction.
D. Public property was on sale at the auction.

93. НОВАЕ ПАКАЛЕННЕ ВЫБІРАЕ ВНУ.

Колькасць пададзеных заяў ад жадаючых вучыцца ў трох магілёўскіх ВНУ красамоўна сведчыць аб цязе маладога пакалення да адукацыі. Так, у машынабудаўнічым інстытуце сярэдні конкурс склаў 1,6 чалавекана месца. У тэхналагічным інстытуце сярэдні конкурс крыху вышэй — 1,8. Але самы вялікі сярэдні конкурсназіраўся ў педынстытуце — 2,7 абітурыента на месца.

94. РЭСПУБЛІКА САХА (Якуція) стала членам Арганізацыі непрадстаўленых нацый і народаў. Маладая арганізацыя, заснаваная ў 1991 годзе ў галандскім горадзе Гаага, галоўнай сваёй мэтай ставіць абарону інтарэсаў народаў, якія па розных прычынах не прадстаўлены ў ААН і іншых міжнародных арганізацыях. Удзел у АННН дапаможа Рэспубліцы Саха пашырыць свае міжнародныя сувязі.

95. СЕКС — СУПРАЦЬ ЛЫСІНЫ...

Англійскі ўрач Вярнон Колеман рэкамендуе секс у якасці лякарства супраць аблысення. У выніку шматгадовых назіранняў ён прыйшоў да высновы, што заняткі каханнем змякчальна ўздзельнічаюць таксама на астму, замаруджваюць павелічэнне прастаты, паніжаюць крывяны ціск, умацоўваюць лёгкія і да таго ж робяць больш стройнай фігуру, гарантуюць прыгожую скуру. Так што, высновы кожны можа рабіць сам...

96. ПАШТОВЫЯ ТАРЫФЫ Ў БЕЛЬГІІ.

Кошт паштовых адпраўленняў павысіўся ў Бельгіі на адзін франк і складае цяпер 15 франкаў за звычайнае пісьмо вагай да 20 грамаў. Прыбаўка мізэрная, на якую наўрад ці хто зверне ўвагу, і супраць якой ніхто не будзе пярэчыць. А між тым, яна ўжо сёмая па ліку за апошнія 15 гадоў. Усе гэтыя гады бельгійцы акуратна наклейвалі паштовыя маркі на канверты і не заўважалі, як размер тарыфаў вырас амаль удвая.

97. ПАГАДНЕННЕ АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ.

Падпісана якасна новае пагадненне аб супрацоўніцтве Гродна і Беластока. Яно прадугледжвае ўзмацненне эканамічных стасункаў памежных гарадоў. Гродзенскія ўлады, гаспадарнікі і прадпрымальнікі атрымаюць шырокія магчымасці вывучэння хібаў і станоўчага вопыту прыватызацыі ў Польшчы. Дасягнута дамоўленасць, што на працягу красавіка ў Гродне будзе працаваць польскі прадстаўнік, які дапаможа ўсталяваць кантакты з беларускімі прадпрыемствамі і арганізацыямі.

98. АМЕРЫКАНСКІЯ ЦЯЖКАСЦІ У МАНГОЛІІ.

У сувязі з адкрыццём амбасады ЗША ў Манголіі Дзяржддэпартамент сутыкнуўся з нечаканай праблемай: Выявілася, што сярод 4585 супрацоўнікаў толькі трое ведаюць мангольскую мову, аднак яны ўжо працуюць у іншых краінах. Пасля доўгіх абмяркаванняў вырашылі накіраваць у Манголію некалькі супрацоўнікаў, размаўляючых па-руску, паколькі ў гэтай краіне адчуваецца моцны рускі ўплыў.

Манголія са свайго боку адпраўляе ў ЗША 12 дыпламатаў, некаторыя з іх ўжо прыбылі ў Вашынгтон.

A. The US embassy in Mongolia has been recently opened.
B. The State Department has only three employees who speak Mongolian.
C. These three emoloyees have already been working in Mongolia.
D. 12 Mongolian diplomats have already arrived in the US.

99. СЛОН-РАБАЎНІК.

Нядаўна ў індыйскім горадзе Натпур было ўчынена унікальнае злачынства. Па бязлюднай шашы рухаўся аўтамабіль. Раптам шлях яму заступіў слон. Вадзіцель спыніў машыну. Слон спакойна прасунуў хобат у адчыненае акно і выцягнуў перапужанага на смерць шафёра з кабіны. З кустоў з'явіўся мужчына — гаспадар слана. Ён падыйшоў да вісячага ў паветры ўладальніка машыны ачысціў яго кішэні (узяўшы 5000 рупіяў альбо $500). Калі абрабаванне было скончана, слон засунуў вадзіцеля назад у машыну, пасадзіў гаспадара сябе на спіну і павольна аддаліўся.

A. The elephant didn't do any harm to the driver.
B. Elephants are known to walk the highways in Florida.
C. The driver had $5,000 on him.
D. The elephant's owner was not involved in the robbery.

100. НЕ СПЯШАЙЦЕСЯ! ПАСПЕЕЦЕ!

«Хутчэй, калі ласка. Спазняюся на поезд». Як часта таксістам даводзілася пачуць гэта. Вадзіцелі таксі ў італьянскім горадзе Балонья цяпер могуць супакоіць пасажыра, націснуўшы некалькі кнопак, устаноўленных на табло. Дзякуючы новаму прыбору, можна даведацца , на колькі хвілін, напрыклад, спазняецца поезд, на які спяшаюцца трапіць пасажыры таксі. З дапамогай новай электронна-вылічальнай машыны, устаноўленнай у таксі, можна атрымаць самую дакладную інфармацыю не толькі аб руху паяздоў, самалётаў і аўтобусаў, але і аб праграме кінатэатраў, рабоце рэстаранаў, бібліятэк і г.д.

101. ФУТБОЛ. Пасля пяці тураў у футбольным чэмпіянаце Беларусі з'явіўся аднаасобны лідэр. Толькі адна каманда не зведала яшчэ горыч паражэнняў і страціла толькі ачко — «Дынама-93» з Мінска. У панядзелак яна перамагла магілёўскае «Тарпеда» — 1:0.

Астатнія матчы тура адбыліся на наступны дзень. Мінскае «Дынама» з цяжкасцю перамагло «Гомсельмаш» (3:2), хаця цалкам дамініравала на полі. На другую прыступку ў турнірнай табліцы ўзабраўся магілёўскі «Днепр» пасля дамашняй перамогі над «Фандокам». Дыхае ў спіну яму ФК «Маладзечна», які нават у гасцях адолеў бабруйскі «Шыннік» —2:1.

102. ПАЛАЧКАМІ АЛЬБО ВІДЭЛЬЦАМ?

Агульнавядома, як у Японіі даражаць звычаямі і традыцыямі. Аднак заморскія звычкі і норавы няўмольна ўрываюцца ў мясцовы быт. Вось толькі адзін прыклад: згодна надрукаванаму нядаўна дакладу міністэрства адукацыі Японіі, только 48,4% вучняў пачатковых класаў здольны «справіцца» за сталом традыцыйнымі драўлянымі палачкамі. астатнія без відэльца адчуваюць сябе « не ў сваёй талэрцы».

103. 78 СПРОБАЎ. Незвычайны рэкорд паставіў 54-гадовы жыхар Славеніі. Ён здаваў экзамен на вадзіцелькія правы 78 разоў. Сапраўды, усе спробі заканчваліся правалам. Цяпер гэты жадаючы сесці за руль рыхтуецца да 79 -га экзамена. «У апошні раз, — гаворыць ён, — інструктары сказалі, што я быў блізка да мэты. Я буду здаваць і сто разоў..., пакуль не здам.»

104. ЭХА ВАЙНЫ.

Увечары патэлефанавалі жыхары Зялёнай вуліцы ў раёне Трактарнага завода. Яны знайшлі бліз аднаго з дамоў снарад. Прыбыўшыя на месца сапёры выявілі, што гэта артылерыйскі снарад. Хацяя ён быў іржавы, праляжаў шмат гадоў, але меў запал (=дэтанатар) і выбуховае рэчыва.

Бяспека была папярэджана. Снарад увезлі і знішчылі.

105. УДЗЯЧНАСЦЬ КІТА.

Белы кіт Валлі, насельнік заапарка ў горадзе Дуйсбурге (Германія), захапл наведвальнікаў і здзіўляе вучоных. Наведвальнікі абажаюць Валлі за вясёлы нор а вучоныя дзівяцца на яго розум. Нядаўна кіт прыдумаў новы трук: пасля тага, служыцель накарміў Валлі смачнай свежай рыбай, кіт выпрыгнуў з вады і «пяшчо абняў» кармільца. Цяпер ён штодзень выконвае гэты нумар.

106. У БЕЛЫ ДОМ З ПІСТАЛЕТАМ.

Вашынгтон, 5 сакавіка. Служба Бяспекі Белага дома арыштавала ў аўторак мужчыну, калі ён спрабаваў перадаць ліст прэзідэнту. Падставай да арышту паслужыла тое, што ў машыне гэтага мужчыны быў знойдзены пісталет, на ўладанне якім ён не меў права.

Арыштаваным аказаўся 34-гадовы Чэндлер Клэрі з гарадка Калумбія (Паўднёвая Караліна). Ён быў абвінавачваны ў незаконным уладанні зброяй і пасаджаны ў акружную турму да слухання справы ў судзе.

107. КАЛІНКАВІЧАМ — 200 ГОД.

Летапіс гісторыі палескага краю днямі папоўніўся знамянальнай падзеяй — гораду Калінкавічы, буйнаму прамысловаму цэнтру і чыгуначнаму вузлу, споўнілася 200 год.

Прадстаўнікі з многіх гарадоў прыехалі павіншаваць калінкавічан. Свята ўдалося на славу. Гэтаму спрыяла як цудоўная арганізацыя, прадуманнасць, святочны па-сапраўднаму настрой жыхароў горада і раёна, так і само надвор'е. Пасля адкрыцця на цэнтральнай плошчы, святкаванне працягвалася на кірмашы, дзе быў наладжаны продаж прамысловых і харчовых тавараў мясцовых прадпрыемстваў. Крыху воддаль, на прыгожым беразе штучнага возера праходзілі фестываль песні «Калінка», з удзелам фальклорных калектываў, эстрадныя выступленні вядучых выканаўцаў Беларусі, парад парашутыстаў, і нарэшце феерверк.

108. $1,000,000 АРЫГІНАЛ «ТЭОРЫІ АДНОСНАСЦІ».

Самая старая з усіх вядомых прац Альберта Эйнштейна, якая тычыцца тэорыі адноснасці была продана ў мінулую сярэду на нью-ёркскім аўкцыёне Сотбі за рэкордную суму — $1,000,000.

Манускрыпт, датаваны арганізатарамі аўкцыёна 1912 годам, прыблізна быў напісаны вялікім фізікам у Празе ці ў Цурыху.

Напісаны па-немецку рукапіс набыў, як піша «Нью-Ёрк пост», «невядомы пакупнік, дзейнічаўшы праз агента». Апрача аснаўной сумы яму прыйшлося заплаціць 10% камісійнага збору.

109. ПЕРАМАГЛА КАНАРЭЙКА.

У Германіі адбыўся незвычайны конкурс. Члены таварыства аховы жывёл з горада Мюнхена вырашылі даведацца, якіх прадстаўнікоў жывёльнага свету жыхары краіны лічуць сваімі самымі любімымі.

Найбольшай папулярнасцю ў грамадзян Германіі карыстаецца канарэйка. Многія трымаюць вясёлых шчабятушкаў у сябе дома. Другое месца сярод любімых жывёл заняў сабака. Трэцяе месца — матылёк. На дзевятым месцы — слон. Кошка толькі на дзесятым, а на дванаццатым ... гарыла.

110. НЕ ТОЛЬКІ АБ ГАНДЛІ.

Міністр замежных спраў Швецыі С. Андерсан прыбыў з візітам у Нігерыю, паведамляе Рэйтар з Лагоса.

Прамовы закрануць перш за ўсё пытанні гандлю паміж гэтымі дзвюма краінамі, аднак значная ўвага будзе удзеляна таксама абмяркаванню праблем палітычнага урэгуліравання ў Заходняй Афрыцы. Шведскі міністр ўжо наведаў некалькі краін Заходняй Афрыцы.

111. НЕ ГАВАРЫЦЕ ХУТКА.

Група вучоных з Германіі выявіла, што большасць дарослых людзей не могуць на слых запомніць сказы, налічваючыя больш за 13 слоў. Калі ланцужок вымаўленых слоў цягнецца больш чым 6 секунд, слухачы губляюць увагу. Адна трэць дарослых забывае пачатак сказа, ужо тады, калі вымаўляецца 11-е па ліку слова. Доўгія сказы — больш за 18 слоў — здольны зразумець і засвоіць не больш за 15% аўдыторыі.

На погляд гэтых вучоных, трэба гаварыць з хуткасцю не больш за 2 словы ў секунду і строіць па магчымасці фразы карацей.. Гэта асабліва важна для настаўнікаў.

112. ПРАЛІЎНЫЯ ДАЖДЖЫ У РЫМЕ.

Рым, 26 лістапада. У выніку праліўных дажджоў узняўся да пагражаючай мяжы ўзровень ракі Цібр.

Па даных метэаслужбы, толькі ў чацвер выпала 5 санціметраў (2 дзюймы) ападкаў, а за 4 апошніх дні — 11 санціметраў (4,3 дзюйма). На дзве гадзіны быў закрыты межнародны аэрапорт імя Леанарда да Вінчы.

Шматлікія вуліцы італьянскай сталіцы аказаліся пад вадой. Тысяча вадзіцеляў пакінулі свае аўтамабілі. Перакрыта некалькі аўтастрадаў, якія вядуць з поўначы ў Рым. У адной з пачатковых школ сто вучняў аказаліся адрэзанымі ад знешняга свету.

Сіноптыкі мяркуюць, што рака Арно ва Фларэнцыі таксама можа выйсці з берагоў.

113. БОМБА Ў АЎТАМАБІЛІ.

Адзін з кіраўнікоў пратестанскіх экстрымістаў, лідэр так званай «Асацыяцыяй Аховы Ольстэра» Эндзі Тайры ледзь пазбег гібелі — ў яго аўтамабіль быў заложаны зарад ўзрыўчаткі.

Тайры знайшоў бомбу і сам здолеў яе абясшкодзіць. У снежні мінулага года яго памочнік не праявіў належнай асцярожнасці і ўзарваўся разам са сваім аўтамабілем.

114. УНІКАЛЬНЫ ЧАЛАВЕК.

Аўстрыйскі ўрач Бернар Аўфмесер з Радштадта і хірург-кардыёлаг Фелікс Унгер вярнулі да жыцця змёрзлага чалавека. Ім аказаўся 23-гадовы Хельмут Райхерт, які заблудзіў, упаў у снег і ў сонным стане змёрз. Яго адшукалі праз 1 гадзін. Урачы мяркуюць, што падаючы ў снег, Райхерт хутка скалеў, і хуткае ахаладжэнне галаўнога мозга пры няхватцы кіслорода ў паветры не прывяло да неабарачальных вынікаў. У цяперашні час Райхерт адчувае сябе нармальна, і ўрачы не знайшлі ніякіх прыметных ускладненняў .

115. КОРАТКА.

Ірландыя ахоплена масавай забастоўкай электрыкаў. Больш за 11 тысяч інжынераў, мантажораў і працоўнікоў іншых спецыяльнасцей спынілі сёння працу. Яны патрабуюць павышэння заработнай платы ў адпаведнасці з ростам дарагоўлі і падаткаў.

A. In Ireland engineers are paid less than electricians.
B. About 11,000 electricians and engineers are on strike.
C. They demand a tax cut.
D. The salary is lagging behind the increase of the cost of living.

116. СТАРАЖЫТНАЯ СКАРГА.

Адно з самых старадаўніх пісьмаў у свеце было напісана ў 400 годзе да н.э. У ім егіпецкі салдат скардзіцца, што яму выдалі дрэнную амуніцыю. Напэўна, салдат быў непісьменным, але, відавочна, і тады ўжо існавалі пісары, якія за пэўную суму маглі скласці дзелавую паперу, інакш кажучы, дзелавы папірус.

117. НАПАДЗЕННЕ НА ПАШТОВЫ ФУРГОН.

У Рыме зроблена нападзенне на паштовы фургон з мільярдам лір ($ 900.000). Шэсць узброеных злачынцаў, сярод якіх была жанчына, заблакіравалі фургон і паліцэйскую машыну суправаджэння, ва ўпор растралялі ахову. Забіты два паліцэйскія, адзін цяжка паранены. Завалодаўшы грашыма, злачынцы зніклі. Адказнасць за грабёж узяла на сябе экстрэмістская групоўка.

118. ЗАТАНУЎ ПАРОМ.

Дакладна 5 гадоў таму недалёка ад бельгійскага порта Зебругче здарылася трагедыя, якую востра перажывалі і дасюль перажываюць у краіне.

Перакуліўся і затануў англійскі пасажырскі паром «Геральд оф фрі энтэрпрайз», які накіроўваўся ў Дувр. Загінула 139 чалавек. Сведкі расказваюць: Усё здарылася так хутка, што многія ахвяры аказаліся ў пастцы. Целы трох, у тым ліку 8-месячнай дзяўчыні, так і на знойдзены. Сёння адбыліся царкоўныя службы ў памяць аб ахвярах.

119. ПЛАВАЮЦЬ ... СЛАНЫ.

Рэкорд працяглага плавання ўстанавілі тры афрыканскія сланы ў Зімбабве. Яны спрабавалі уцячы з нацыянальнага запаведніка, але іх вярнулі назад. Аднак наступнай раніцай жывёлін зноў убачылі на возеры. У час гэтага марафона сланы-плаўцы дапамагалі адзін аднаму. Сланы паспяхова дасягнулі процілеглага берага, праплыўшы 35 кіламетраў за трыццаць гадзін.

120. ДЭМАНСТРАЦЫЯ ПРАТЭСТА.

Па вуліцах калумбійска сталіцы прайшла мнагатысячная дэманстрацыя пратэста, перадае агенства Рэйтар з Багаты.

Твары многіх дэманстрантаў былі размаляваны ў белы колер — знак смерці. Людзі выразілі свой пратэст супраць няспыннай хвалі тэрора з боку ультраправых узброеных груповак.

121. ПАДСТАЎНЫ ЧЭМПІЁН.

За ўчыненне буйнага крадзежу суд прыгаварыў амерыканскага баксёра-прафесіянала Роберта Медзіну да трох год турэмнага зняволення. Аднак спартсмен здолеў даволі доўга заставацца на свабодзе. -Мала таго, ён нават выступіў у гэты час у 15 афіцыйных матчах, але ... пад імям Джона Гарсія. У 16-й сустрэчы Медзіне не пашанцавала — яго пазнаў паліцэйскі.

122. ПАВЕДАМЛЕННЕ НАСА.

Па паведамленню Нацыянальнага ўпраўлення па аэранаўтыцы і даследванню касмічнай прасторы (НАСА), у наступным годзе будзе выдзелена 1,2 мільёна даляраў на распрацоўку плана аб стварэнні на Луне населенай станцыі.

У заяве НАСА адзначаецца, што «стратэгічны напрамак работы агенства прадугледжвае магчымасць стварэння буйнага навуковага аб'екта на Луне да 2005 года».

123. ПРЫЖОК З ПЫЛАЮЧАГА ДОМА.

Магчыма, сцюардэса Вікі Маклернон дапускала, што ёй калі-небудзь прыдзецца прыгнуць з парашутам, але думка аб прыжке з акна уласнай кватэры ёй напэўна ў галаву ніколі не прыходзіла.

Паліцэйскія Рональд Шындел і Джон Лэнгтан як заўсёды абыходзілі свой участак, калі заўважылі, што гарыць дзвухпавярховы дом на Гардінг Экспрэсвее, у Квінсе. Паліцейскія ўбеглі ў хату і пачулі крыкі жанчыны, данасіўшыяся з другога паверха. Полымя заступала дарогу уверх. Шындел выбег на вуліцу, падагнаў аўтамабіль да вокнаў Вікі Макленон і ўзлез на дах машыны. Усё яшчэ напужаная, але шчаслівая, Вікі трапіла прама ў абдымкі паліцэйскага.

124. ГРУЗАВІК—ГІГАНТ.

Гэты велізарны грузавік зроблены ва Францыі. Яго даўжыня 62 метраў, і ён мае грузапад'ёмнасць 550 тон, аднак рухаецца з хуткасцю ўсяго 5 кіламетраў у гадзіну. Грузавік прызначаны для перавозкі буйных трансфарматараў, генератараў і іншых падобных аб'ёмістых агрэгатаў.

125. МАНЕЎРЫ.

Сумесныя манеўры ваенна-марскіх сіл Турцыі і Пакістана пад кодавай назвай «Сяброўства-94» пачаліся ў Эгейскім моры. Як гаворыцца ў заяве сакратарыята генеральнага штаба Турэцкіх узброеных сіл, надрукаванай у газеце «Байрам газеці», у манеўрах прымуць удзел мінаносцы і падводныя лодкі флатоў абедзвух краін, і таксама дапаможныя караблі і марская авіяцыя Турцыі. У ходзе манеўраў, якія працягнуцца да 23 жніўня, караблі дзвух флатоў зробяць захады ў турэцкія парты Стамбул і Ізмір.

126. МАЛПЫ НА ЭКСПАРТ.

У спісе тавараў кенійскага экспарта з'явіўся новы артыкул: малпы. Жвавыя і вельмі кемлівыя, яны пранікаюць не толькі ў сялібы, але нават наведваюць цэнтральныя кварталы кенійскай сталіцы — Найробі. Малпы далёка не бяскрыўдныя. У пошуках харчавання яны апустошваюць палі і агароды, наносяць сур'ёзную шкоду сельскай гаспадарцы. Кенійскі парламент не аднойчы разглёджваў скаргі жыхароў на малп і рашаў пытанне аб тым, што з імі рабіць. Паколькі адстрэл і паляванне поўнасцю забаронены, хтосьці з парламентарыяў прапанаваў прадаваць малп за мяжу.

A. Monkeys are nimble and quick-witted animals.
B. Monkeys are never found in the central area of Nairobi.
C. Monkeys are absolutely harmless.
D. Game shooting of monkeys is allowed only in certain regions of Kenya.

127. ДЫВЕРСІЙНАЯ АКЦЫЯ.

Дэлі, 28 траўня (ТАСС.) Дыверсійная акцыя ўчынена ўчора супраць генеральнага консульства Індыі ў Карачы (Пакістан). Па паступіўшых паведамленнях, двое невядомых, праязджаючы на матацыкле, бросілі бомбу на тэрыторыю прадстаўніцтва. Выбух прычыніў шкоду будынку. Ніхто не пацярпеў.

128. БЕСТУРБОТНЫЯ КУРЦЫ.

З кожных 10 пажараў, адбываючыхся ў Сінгапуры, чатыры ўзнікаюць па віне бестурботных курцоў. Прычым з кожным годам працент пажараў, прычына якіх запаленая цігарэта, узрастае. Так, у мінулым годзе з пяці з паловай тысяч пажараў, дзве з паловай тысячы — па віне курцоў. 17 мільёнаў даляраў — такая цана бестурботнасці. Урад паставіў задачу зрабіць Сінгапур некурачым горадам.

129. СВЕТ НА ДВУХ КОЛАХ.

Па даных ААН, самым папулярным відам спорту ў свеце з'яўляецца на сённяшні дзень веласіпед. На планеце зараз налічваецца каля 420 мільёнаў двухколых машын. Цікава адзначыць, што толькі 3% уладальнікаў веласіпедаў выкарыстоўваюць іх выключна як транспартны сродак. Астатнія 97% бачаць у паездках на двухколавых машынах перш-наперш надзейны сродак умацавання здароўя.

A. According to the UN, the most popular sport in the world is autosport.
B. There are 420 million cars on the planet.
C. Only 3% of bicycle owners use bisycles as a means of transportation.
D. 97% of all bike riders use them omly for short trips.

130. ЛЕПШ НЕ ЗНОЙДЗЕШ.

Пасля 20 гадоў шлюбу сямейная пара з турэцкага горада Ізміра вырашыла развесціся. У пошуках новага партнера мужчына і жанчына незалежна адзін ад другога звярнуліся ў шлюбнае агенства. Камп'ютар, прааналізаваўшы ўсе варыянты, прапанаваў ім у якасці ідэяльнай пары адпаведна былую жонку і былога мужа.

A. The spouses spent 25 years together.
B. The husband went to a dating agency with his wife.
C. According to the computer data, the spouses were a perfect match for each othe
D. Thanks only to the computer one can find himself a perfect match.

131. ДЫЯЛОГ.

— Ці сустрэлі вы ў Беларусі нешта такое, што б асабліва вас уразіла, здзівіла?
— Даўно мяне нічога не можа ўразіць і здзівіць. Прывабляе мудрая цярплівасць народа, які ўсведамляе, што не мае сэнсу перакладваць адзін на аднаго горыч лёсу, які нас пасціг. Нікаму ад гэтага не стане лягчэй. І ў нас, і ў вас кожны сам дайшоў да парады Вальтэра — кожнаму апрацоўваць свой агарод.
— Ваша жыццёвае крэда? Сфармулюйце яго, калі ласка, калі не адным словам, то хоць бы адной фразай.
— Сям'ю накарміць і сябе захаваць! Ёсць у мяне яшчэ адзін дэвіз на манер лацінскай сентэнцыі, — «Пакуль дыхаю, буду трымаць пяро!».

1. What did the Byelorussian people realize?
2. What might be the profession of the interviewed person?

132. ДРУКУЮЦЦА ЎПЕРШЫНЮ.

На гэтым тыдні ў Сіднеі (Аўстралія) будуць надрукаваны да сённяшняга дня нікому не вядомыя творы англійскай пісьменніцы XIX стагоддзя Шарлоты Бронтэ, аўтара, перакладзеннага на шматлікія мовы рамана «Джэйн Эйр».

1. What is so special about the publication in Australia?

133. БУТЭЛЕЧНАЯ ПОШТА Ў XX СТАГОДДЗІ.

У штаце Небраска адзін малады чалавек адправіў ліст сваёй дзяўчыне ў ірландскі горад Даунпатрык незвычайным чынам. Ён улажыў пасланне ў бутэльку і бросіў ў Місісіпі. Рака вынесла бутэльку ў Мексіканскі заліў, а Гальфстрым даставіў яе да берагоў Ірландыі. Пасланне дабіралася да адрасата цэлы год. Але ўсё ж такі дашло ...

134. ПІСЬМЕННІК АДКАЗВАЕ.

— Наколькі палічыце магчымым, раскажыце пра сябе, сваю сям'ю, свае захапленні, прыхільнасці.

— Як у літаратуры, так і ў сям'і я аддаю перавагу класічнай мадэлі. Мая жонка не працавала, а клапацілася пра дом, пра дзяцей і пра мяне. Адзін з маіх сыноў атрымаў адукацыю па польскай філалогіі, цяпер спрабуе стаць прыватным кнігавыдаўцом. Другі — студэнт, займаецца інфарматыкай. Абодва ў Сафіі, а са мной і маёй жонкай тут унук Марка, вучань сёмага класа.

— Вашы сімпатыі і, можа, антыпатыі?

— Сімпатыі да кожнага, хто нешта можа. Антыпатыі — не да таго, хто нічога не можа, а да таго, хто апроч таго што нічога не можа, ды яшчэ і нешта гаворыць.

1. What is the writer's idea of a perfect family?
2. As far as the writer is concerned what is the most disgusting type of people?

135. У СНЕЖНЫМ ПАЛОНЕ.

У Анкорыджы, на Алясцы, паведамляе агенства ЮПІ, здарыўся такі выпадак. Шэсцігадовы Джон Мэйс гуляў на засыпанай снегам вуліцы і не заўважыў, як аказаўся ў апаснай блізкасці ад снегаўборачнай машыны. У момант ён быў пахаваны пад метровым слоем снежнай «кашы». Хлопчык праляжаў у снезе пяць гадзін, пакуль яго не адшукаў паліцэйскі сабака. Да задавальнення ўрачоў бальніцы, у якую даставілі пацярпеўшага, усё абыйшлося добра.

136. ЛІТОЎЦЫ Ў БЕЛАРУСІ.

— ШТО ЎЖО КАНКРЭТНА ЗРОБЛЕНА Ў ЛІТОЎСКІХ СУПОЛКАХ, ЯКІЯ АПОШНІМ ЧАСАМ СТВАРАЮЦЦА Ў БЕЛАРУСІ?

— Напрыклад, у Воранаўскім раёне, у вёсцы Пялесы, працуе літоўская школа. Неўзабаве адкрыем такую і ў Астравецкім раёне, дзе будзе займацца больш як сто вучняў. Амаль у кожнай вёсцы створаны хор літоўскай, ёсць умельцы, якія займаюцца разьбою па дрэву, вышываннем нацыянальных узораў, ткацтвам ... гэта сведчыць аб тым, што яшчэ не ўсё страчана, што людзі памятаюць, хто яны і адкуль...

— Як вы думаеце, што спрыяе гэтаму працэсу?

— Па-першае, кампактнае пражыванне літоўцаў. Па-другое, блізкасць самой Літвы, Вільні, Каунаса, Алітуса, іншых гарадоў. Па-трэцяе, рэлігія (літоўцы — шчырыя вернікі). Але самае галоўнае, на мой погляд, — нацыянальны гонар майго народа, які лічыць, што без свабоды няма шчасця.

137. КАТАСТРОФА САМАЛЁТА.

Сама меней 9 чалавек загінула, уключая групу англійскіх парашутыстаў у выніку катастрофы лёгкага самалёта ў раёне горада Антверпен у паўночнай частцы Бельгіі. Прычыны катастрофы выяўляюцца.

138. СВАБОДНАЯ ЭКАНАМІЧНАЯ ЗОНА.

— Мікалай Анатольевіч, у эканамічных, палітычных слоўніках я так і не знайшла дакладнага адказу на пытанне: што такое свабодная эканамічная зона?

— Давайце адразу дамовімся, што дакладную фармуліроўку гэтага паняцця я таксама даваць не буду — я не навуковец, не тэарэтык, а практык. Таму і гляджу на праблему стварэння і існавання СЭЗ рэальна, улічваючы і грамадска-палітычную сітуацыю ў Беларусі, і эканамічнае становішча нашай краіны. А што датычыцца вашага канкрэтнага пытання, то мушу сказаць: свабодная эканамічная зона — гэта плацдарм для выпрабавання новых эканамічных адносін. Цывілізаваных, рыначных. Не такіх, якія пакуль існуюць у Беларусі, бо гэта не рыначныя адносіны, а хутчэй «базарныя».

1. Can the interviewee answer the given question? If yes/no, why ?
2. What are the reasons for creating a free trade zone?

139. ВЫСТАВА МАРСКІХ СКАРБАЎ.

У Стакгольме нядаўна адчынілася выстава скарбаў, узнятых вучонымі са дна мора. Аквалангісты знайшлі іх ўнутры судна, якое патанула ў 1745 годзе ў раёне Гётэборга. Карабель. які належыў Вест-Індыйскай кампаніі, таксама называўся «Гётэборг». Ён вёз гарбату, шоўк, кітайскі фарфор, зліткі срэбра і золата.

140. ЗЛАЧЫНСТВЫ Ў РЫА-ДЭ-ЖАНЕЙРА.

Бразільскі горад Рыа-дэ-Жанейра клічуць «сусветнай сталіцай крымінальных злачынстваў». У мінулым годзе было забіта 4570 чалавек, а ў першыя пяць месяцаў гэтага года — ўжо 2320 чалавек. Па даных бразільскага друку, колькасць людзей якія падвергнуліся нападу ці былі абрабаваны ў мінулым годзе, складае больш за мільён чалавек. 38% амаль дзевяцімільеннага горада сталі ахвярамі нападу альбо абрабавання, аднак 18% станавіліся двойчы ахвярамі падобных інцыдэнтаў.

141. АДКАЗ ДЫПЛАМАТА.

Мая дыпламатычная акадэмія — гэта мае землякі, настаўнікі, сябры... Ведаеце, мне пашчасціла на добрых людзей, якія вучылі мяне жыць па праўдзе, для дабра людскога. Гэта і першая мая настаўніца, і акадэмікі з універстэта, і мае бацькі, сваякі. З маленства мяне прывучылі паступаць так, каб на зямлі было менш ліха і бяды. У гэтым якраз і галоўная задача дыпламатыі.

Не, я ніколі не марыў стаць дыпламатам, я — інжынер, умею будаваць, рамантаваць і нават... пішу вершы. Канешне, калі мне прапанавалі ўзначаліць пасольства, то давялося прачытаць вялікую колькасць літаратуры, у тым ліку і спецыяльнай, каб авалодаць нейкімі спецыфічнымі асновамі прафесіі.

1. *What question is the diplomat answering?*
2. *What is his official post?*

142. ЗЕМЛЯТРУС У ТАДЖЫКІСТАНЕ.

5 траўня ў 22 гадзіны 41 хвіліну мясцовага часу ў Таджыкістане здарыўся землятрус. Эпіцэнтр знаходзіўся на тэрыторыі Афганістана, 290 кіламетраў на паўднёвым ўсходзе ад Душанбэ. Па разліковых даных, інтэнсіўнасць падземных штурчкоў у эпіцэнтры склала 5-6 балаў.

Сіла землетрусу на тэрыторыі Таджыкістана была: ў Хартоге і Ішкашыме - 5 балаў, у Душанбэ, Нурэке, Пяндже — 4-5 балаў, Джылгатале, Кулябе — 4 бала. Аб ахвярах і разбурэннях не паведамляецца.

143. З ІНТЭРВ'Ю.

*— Некалькі слоў, калі ласка, аб бліжэйшых перспектывах культурнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі.*

— Паміж нашымі краінамі яшчэ няма афіцыйнага культурнага пагаднення, падпісаннага на ўзроўні ўрадавых структур. Пакуль жа ў сваёй практыцы мы абапіраемся на тое, што нараджаецца самім жыццём. Але нават спантанныя ініцыятывы даюць някепскія вынікі. Магу, напрыклад, прыгадаць абмен паміж некаторымі беларускімі і італьянскімі гарадамі канцэртамі музычных і фальклорных калектываў, фестываль італьянскага кіно ў Мінску, арганізацыі выстаў. Мы б хацелі б даць італьянцам большую магчымасць пазнаёміцца з беларускай літаратурай, усталяваць больш глыбокія і трывалыя сувязі паміж нашымі універсітэтамі і акадэміямі, наладзіць абмен вучонымі, прафесарамі, студэнтамі.

144. АКУПІРАВАЛІ НОРТ—ДАМ...

Каля 100 французскіх студэнтаў, якія пратэстуюць супраць планаў урада па рэформе вышэйшай школы, «акупіравалі» на некі час башню знакамітага сабора Нотр-Дам у Парыжы і, каб прыцягнуць увагу да сябе, пачалі званіць у званы, паведамляе агенства Рэйтар. Гэтую акцыю назіралі сотні турыстаў і паліцыя, якая не ўмешывалася ў канфлікт.

## 145. КУГАСВЕТНЫ ПАЛЁТ.

У амерыканскі горад Сіэтл вярнуўся самалёт, які зрабіў кругасветны палёт, паведамляе ЮПІ. «Боінг-747» на борце якога знаходзіўся вядомы астранаўт Н. Армстронг і больш за сотню іншых энтузіастаў, устанавіў новы рэкорд для камерцыйных самалётаў. Ён абляцеў Зямлю а дзвумя прыпынкамі для дозапраўкі за 36 гадзін 54 хвіліны, амаль на дзевяць гадзін перавысіў ранейшае дасягненне.

## 146. У КАМАНДЗІРОЎЦЫ.

— Адчаго вы найбольш стаміліся за два гады знаходжання ў Турцыі?
— Я дагэтуль не сумаваў тут ні воднага дня. Канешне, выпадаюць дні, калі вельмі стамляешся. Напрыклад, сёння. Працоўны дзень пачаў у сем трыдцаць, ды яшчэ — тры апошнія суботы на палігоне...
— Тады апошняе пытанне: Па чым вы больш за ўсё смуткуеце тут?
— Вайскоўцу, канешне, не прывыкаць да таго, што ён два ці тры гады жыве ў адны месцы, пасля — у другім. Але і ў такім жыцці ёсць свая перавага: больш бачыш, больш спазнаеш, больш мудрым і цярпімым робішся. Мне не хапае магчымасці з'ездзіць дадому пабачыцца з бацькамі, з сябрамі па якіх я вельмі сумую.

1. *What are the advantages and disadvantages of the military service abroad?*
2. *Does the serviceman like his stay in Turkey?*

## 147. ЗАМАХ У ЦЭНТРЫ СТАЛІЦЫ.

Пекін. Іранскі дыпламат у Пекіне і яго 8-гадовы сын сталі ахвярамі невядомага забойцы, які абстраляў з аўтаматычнай зброі пасольскую машыну ў цэнтры сталіцы. Паводле паступіўшых звестак, абодва памёрлі ад атрыманых раненняў. Невядомы ў ахоўнай форме, па выгляду кітаец, выпусціў некалькі кароткіх чэргаў па машыне іранскага пасольства, у якой у той час акрамя дыпламата знаходзілася чацвёра дзяцей.

Паводле некаторых звестак, у ходзе перастрэлкі злачынца быў забіты. Па непацверджаных даных, загінулі таксама трое гараджан, яшчэ больш паўтара дзесятка выпадковых прахожых атрымалі раненні.

## 148. ШЛЯХ У ШКОЛУ.

*— Вы з такім захапленнем расказваеце аб сваіх вучнях, што, напэўна, і пытацца не трэба, ці па прызванню сталі настаўніцай?*

— Мой шлях у школу нетыповы. Я хацела паступаць у педагагічны, але ма мама, якая працавала настаўніцай, была катэгарычна супраць. Я паслухалася яе скончыла беларускі палітэхнічны інстытут. Здавалася, ўсё ў жыцці было ў парадк работа ў праектным інстытуце, добры муж, дзеці. Аб чым яшчэ марыць жанчына

Побач з нашым домам школа, я не магла раўнадушна глядзець, як раніцай спяшаюцца туды дзеці, чуць школьны званок... І я адважылася памяняць прафесі амаль у сорак гадоў.

1. How do you know that the woman likes her job?
2. Who interfered with her desire to become a teacher?
3. Why does she say that her way of becoming a teacher is not typical?

149. ТАВАРААБМЕН.

У бліжэйшыя гады тавараабмен Германіі з краінамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы значна павялічыцца. У мінулым годзе інвестыцыі Германіі ва Усходняй Еўропе склалі 5 мільярдаў марак. Рашаючым фактарам для капіталаўкладанняў з'яўляюцца нізкія выдаткі па заработнай плаце ў гэтых краінах.

1. What is the trend in German's economic relations?
2. What is the main reason behind this trend?

150. ДЛЯ СВАІХ І ДЛЯ ЧУЖЫХ.

Польскія пашпарты сталі спецыфічным таварам на рынках. Але прадаўцы фальшывак кіруюцца непарушным правілам: для палякаў — адна цана, для іншаземцаў — другая.

Палякі, якія па розных прычынах страцілі права на пашпарт, купляюць яго па цане ад 1,5 да 6 мільёнаў злотых. Іншаземцы (а гэта перш за ўсё грамадзяне краін СНД, якія жадаюць мець бязвізавы рэжым) плацяць за польскі пашпарт ад 2 да 3 тысяч долараў. Справа ў тым, што грамадзяне Польшчы могуць без усялякіх віз ездзіць амаль па ўсёй Еўропе.

Часцей за ўсё пашпарты падрабляюцца шляхам замены фотакарткі. Сёлета толькі на адным шчэцінскім кантрольным пункце зафіксавана больш як дзвесце такіх выпадкаў.

1. What is the pricing policy for obtaining a Polish passport?
2. Why are Polish passports so desirable for citizens of some countries?
3. What can you say about the validity of the passports sold?

151. ГОЛАС АМЕРЫКІ.

Урад Пакістана ажыццявіў арышт сотняў сваіх палітычных праціўнікаў.

Гэта зроблена за суткі да пачатку прызначанай апазіцыяй усеагульнай забастоўкі з патрабаваннем правядзення ўсеагульных выбараў у краіне. 5 тысяч чалавек арыштаваны толькі ў правінцыі Пенджаб, 3 тысячы — у правінцыі Сінг.

152. ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ ЗОЛАТА.

У Стамбуле завяршыўся чэмпіянат свету па боксу сярод баксёраў да 19 гадоў. На жаль, зборная Беларусі засталася без залатых медалёў, хоць двое яе прадстаўнікоў — баксіравалі ў фінале з кубінскім і італьянскім спартсменамі адпаведна. Аднак прайгралі па ачках.

Стабільны вынік, як заўсёды, паказалі кубінскія майстры скуранай пальчаткі. На іх рахунку 7 залатых, 1 сярэбраная і 2 бронзавыя ўзнагароды і першае агульнакаманднае месца. Другое месца ў агульным заліку занялі расіяне.

1. Is the speaker satisfied with Byelorussian sportsmen performance?
2. Who are the the top atheletes in the sport?

153. БІЛЕТЫ НА ЗАЎТРА.

— Марыля, я купіў білеты ў тэатр.

— Каханы мой, гэта цудоўна, я пачынаю збірацца...

— Так, так, гэты раз не спознімся — білеты куплены на заўтра.

1. What is the woman's reaction to the man's announcement?
2. What precaution did the man take and why?

154. КАСМІЧНЫ «ПАДАРУНАК».

Прадстаўнікі паўночна-амерыканскага аэракасмічнага камандавання паведамілі, што ў бліжэйшыя дні на Зямлю можа рухнуць кітайскі штучны падарожнік, які сайшоў з арбіты. Траекторыя яго палёту не выключае таго, што чатыры тоны абгарэлага металу зваляцца на Маскву ці Лондан.

Куды ж зваліцца кітайскі спадарожнік, можна будзе вызначыць толькі ў апошнія гадзіны яго палёту.

1. How many countries are being referred to in the news item?
2. What problem has arisen?
3. Is it possible to predict the outcome?

155. АХВЯР МАГЛО БЫЦЬ БОЛЬШ.

На мінулым тыдні ў Гомелі невядомы чалавек пачаў стральбу з пісталета па аўтамабілю «Мерседэс», які стаяў на Прывакзальнай плошчы. Дваіх параніў. Узброенага пачалі даганяць работнікі міліцыі, якія неслі службу ў гэты час.

Сітуацыя ускладнялася тым, што ўсё адбывалася ў мнагалюдным месцы, і злачынца, які спрабаваў скрыцца, страляў ва ўсіх без разбору. У час перастрэлкі быў быў забіты сяржант Сярогін, а праз некалькі хвілін смярцельна паранены старшына Барысенка.

Падаспеўшы нарад міліцыі спрабаваў затрымаць забойцу. На прапанову здацца злачынца не адрэагаваў і пры затрыманні быў забіты.

Ні матывы злачыства, ні асоба злачынцы да гэтага не выяўлены. У выніку здарэння пацярпела сем чалавек, але іх магло быць і значна больш, каб не аператыўныя дзеянні работнікаў міліцыі.

1. What started the tragedy?
2. Who dealt with the situation? Why was it difficult to do it?
3. How was the situation resolved? What possible outcome does the speaker assume?

156. АБ ФУТБОЛЕ.

— *Сяргей, якія ўражанні засталіся ў вас аб французскім футболе?*

— Калі гаварыць пра другі дывізіён, то нельга не адзначыць празмернай жорскасці на футбольным полі. Хутчэй за ўсё гэта ад недахопу майстэрства. Гаворачы ж пра каманды першага дывізіёна, нельга не прызнаць той факт, што футбалісты дэманструюць дастаткова тэхнічны, прыгожы і відовішчны футбол. Таму зусім невыпадкова, што французскія клубы даволі паспяхова выступаюць у еўракубках.

— *Што вы можаце сказаць пра беларускі футбол?*

— Ведаю толькі, што Беларусь праводзіць цяпер свой чэмпіянат. На жаль, гульняў з удзелам беларускіх каманд я ўжо даўно не бачыў. І мне цяжка сказаць што-небудзь на гэты конт. Калі ж успомніць пра тое, што было раней, то ў чэмпіянаце краіны даволі паспяхова выступала мінскае «Дынама». За каманду гулялі футбалісты высокага класа.

1. What is the difference between the 1st and the 2nd French soccer divisions?
2. Can Sergey provide us with an update on the Byelorussian soccer? Why?

157. АРМЕНІЯ. Вярхоўны Савет краіны абнародаваў рэзалюцыю, у якой выказваецца незадаволенасць тым, як урад праводзіць эканамічную рэформу. У прыватнасці, падкрэсліваецца, што спробы стабілізіраваць жыццёвы ўзровень насельніцтва Арменіі пацярпелі няўдачу.

1. According to the news report what can be said about level of life in Armenia?
2. Name an reason (reasons) affecting the level of life in Armenia?

158. ВЫКРАДЗЕНЫ ДЫПЛАМАТ.

Эдуард Чаплін разам са сваёй жонкай і маленькім сынам ехалі на машыне з прадстаўніцтва Вялікабрытаніі. На адной з вуліц іх абагнала машына, і шэсць узброеных чалавек прымусілі Чапліна перасесці ў іх аўтамабіль.

Як паведаміў прадстаўнік брытанскага МЗС (міністэрства замежных спраў), англійскага дыпламата звезлі ў невядомым напрамку. Аб яго лёсе нічога не вядома. Прычыны выкрадання неясныя. Жонка і дзіця 1-ага сакратара англійскага прадстаўніцтва знаходзяцца ў бяспецы.

1. What is the official position of Edward Chaplin?
2. What caused Edward Chaplin to get into another car?
3. How was the life of Edward Chaplin affected by the incident?
4. What do you know of the whereabouts of his family?

159. НАВАЛЬНІЦА У СТУДЗЕНІ.

Кіеў. 26. Сярод зімы ўбачылі сёння навальніцу шматлікія кіяўляне. Зігзагі маланкі пераразалі небасхіл, пракаціліся грукаты грому, і на зямлю пасыпаліся сняжынкі.

Гэтая з'ява выклікана рэзкай зменай параўнальна цёплага паветра халодным, — сказала кіраўніца аддзела метэрыалагічных прагнозаў Украінскага гідраметцэнтра Р. Сасноўская. Заняўшы амаль усю еўрапейскую частку краіны, цыклон з цэнтрам паўночней Санкт-Пяцербурга шырокім фронтам рухаецца на паўднёвы ўсход. Наўогул студзень ў гэтым годзе выдаўся ў Кіяве халодным і снежным — сярэднемесячная тэмпература значна ніжей за норму.

160. ЭКАНАМІЧНУЮ ІНФАРМАЦЫЮ У МАСЫ.

Беларускія газеты вельмі дрэнна асвятляюць экалагічную сітуацыю ў рэспубліцы, — так палічыла калегія Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя на сваім апошнім пасяджэнні.

Каб выправіць сітуацыю, на калегіі разглядалася пытанне аб павышэнні ролі ведамасных газет ў прапагандзе экалагічных ведаў.

На калегіі, у прыватнасці, ішла размова аб узмацненні матэрыяльна-тэхнічнай базы згаданых выданняў. Абласным камітэтам па экалогіі прапанавана выдзяляць для іх пэўныя сродкі.

1. What issue was discussed?
2. What steps should be taken to improve the situation?
3. Where might the money come from?

161. ТОРМАЗ ДЛЯ ПАРУШАЛЬНІКАЎ.

Лонданская дарожная паліцыя ставіць на адно з колаў неправільна прыпаркаванага аўтамабіля спецыяльнае прыстасаванне, якое робіць немагчымым рух машыны. Пасля гэтага парушальніку прыходзіцца асабіста вытлумачвацца з паліцэйскімі або накіроўвацца ва ўпраўленне, каб заплаціць штраф і вызваліць з «палону» свой аўтамабіль.

1. What kind of traffic violation do the London police fight against? How do they do it?
2. Is there any way for a lawbreaker to get out of this kind of trouble?

162. СВЕТЛЫЯ ГОЛАВЫ ДОРАЦЬ НАДЗЕЮ НА СВЕТЛУЮ БУДУЧЫНЮ.

Некалькі балаў не хапіла вучню Віцебскай школы-ліцэя #37 Арцёму Шворыну, каб стаць сярэбраным медалістам сусветнай алімпіяды па матэматыцы, што адбылася ў Ганконгу. Пакуль жа ён аўтаматычна ўключаны ў зборную Беларусі для ўдзелу ў наступным турніры інтэлэктуалаў, які пройдзе ў наступным годзе ў Канадзе.

Поспехі Арцёма, як ён сам лічыць, цалкам «на сумленні» яго настаўніка матэматыкі — заслужанага работніка народнай адукацыі Рэспублікі Беларусь Міхаіла Волкава.

1. How successful was Artsyom in math?
2. What did he secure for the next year?
3. Who is <to blame> for his achievement?

163. СЕМ ЗАМКОЎ — НЕ ПЕРАШКОДА.

Цяпер крадуць усё. І тое, што ляжыць без нагляду, і тое, што схавана за 7 замкамі. У Асіповічах мясцовыя зладзеі любяць чысціць падвалы. Выцягваюць часцей за ўсё мапеды, веласіпеды і прадукты харчавання.

Днямі галодныя злаўмысленікі паласаваліся запасамі М., супрацоўніка раённага аддзела ўнутраных спраў. Яны ўкралі 10 кілаграмаў каўбасы, каля 10 кілаграмаў мяса, іншыя харчы і рэчы, што міліцыянер захоўваў у падвале. Замкі ж на дзвярах падвала, між іншым, віселі больш чым надзейныя.

Не пашэнціла і грамадзяніну А. З яго падвала зніклі мапед і запчасткі да «Жыгулёў». І зноў жа надзейныя замкі і моцныя дзверы не сталі перашкодай для злачынцаў.

1. What do the Asipovichy criminals specialize in ?
2. How do the citizens try to battle the crimes and what are the results?

164. РОСТ БЕСПРАЦОЎ'Я.

Бонн. 3 сакавіка. Узровень беспрацоў'я ў Германіі склаў у лютым амаль 15 працентаў. У цяперашні час там налічваецца 3 мільёны 516 тысяч беспрацо Гэта на 228 тысяч больш, чым у лютым мінулага года, паведамляе газета «Гамб моргенпост». Асабліва вялікі рост беспрацоў'я ва Ўсходняй Германіі і сярод жа Па даных газеты, зараз у краіне звыш дзьвух мільёнаў жанчын не маюць магчы працаваць.

1. What is the trend in the employment field of Germany?
2. How does the speaker prove it?
3. Who is particularly affected?

165. ПАСЯБРУЮЦЬ З «ДЭЛЬФІНАМ».

У Жлобіне адбылося адкрыццё плавальнага басейна-комплексу «Дэльфін Ён не толькі аздараўленчы, на 25-метровых водных дарожках можна праводзіць спаборніцтвы. Для малышоў ёсць асобны міні-басейн. Наведвальнікаў чакае нядрэнны сервіс.

Фінансавыя выдаткі па абсталяванню плавальнага комплексу ўзяў на сябе мясцовы Беларускі металургічны завод. Асноўнымі ж яго наведвальнікамі будуць школьнікі і выхаванцы дзіцячых садкоў.

1. What news came from Ghlobin?
2. In what connection is the Byelorussian Steel (Metallurgic) Works mentioned?
3. Who will benefit most?

166. АТРЫМАЙЦЕ «СЕЗАРА»!

Французская актрыса Ізабель Аджані атрымала прэмію «Сезар», якая ў Францыі эквівалентна «Оскару», за галоўную ў фільме «Каралева Марго».

Лепшым французскім фільмам быў прызнаны фільм «Дзікія чароты» рэжысёра Андрэ Тэміна. Гэта салодка-горкая казка пра першае каханне стала лепшай рэжысёрскай працай года.

Лепшым замежным фільмам прызнана кінастужка «Чатыры вяселлі і адно пахаванне».

167. У ДОМЕ ЎРАДА ШУКАЛІ МІНУ.

Тэлефонныя званкі тэрарыстаў ад падкладзенай бомбе то ў школе, то на рынку, здаецца, становяцца сумнай адметай нашага часу. І вось чарговы сігнал. Учора ноччу, 12 красавіка невядомы пазваніў у дзяжурную часць упраўлення ўнутраных спраў горада Мінска і паведаміў, што замініраваны Дом ўрада. Да 12 гадзін будынак быў закрыты, пакуль работнікі грамадзянскай абароны правяралі ўсе памяшканні.

Маючы вопыт папярэдніх «размініраванняў», чакалася, што хутчэй за ўсё гэта чарговы «жарт». Так яно і выйшла: бомбу не знайшлі, бо яе не было.

168. АЛІМПІЯДА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ - ІНВАЛІДАЎ.

Летнія Алімпійскія гульні для дзяцей інвалідаў пройдуць сёлета ў амерыканскім горадзе Нью-Хейвен з 25 чэрвеня па 10 ліпеня. На іх збяруцца юныя спартсмены са 150 краін свету. Спаборніцтвы будуць праходзіць па 19 відах спорту.

Як паведамілі нам у Беларускім камітэце Спешыал Алімпікс, чакаецца вялікае спартыўнае шоу. Усе ўдзельнікі будуць размешчаны ў амерыканскіх сем'ях, дзе яны прыйдуць своеасаблівую акліматызацыю і правядуць трэніровачныя гульні з мясцовымі камандамі інвалідаў.

169. ПАГРОЗА ДЛЯ ЕГІПЕЦКАЙ ПІРАМІДЫ.

Некаторыя вучоныя лічаць, што сусветна вядомая егіпецкая піраміда знаходзіцца пад пагрозай.

Справа ў тым, што ў некалькіх кіламетрах ад гістарычнага месца пачалі пракладваць асфальтавую дарогу. На думку вучоных свету, гэта вельмі пашкодзіць пірамідзе.

170. ДЭФІЦЫТ НАСТАЎНІКАЎ.

У многіх школах, асабліва сельскіх, не хапае настаўнікаў. Але вось дэфіцыт педагагічных кадраў дасягнуў і сталіцы. Толькі ў Завадскім раёне Мінска пустуюць рабочыя месцы больш чым ста настаўнікаў, у асноўным выкладчыкаў замежных моў.

Маладыя педагогі, атрымаўшы дыплом, не спяшаюцца ісці ў школу, а шукаюць месца ў камерцыі або даюць прыватныя ўрокі дзецям з багатых сем'яў, займаюцца рэпетытарствам. За адну гадзіну працы зарабляюць ад 2 да 10 даляраў.

171. ЗЕМЛЯТРУС НА АЛЯСЦЫ.

Як паведамляе агенства Рэйтар з Анкорыджу, на Алясцы адбыўся землятрус сілай у 7,2 балаў па шкале Рыхтэра. Даных аб ахвярах і разбурэннях няма. Тут выказваецца апаска, што гэтае землетрасенне можа выклікаць моцны цунамі ў Ціхім акіяне.

172. ХТО ЛЕПШ КІРУЕ АЎТАМАБІЛЕМ.

«Толькі самазабойца даверыць руль жонцы!». Гэтую фразу мужчынам трэба было б хутчэй забыць. Еўрапейскія фірмы па пракату аўтамабіляў даказалі, што жанчыны кіруюць машынай больш асцярожна і больш уважліва, чым прадстаўнікі моцнага полу. Яны радзей знаходзяцца за рулём у стане ап'янення, меньш робяць аварый з цяжкімі вынікамі. Праўда, мужчыны лепш арыентуюцца на карце аўтамабільных дарог.

173. РАЗЗБРАЕННЕ. Маленькі пасёлак Станькава непадалёку ад Мінска паступова ператварыўся ў завадскую пляцоўку па знішчэнню грозных браніраваных машын. Гэтая былая ваенная база некалькі гадоў назад набыла сусветную вядомасць як месца знішчэння пускавых установак былых савецкіх ядзерных ракет.

А цяпер тут этап за этапам рэжуць зваркай бронетранспарцёры. Працэс гэты нязменна і рэгулярна трымаюць пад кантролям інспектары НАТА. Дарэчы, і зараз у Слюнькове знаходзіцца група кантролю НАТА пад флагам Вялікабрытаніі, у якую, акрамя пяці англійскіх экспертаў ўваходзяць па аднаму афіцеру ЗША і ФРГ.

174. РОСТ ПРЫВАТНАГА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА Ў ВЕНГРЫІ.

Будапешт, 28 ліпеня. Венгерскі ўлад распрацоўвае закон, які значна пашырае прыватны сектар у нацыянальнай гаспадарцы. Падаткі жа на прадпрымальнікаў і акцыянераў, якія зараз дасягаюць 90 працэнтаў будуць зніжаны амаль ўдвая.

175. МЫ ЎСЕ ТАКІЯ РОЗНЫЯ.

Навука ўважліва і дакладна аналізуе і даследуе перавагі аднаго полу перад другім. Вось да якіх высноў прыйшлі вучоныя, якія параўналі жанчын і мужчын па некаторых параметрах.

У каго мацнейшае здароўе.

Пасля хваробы жанчыны хутчэй устаюць на ногі. Яны радзей бяруць бальнічны і, як сведчыць даследванне, праведзенае ў Англіі, адсутнасць на рабоце па прычыне хваробы 7 дзён, а мужчыны — 12 дзён на год. І нарэшце, жанчыны жывуць на 7 гадоў больш.

176. Хто хутчэй можа нечаму навучыцца.

У сярэднім дзяўчынкі на два месяцы раней за хлопчыкаў пачынаюць вучыцца хадзіць. У той час як 90 працэнтаў дзяўчынак у тры гады ўжо даволі добра размаўляюць, хлопчыкам патрабуецца на авалоданне гутаркай на год больш. Дзяўчынкі пачынаюць раней чытаць, і ў іх гэта лепш атрымліваецца.

Што тычыцца матэматыкі, то тут іншая карціна: згодна аднаму з апытанняў, праведзеных у ЗША, на 410 дзяцей, якія лічаць фенаменальна, прыпадала толькі 12 дзяўчынак.

177. Хто здольны вытрымяць большую нервовую нагрузку.

Перавага жанчын назіраецца перш за ўсё ў стрэсавых сітуацыях. Яны вытрымліваюць больш моцны стрэс і могуць яго лягчэй пераадолець. Гэта даказвае даследванне нямецкіх вучоных з універсітэта горада Трыра. У мужчын у экстрэмальнаых сітуацыях выпрацоўваецца ўдвая больш стрэсавых гармонаў, чым у жанчын.

178. ПРЫНЦ ЧАРЛЗ СУПРАЦЬ МАДЭРНІЗАЦЫІ АНГЛІЙСКАЙ СТАЛІЦЫ.

Выступаючы на абедзе, устроеным лонданскім камітэтам гарадскога планавання, наследнік брытанскага трона прынц Чарлз Уэльскі рэзка крытыкаваў будаванне сучасных будынкаў і асабліва небаскробаў у гістарычнай частцы горада.

Чарлз параўнаў дзейнасць забудаўнікоў з бомбардзіроўкамі Лондана ў гады Другой сусветнай вайны. «Нямецкія самалёты пакідалі пасля сябе кучы руін, сказаў Чарлз. Маральная шкода ад безаблічных бетонных каробак побач з шэдэўрамі архітэктуры — ніяк не меньшая.»

*1. What was Prince Charles critical of? 2. Where did he speak?*
*3. How does the center of London look according to him?*

179. БЕЛАРУСЬ — МАРСКАЯ ДЗЯРЖАВА?

6 красавіка 1995 года можна лічыць днём нараджэння Беларускага марскога флоту. Менавіта ў гэты дзень у Дзяржаўным рэестры марскіх суднаў Рэспублікі Беларусь быў зроблены першы запіс — даныя аб судне «Гайдук». Яно перададзена польскімі маракамі сумеснаму беларуска-польскаму прадпрыемству «Белмора-1».

Судна ўяўляе сабой траўлер-фабрыку, зараз знаходзіцца ў міжнародных водах Ціхага акіяна. У далейшым фірма «Белмора-1» мае намер павялічыць колькасць сваіх суднаў. Прыемна, што з'явілася яшчэ адна крыніца паступлення валюты ў даход нашай дзяржавы і тое, што ўпершыню беларускі сцяг з'явіцца на прасторах сусветнага акеяна.

180. СУДОВЫЯ СПРАВЫ Ў АФРЫЦЫ.

У Руандзе пачаўся судовы працэс над ваеннымі злачынцамі. Усе сем абвінавачаных былі прысуджаны да смяротнага пакарання. Адзін з іх, 17-гадовы, сказаў, што забіў 900 чалавек і ніколі не шкадуе аб гэтым.

Зараз у турмах Руанды знаходзяцца тысячы затрыманых, якія абвінавачваюцца ў падобных злачыствах. Іх таксама чакае смяротнае пакаранне.

181. АЛІМПІЯДА ЮНЫХ ХІМІКАЎ.

У Маладзечна 31 сакавіка завяршылася рэспублікагская алімпіяда юных хімікаў. У ёй удзельнічалі 100 вучняў дзевятых- адзіннатых класаў — пераможцаў абласных спаборніцтваў.

Галоўнай мэтай алімпіяды, — сказаў карэспандэнту БЕЛІНФАРМа старшыня журы кандыдат хімічных навук Віктар Хвалюк, — была прапаганда навуковых ведаў, выяўленне таленавітых дзяцей, умацаванне сувязей сярэдняй школы з вышэйшымі навучальнымі і акадэмічнымі інстытутамі.

Праводзіла алімпіяду Міністэрства адукацыі і навукі. На жаль, яе арганізатары сутыкнуліся з праблемай матэрыяльнага забеспячэння конкурсаў. Не хапала сродкаў на набыццё абсталявання, спецыяльнага посуду, хімічных рэактываў.

Пераможцы Алімпіяды атрымалі дыпломы першай ступені.

182. ЗАБАСТОЎКА Ў ПАРЫЖЫ.

У мінулы чацвер тысячы парыжан не маглі трапіць на працу. Работнікі гарадскога транспарту аб'явілі забастоўку. Працавала толькі метро. Прычына забастоўкі, якая была праведзена за 3 тыдні да выбараў у мясцовыя муніцыпалітэты, — нізкая зарплата і высокія падаткі. Бастуючыя спадзяюцца, што іх патрабаванні будуць выкананы.

183. ЭНЕРГАЗБЕРАЖЭННЕ.

У трох мільёнах кватэр жыхароў Беларусі прадугледжана ў бліжэйшыя пяць гадоў устанавіць прыборы ўліку цяпла, гарачай і халоднай вады. Такую інфармац паведаміў старшыня Камітэта па энергазберажэнню і энерганагляду.

Прычым, калі прыбор будзе ўстаноўлены ў гэтым годзе, то кошт уладальніку кампенсуецца на 75%, у будучым годзе на 50, а яшчэ праз год толькі на 25. У наступныя гады прыйдзецца аплачваць і ўстанаўліваць лічыльнікі поўнасцю за свой кошт.

184. МІНІСТР ПАТРАБУЕ.

Міністр замежных спраў Турцыі Клаус Кінкель заявіў, што ўсе дзяржавы павінны спыніць пастаўку зброі ў Турцыю. Кінкель таксама патрабуе неадкладнага вываду турэцкіх войск з тэрыторыі Паўночнага Ірака Вядома, што зброю Турцыі зараз пастаўляе Германія. Але на заяву міністра ўрад Германіі адказаў маўчаннем.

185. ІДЗЕМ ДА ВЫБАРАЎ. З прамовы Валянціны Палевіковай, старшыні беларускай партыі жанчын «Надзея».

— Упершыню ў нашай рэспубліцы створана і зарэгістравана жаночая парть Зрабіць так нас вымусіла жыццё, у якім жанчына — працаўніца, гаспадарыня, мац аказалася на ўзбочыне, тым больш у сферы палітыкі. Хаця часу прайшло няшмат сёння ў нашай партыі ўжо больш за 70 пярвічных арганізацый.

Усе мы, жанчыны розных прафесій, узростаў, сацыяльнага статуса, з'яўляемся аднадумцамі, хочам, каб наша краіна была незалежнай, будавала новыя эканамічныя адносіны, зарыентаваныя перш за ўсё на дабрабыт чалавека, каб нашы сыны не пралівалі кроў за чужыя інтарэсы, каб былі рабочыя месцы для ўсіх, каб улады здзейснялі сацыяльныя праграмы для жанчын і сям'і.

186. ДЭФІЦЫТ ВАДЫ.

У Мадрыдзе адбылася дэманстрацыя працаўнікоў сельскай гаспадаркі паўднёвых раёнаў Іспаніі.

Галоўнай прычынай з'явілася дрэннае арашальнае забеспячэнне раёнаў і бяздзеянне ўрада ў вырашэнні гэтага пытання. З-за частых засух гіне вялікая колькасць ураджаю. Сяляне патрабуюць неадкладна правесці ваду з паўночных раёнаў краіны.

187. ВЯСКОВЫ АЎТАРЫТЭТ.

Карэспандэнт: — *Кузьма Іванавіч, давольце пачаць з віншавання: нядаўна вы адзначылі двайны юбілей: 75-годдзе свайго нараджэння і 50 гадоў напасадзе старшы славутага калгаса. Напэўна, другая лічба можа быць занесена ў кнігу рэкордаў Гінеса*

К.І. — За віншаванне дзякуй. А пра рэкорды я неяк не задумываўся. Гады ляцяць вельмі хутка.

Карэспандэнт: — *Вы заслужаны чалавек, шмат зрабілі для людзей, для рэспублікі, але працягваеце працаваць.*

К.І. — Калі я скажу, што проста не магу сядзець дома, — паверыце мне? Заслугі, пашана, слава — у такім узросце ставішся да ўсяго гэтага вельмі спакойна, хаця і баявых, і працоўных узнагарод за свае жыццё я атрымаў шмат. Грошы? Паверце, вялікага багацця я не нажыў. А працаваць буду, пакуль яшчэ ёсць сілы, таму што калгас мае роднае дзецішча, мой трэці сын, якому аддаў шмат сіл, энергіі, любові.

188. (cont.)

Карэспандэнт: — *Я сустракалася з вамі і 15, і 10 гадоў назад. Такое ўражанне быццам вы непадуладныя часу. Бачу такога ж энергічнага, стройнага чалавека, які трымае ў памяці сотні лічбаў, імён, прозвішчаў. Можа вы ведаеце сакрэт вечнай маладосці?*

К.І. — Сакрэт... Усё жыццё я шмат хаджу, езджу, адным словам, рухаюся. Рабочы дзень пачынаю вельмі рана і раніцай ніколі не снедаю. У праўленні калгаса мяне можна застаць толькі да дзевяці. А потым еду на фермы, у майстэрні, на палі. Дзелавыя сустрэчы, размовы з людзьмі, вырашэнне самых розных пытанняў... Адным словам, дзень ненармiраваны, ніякага рэжыму не прытрымліваюся, ежа - самая звычайная. Так што, мушу вас расчараваць, ніякіх асаблівых сакрэтаў у мяне няма.

189. ПА ЖЫЛЫХ РАЁНАХ — ПЕХАТОЙ.

У Лондане адбылася дэманстрацыя, якую правялі члены арганізацыі аховы прыроды. Яны выступілі супраць забруджвання паветра і патрабавалі забараніць рух аўтамабіляў у жылых раёнах. Дэманстранты заклікалі жыхароў іншых гарадоў выступіць з падобнымі патрабаваннямі.

190. ВЕЛАПРАБЕГ.

27-гадовы віцяблянін Валерый Ганчарэнка задумаў велапрабег ад горада на Дзвіне да горада Ном у ЗША (на Алясцы). Але на гэта, па яго падліках, патрабуюцца немалыя грошы, — прыкладна 40-50 мільёнаў беларускіх рублёў.

Зразумела, такіх грошай у веласіпедыста няма, таму ён звярнуўся да спонсараў, да тых, хто жадаў бы рэкламаваць сваю прадукцыю ва ўсіх краінах СНД і ў Паўночнай Амерыцы. Ці атрымаецца падарожжа на трасе больш як 12 тысяч кіламетраў — невядома.

191. ЗЛАЧЫННАСЦЬ У БЕЛАРУСІ.

— У рэспубліцы ў мінулым годзе было зарэгістравана 120 тысяч злачынс Асаблівы непакой выклікае павелічэнне арганізаванай злачыннасці. Вельмі акт яна праяўляе сябе ў эканамічнай сферы.

Кожная трэцяя злачынная група выяўляецца праваахоўнымі органамі там абарачваюцца буйныя сумы грошай. У поле зроку міліцыі трапляюць камерцый банкі, страхавыя кампаніі, буйныя фірмы і сумесныя прадпраемствы. Страта дзяржаве ад іх злачыннай дзейнасці склала каля 2,5 мільярда рублёў.

192. СТРАСЦЬ БЫЦЬ ПЕРШЫМ.

У жыхара Фларыды Амера Катаны даволі дзіўнае захапленне: ён стараецца ўсюды быць першым. Зараз яму восемдзесят тры гады і па яго падліках, ён апынаўся першым на адкрыцці мастоў, тунеляў, новых аўтамагістраляў больш за 500 разоў.

У трыццатыя гады Катана жыў у штаце Нью-Джэрсі. У той час у раёне вялікага Нью-Ёрка ішло вялізарнае будаўніцтва. Першым аб'ектам у ягоным «паслужным спісе» стаў мост Джорджа Вашынгтана, адчынены ў 1931. За ім надыйшлі новая лінія сабвея і мост Трайбара. У 1937 годзе Амера першым праехаў пад Гудзонам праз тунель Лінкална. У снежні 1939 года ў Нью-Ёрку уступіў у строй аэрапорт Ля Гвардыя і, зразумела, першы білет быў прададзены Катане. Дзевяць гадоў пазней ён першым купіў білет у адчыніўшымся міжнародным аэрапорце, які носіць імя Джона Кеннедзі.

1. What kind of passion led Omero Catana to the LA GUARDIA airport in December 1939
2. What is the age diference between the Lincoln Tunnel and the George Washington Bridge?

193. Ў ГОРАДЗЕ.

— Вы ўжо нямнога пазнаёміліся з горадам?
— Не, яшчэ не паспела. А што вы рэкамендуеце паглядзець?
— У гэтым горадзе асабліва ўражваюць архітэктурныя помнікі. На сёння запланавана экскурсія па горадзе. Ці не жадаеце далучыцца да нас?
— Колькі часу зойме гэтая экскурсія?
— Прыкладна 3 гадзіны. Мы паедзем на аўтобусе, з намі будзе экскурсавод.
— На якой мове ён будзе расказваць аб славутасцях горада?
— Ён выдатна рамаўляе па-ангельску і па-нямецку. Я думаю, ён улічыць любыя вашыя пажаданні.
— Я з задавальненнем паеду з вамі на экскурсію. Дзякуй за запрашэнне.

1. What was the visitor offered to familiarise herself with the city?
2. Is there anything of particular interest to see in this city?
3. Why will the tourist go on the excursion?

194. «ЖАНІХ» ДЛЯ ІЗАЎРЫ.

Для маладой усурыйскай тыгрыцы Ізаўры, якая прапісана ў Жлобінскім заапарку, наспеў час знайсці «жаніха». Справа гэтая няпростая і далікатная. Тыгры аказваецца, у шлюбным выбары вельмі строгія, і той жа, скажам, бенгальскі тыгр для усурыскай тыгрыцы — не пара.

З прыродай не жартуюць. У чаканні «жаніха» жлобінская тыгрыца апынулася на мяжы вар'яцтва. Стан яе здароўя давялося падтрымліваць спецыяльнымі ўколамі. І вось, нарэшце, «жаніх» быў знойдзены. Ён пражывае ў Нікалаеўскім заапарку (Украіна). Туды і паехала Ізаўра.

195. НЕ АБЫЙШЛОСЯ БЕЗ КРЫВІ.

Як і меркавалася, паміж варараждуючымі групоўкамі ў Бурундзі ўзніклі сутычкі, якія скончыліся крывавымі бойкамі.

За некалькі дзён у гэтай невялікай краіне загінула 500 чалавек. Каля 50000 жыхароў пакінулі свае жытло, накіраваўшыся да межаў Заіра. Становішча ў Бурундзі ў хуткім часе будзе абмяркоўвацца ў Савеце Бяспекі ААН.

196. УСТАВАЦЬ ЛЕПШ ПА СОНЕЙКУ.

«Сёння мы ўсе прыйшлі на работу сонныя», — прызнаваліся нават у кабінетах Міністэрства аховы здароўя рэспублікі, куды я звярталася, каб высветліць, як адчувае сябе народ, не даспаўшы адну гадзіну. Якое ж уздзеянне на здароўе чалавека аказвае перавод стрэлак гадзінніка на летні час?

— Наогул усё гэта небяскрыўдна для здароўя, — сказаў намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Леанід Мялешка. — Ёсць біялагічны рытм, які ўздзейнічае на настрой чалавека, на яго сон і бадзёрасць. Раней легчы спаць і заснуць ён не можа. За выключэннем рэдкіх людзей, якія ўмеюць сябе «праграміраваць», «заводзіць» як гадзіннік, большасць людзей адчувае ўнутрані дыскамфорт, вяласць. Асабліва цяжка перыяд адаптацыі пераносяць дзеці, людзі з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі.

197. ПАВЫШЭННЕ ПАДАТКАЎ.

Ужо два дні працягваецца ў Афінах забастоўка працаўнікоў цяжкай прамысловасці. Закрыты трактарны і машынабудаўнічы заводы.

Галоўнай прычынай незадавальнення з'явілася павышэнне падаткаў. Рабочыя лічаць, што гэта толькі на руку прадпрымальнікам — дадатковы сродак для папаўнення іх кішэняў.

198. ДЗІЦЯЧАЯ РЭСПУБЛІКА.

— Пяць гадоў таму, калі я працаваў намеснікам дырэктара сярэдняй школы #116, у мяне ўзнікла думка стварыць дзіцячы парламент, а іншымі славамі, сваю рэспубліку, са Статутам, з міністэрствамі, са сваімі органамі абароны і г.д. Зараз наша парламенцкая арганізацыя моладзі аб'ядноўвае каля 5 тысяч школьнікаў.

Раз у паўгода праводзім з'езд, на якім вырашаем самыя важныя праблемы. Мы выпускаем газету «Клас», пакуль толькі грошай не друкуем.

Работу вядзем па некалькім накірунках. Першы — фізкультурна-аздараўляльны. Зараз рыхтуемся да пятага чэмпіянату горада па міні-футболу. Пастаянна праводзім ваенна-спартыўныя эстафеты для старшакласнікаў. Для будучых воінаў — гэта добрая школа.

199. IX ТРАСЛО.

Моцныя падземныя штуршкі зафіксаваны амаль адначасова на японскім востраве Хансю і на Новай Зеландыі.

У Японіі землетрасенне было сілай у 4,6 бала па шкале Рыхтара. На некаторы час у гэтым раёне спынены рух на чыгунцы і аўтамабільных дарогах. Насельніцтва краіны палічыла, што ўсё гэта «вельмі цікава», толькі нямногія новазеландцы спужаліся стыхіі, хоць некалькі чалавек і былі паранены.

200. ЛІДЭР 2005 ГОДА. ЯКІ ЁН?

Беларускі Саюз Моладзі сумесна з Агенцвам гуманітарных тэхналогій правялі гульню-семінар для старшакласнікаў і студэнтаў ВНУ «Лідэр 2005 года для Беларусі».

Гульня складалася з некалькі этапаў — устаноўчы даклад, праца ў групах, пленарныя пасяджэнні — і заняла цэлы дзень.

Мэта гульні — паназіраць за працэсам станаўлення лідэра ў прамежутку з 1995 па 2005 год. Удзельнікі, а такіх было трыццаць чалавек, спрачаліся з дэпутатамі і прадстаўнікамі палітычных арганізацый, разам шукалі адказы на пытанні: якімі якасцямі павінны валодаць лідэры рэспублікі, і, наогул, якой быць нашай рэспубліцы ў 2005 годзе.

## ДАЛЯЧЫЛІСЯ

*У паўночным японскім горадзе Сукугава ў доме адной рэлігійнай лекаркі паліцыя знайшла 6 трупаў.*

47-гадовая "доктарка" праводзіла курсы лячэння. Падрабязнасці аб здарэнні невядомыя. Жанчына арыштавана.

## РАСЦЕ КОЛЬКАСЦЬ ЗЛАЧЫНСТВАЎ

*Міжнародная арганізацыя па абароне правоў чалавека заяўляе, што за два апошнія гады (асабліва за 1994 год) рэзка павялічылася колькасць палітычных злачынстваў, забойстваў і насілля.*

Парушэнні правоў чалавека адбываюцца ў 151 краіне свету. Так, напрыклад, у Руандзе ў мінулым годзе па гэтай прычыне было забіта больш за палову мільёна жыхароў.

## НА ПРЫЦЭЛЕ – ПАЛІЦЭЙСКІЯ

*На поўдні Егіпта невядомымі асобамі забіта 6 паліцэйскіх.*

Злачынцы адкрылі агонь па аўтамабілі, у якім ехалі паліцэйскія. Пяцёра загінулі адразу, шосты памёр ад ран праз некалькі мінут. Паліцыяй устаноўлена, што злачынства было ўчынена мусульманскімі экстрэмістамі.

## ЧАГО ДЫРЭКТАРУ НЕ ХАПАЛА?

*На буйным хабары пагарэў дырэктар буйнога прамысловага прадпрыемства на Магілёўшчыне. Яго злавілі на месцы злачынства, што называецца за руку, работнікі ўпраўлення КДБ рэспублікі па Магілёўскай вобласці.*

Узбуджана крымінальная справа і вядзецца следства. Кампетэнтныя органы адмовіліся пакуль даваць якія-небудзь каментарыі, аднак, запэўнілі, што ў хуткім часе падрабязнасці будуць абнародаваны.

## НАРЭШЦЕ ЎСАДЗІЛІ

*На чатыры гады пазбаўлення волі асуджаны семнаццацігадовы падлетак з прыгараднага пасёлка Рубы, што пад Віцебскам. Пасля лавы падсудных Віталя Багданкевіча накіравалі ў выхаваўча-працоўную калонію агульнага рэжыму.*

Яго адкрытае паціранне законамі і нахабства не мелі межаў на працягу ўсяго мінулага года. Спачатку ён выкрадае матацыкл, узламаўшы хлеў у пасёлку Вярхоўе, потым — сем электрарухавікоў на мясцовай птушкафабрыцы. Аднак гэтага яму здалося недастаткова і ён зноў выкрадае, але ўжо дзве аўтамашыны "Жыгулі", адну з якіх пашкодзіў, і мапед "Рыга".

Асмялеўшы ад беспакарання, ён залазіць у жылы дом пасёлка Лужасна і выносіць з яго тэлевізар, матрац, коўдру і падушку, затым у тым жа Лужасне вырывае з рук пенсіянеркі сумку з рэчамі больш чым на 600 тысяч рублёў.

Неўзабаве дзеянні шкодніка перамяшчаюцца ў горад. Разбіўшы шкляныя дзверы універмага, што ў самым цэнтры Віцебска, ён выносіць тавараў на суму звыш 600 тысяч рублёў (гэта па цэнах мінулага года). Праўда, тут злачынцу злавілі і ўціхамірылі, пасадзіўшы туды, куды і належала. Нарэшце...

## СУД ВЫХОДЗІЦЬ У НАРОД

*Нечаканае працягненне атрымала нашумелае ў Гомелі больш за год таму забойства настаўнікам школы малалетняй дзяўчынкі. 6 ліпеня судовая калегія абласнога суда пачала разбор гэтай справы. У ходзе працэсу вызначыліся прабелы папярэдняга следства, і суд назначыў дадатковую псіхіятрычную экспертызу. Сваякі ахвяры, якія не згадзіліся з такім рашэннем, выйшлі на вуліцу і недалёка ад будынка суда перакрылі на некалькі мінут рух транспарту, патрабуючы ў мясцовых улад адказаў на іх пытанні. На стыхійным мітынгу выказваліся пагрозы ў адрас складу суда.*

Пракаменціраваць гэту сітуацыю мы папрасілі старшынствуючага па справе суддзю абласнога суда Мікалая Емельяновіча.

— Такая сітуацыя ўзнікла не па віне абласнога суда, — сказаў Мікалай Міхайлавіч. — Разглядаемая справа яшчэ да паступлення ў суд выклікала даволі сур'ёзны грамадскі рэзананс. Па-чалавечы я разумею пацярпеўшых, але суд у любых сітуацыях абавязаны кіравацца толькі законам. Гэты мітынг — вынік набалелых у грамадстве праблем і недасканаласці нашага крымінальна-працэсуальнага заканадаўства.

## ЗЛАЧЫНЦЫ – ПРАФЕСІЯНАЛЫ, А СЛЕДЧЫЯ?..

*У апошні час на Віцебшчыне ўзрасла колькасць разбояў на дарогах. Асабліва на трасах, што праходзяць праз Гарадоцкі, Аршанскі, Дубровенскі і Гарадоцкі раёны. Толькі ў гэтым годзе тут адбылося звыш 15 нападаў.*

Ахвярамі найчасцей становяцца камерсанты. Так, напрыклад, на дарозе каля вёскі Азярышчы чацвёра маладых людзей спынілі рыжскі аўтамабіль і прадставіліся супрацоўнікамі аддзела па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю. Затым яны вывезлі ўладальніка машыны ў лес і забралі цыгарэты на 120 тысяч даляраў. Гэта злачынства раскрыта, але шматлікія разбоі застаюцца беспакаранымі, паколькі іх арганізацыя вельмі часта мае больш высокі ўзровень, чым нашых вышуковых органаў.

Па звестках абласной пракуратуры, злачынныя групоўкі падзялілі вобласць на свае сферы ўплыву. Толькі ў гэтым годзе імі здзейснена 7915 злачынстваў. З іх — 60 наўмысных забойстваў, 59 разбояў, 318 грабяжоў. Лічыцца, што ў вобласці дзейнічае 8 груповак, якія значна павялічылі працэнтную колькасць злачынстваў. Раскрывальнасць іх, наадварот, знізілася да 49,9 працэнта, тады як год таму складала 56,6.

Адной з прычын такога становішча, лічаць у пракуратуры, з'яўляецца нізкі прафесіяналізм следчых і праваахоўных службаў. Напрыклад, у аддзеле барацьбы з эканамічнай злачыннасцю толькі трое з чатырнаццаці супрацоўнікаў ма-

## ВЕЛЬМІ СМАЧНАЯ СОЕВАЯ КАТЛЕТА

***Магчыма, для сталіцы прэзентацыі і сталі ўжо даволі звычайнай з'явай, а вось у нас, у Асіповічах, яны ў навіну.***

У аўтазаводскім кафэ "Траўна" па ініцыятыве завода аўтаагрэгатаў і цэха грамадскага харчавання адбылася прэзентацыя ізраільскай фірмы "Лонг Лайф Джэн Рык", якая спецыялізуецца на вытворчасці і пастаўках харчовых прадуктаў і канцэнтратаў. Гэта якасная, экалагічна чыстая здаровая ежа будучага. Чаго тут толькі не было: канцэнтраты кетчупа, соусаў для піцы, парашковыя супы, крэмы, мусы, пудынгі, кісялі, безалкагольныя напіткі самых розных гатункаў, мясныя і малочныя прадукты, марожанае, маянэз. Усё гэта даўно ўжо вядома ў заходніх краінах, і, нарэшце, фірма дабралася да Беларусі, у Асіповічы.

Мясцовы завод закупіў прадуктаў на 28,5 мільёна рублёў. Тым, хто прыйшоў на прэзентацыю, прапанавалі ўсё гэта паспрабаваць. Цыбулевы суп і соевая катлета — гэта зусім няблага.

## З МАЛАДЫХ ДЫ РАННІХ

Маладую актрысу Сандру Балак называюць "новай Джуліяй Робертс". Нягледзячы на тое, што акцёрскі вопыт Сандры невялікі, яе запрашаюць на здымкі вядомыя рэжысёры.

Поспех дзяўчыне прынёс фільм "Хуткасць" і камедыя "Пакуль ты спаў".

Першая сур'ёзная работа Сандры была пяць год таму, калі ёй пашанцавала замяніць Мелані Грыфіт у адным з тэлесерыялаў. А першым "вялікім" фільмам пачынаючай актрысы стала стужка "Разбуральнік" разам з Сільвестрам Сталоне ў галоўнай ролі. На ганарар Сандра купіла сабе дом у Беверлі-Хілс, дзе і жыве зараз разам са сваёй сястрой.

## ЧАРГОВАЯ НЯЎДАЧА ДЖЭКСАНА

***Выйшаў новы альбом Майкла Джэксана "History" у колькасці 391000 экземпляраў.***

На рэкламу гэтага альбома было затрачана каля 42 мільёнаў даляраў. Аднак, нягледзячы на гэта, прадаецца ён вельмі дрэнна.

У чым прычына: у якасці альбома, ці можа ў спадзе папулярнасці спевака — невядома.

## ЖЫЦЦЁВЫ СЮЖЭТ ДЛЯ ФІЛЬМА

Амерыканскія прадзюсеры вырашылі стварыць новы фільм аб сямігадовым амерыканскім падлетку, які стаў ахвярай італьянскіх аўтамабільных зладзеяў.

Аснова будучага фільма дакументальная. У працы над сцэнарыем прымае ўдзел бацька хлопчыка — жыхар Каліфорніі Рэджынальд Грын.

Сямігадовы Нікалас Грын памёр у бальніцы сіцылійскага горада Месіна. Злачынцы ўкралі машыну сям'і Грынаў, у якой знаходзіўся хлопчык. Адзін са зладзеяў страляў па машыне і папаў у галаву Нікаласа.

Пасля смерці сына бацькі вырашылі перадаць яго жыццёва важныя органы бальніцы. І тым самым выратавалі жыцці сямі італьянскіх падлеткаў.

Бацькі хлопчыка з Каліфорніі сталі сапраўднымі героямі ў Італіі.

## У МАЛДОВЕ ВЕДАЮЦЬ ПРА ЛІДУ

***Пасол Малдовы на Беларусі У. Леску наведаў горад Ліду. Ён пазнаёміўся з працаўнікамі завода харчовых канцэнтратаў, піўзавода і АТ "Лакафарба".***

Менавіта з гэтымі прадпрыемствамі Ліды і збіраюцца наладзіць цеснае супрацоўніцтва бізнесмены Малдовы. З'явілася магчымасць пашырыць пастаўкі ў Ліду кукурузы і віна, а набываць у горадзе фарбу. Канкрэтныя формы супрацоўніцтва будуць абмеркаваны падчас маючага адбыцца наведвання горада групай дзелавых людзей з Малдовы.

## ТЭХНАЛОГІЯ — АМЕРЫКАНСКАЯ, СЫР — КАЛГАСНЫ

***Сырзавод пачаў працаваць у калгасе імя Фрунзе Акцябрскага раёна. Абсталяванне хлебаробы закупілі ў Амерыцы, замежныя спецыялісты дапамаглі таксама асвоіць тэхналогію і абслугоўванне тэхнікі.***

Калгасны сырзавод будзе выраблядь за змену каля 500 кілаграмаў прадукцыі. Па папярэдніх падліках сабекошт аднаго кілаграма складае каля 16 тысяч рублёў. Не бачаць калгаснікі і праблем з рэалізацыяй выраблямага сыру — ужо зараз на руках, як кажуць, заказы з Мінска і Санкт-Пецярбурга.

## РАНЕЙ ЗА ВУЧОНЫХ

***Горад Тулуза (Францыя) кожны дзень падымаецца і апускаецца на чатыры дзесяткі сантыметраў. Гэта ўстанавілі вучоныя Цэнтра касмічных даследаванняў.***

Цікава, што мясцовыя п'яніцы зафіксавалі гэта намнога раней за вучоных.

У амерыканскай кіназоркі Лары Хагман, вядомага па фільму "Dallas", выявілі рак печані.

Пра гэта паведаміў яго ўласны ўрач.

Хвароба знаходзіцца на ранняй стадыі, і Хагмана яшчэ магчыма выратаваць. Але, нягледзячы на жудасную навіну, Лары застаецца спакойным і стараецца не падаць духам.

# ДАПАМОГА, НЕАБХОДНАЯ ДЗЕЦЯМ

*Днямі адбылася прэс-канферэнцыя, прысвечаная развіццю міжнародных сувязей Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь і вынікам візіту ў нашу краіну дэлегацыі зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія (Германія).*

У прэс-канферэнцыі ўдзельнічалі міністр аховы здароўя рэспублікі Інеса Міхайлаўна Драбышэўская, прадстаўнікі нямецкай дэлегацыі, іншыя афіцыйныя асобы.

Паводле слоў Інесы Міхайлаўны, цяперашні візіт міністра ўнутраных спраў зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія спадара Герберта Шнора з дэлегацыяй быў запланаваны яшчэ пад час адкрыцця дзіцячага хірургічнага цэнтра ў мінулым годзе ў Мінску. Яго пабудавалі за кошт сродкаў, якія ахвяравалі зямля Паўночны Рэйн-Вестфалія і Еўрапейскае супольніцтва.

У вышэйназванай установе з найноўшым медыцынскім абсталяваннем аказваецца дапамога дзецям з сардэчнымі захворваннямі. Немцы пастаўляюць туды разнастайныя лекі і праводзяць навучанне персаналу.

"Такі прыклад гуманітарнай дапамогі — ідэальны. Я хачу папрасіць усе грамадскія фонды Германіі, Францыі, Японіі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі, аказваць дапамогу менавіта так, як гэта робяць прадстаўнікі зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія", — падкрэсліла міністр аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

Што тычыцца візіту нямецкай дэлегацыі, то Інеса Міхайлаўна падкрэсліла асаблівую важнасць гэтай падзеі. Госці наведалі шэраг шпіталяў на Гомельшчыне — рэгіёне, які найбольш пацярпеў ад наступстваў аварыі на ЧАЭС.

"Ужо ў панядзелак (10 ліпеня) спадар Петэр Ленберг — адзін з членаў нямецкай дэлегацыі — павінен прадставіць праграму плануемай дапамогі Беларусі ў Еўрапарлапент" — сказала Інеса Міхайлаўна.

Са свайго боку, прафесар Дзюсельдорфскага універсітэта Петэр Ленберг адзначыў, што пад час працы ў Мінскай клінікі нямецкія спецыялісты шмат чаму навучыліся. У прыватнасці, выпрацаваны метады ўздзеяння, якія садзейнічаюць паніжэнню смяротнасці сярод насельніцтва.

Дэлегацыя зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія пасля наведвання поўдня Беларусі прыйшла да высновы, што дапамога ў першую чаргу неабходна дзецям, асабліва нованароджаным.

# ААН ДАПАМАГАЕ

*У канцы чэрвеня Беларусь наведаў намеснік Генеральнага сакратара ААН па гуманітарных пытаннях Пітэр Хансен. Візіт праходзіў у рамках ажыццяўлення доўгатэрміновай праграмы па аказанню Беларусі дапамогі ў вырашэнні праблем, звязаных з аварыяй на ЧАЭС.*

У Нацыянальным прэс-цэнтры Пітэр Хансен і іншыя афіцыйная асобы — прадстаўнікі ААН і Беларусі — сустрэліся з айчыннымі журналістамі.

Паводле слоў намесніка Генеральнага сакратара ААН, сёння ў свеце шмат разнастайных катастроф. Ад Сахаліна да Лос-Анжэлеса яны так ці інакш уплываюць на жыццё планеты. "Акрамя таго, у свеце налічваецца 30 мільёнаў уцекачоў і 25 мільёнаў перамешчаных асоб", — зазначыў насменік сакратара ААН па гуманітарных пытаннях.

"Што тычыцца Беларусі, то крызіс, выкліканы аварыяй на ЧАЭС, істотна адрозніваецца ад усіх іншых, якія можна ўбачыць па тэлебачанні. Сусветнай грамадскасці цяжка яго зразумець.

Беларускі крызіс мае пачатак, але не мае акрэсленага канца. Між тым, сітуацыя з кожным годам ускладняецца.

Вось толькі адзін прыклад — захворванні насельніцтва пасля аварыі на ЧАЭС увесь час узрастаюць. Трэба, каб да Беларусі адносіліся з пачуццём салідарнасці і чалавечага спачування ў мэтах пераадолення і змяншэння вынікаў аварыі," — падкрэсліў Пітэр Хансен.

Замежны госць паведаміў таксама, што шматлікія пытанні, звязаныя з наступствамі катастрофы дзевяцігадовай даўніны, абмяркоўваліся з міністрамі замежных спраў, аховы здароўя, па надзвычайных сітуацыях і Прэзідэнтам.

**АТЫ-БАТЫ**

# ПРЫСЯГНУЛІ НА ВЕРНАСЦЬ НАРОДУ

*Самыя, бадай, урачыстыя мінуты ратнай службы, якая нядаўна пачалася, перажылі ў мінулую нядзелю маладыя воіны праслаўленай 120-й Рагачоўскай дывізіі. У гэты дзень яны прымалі ваенную прысягу на вернасць беларускаму народу.*

На гарнізонным пляцы перад ветэранамі злучэння, сваімі бацькамі, сябрамі і сяброўкамі, якія прыехалі на ўрачыстасць, наваспечаныя гвардзейцы пакляліся сумленна, з годнасцю несці службу Айчыне, пастаянна ўдасканальваць ратнае майстэрства, заўсёды быць гатовымі па загаду Прэзідэнта і ўрада са зброяй у руках абараніць суверэнітэт і бяспеку роднай рэспублікі.

Са словамі на дарогу да воінаў звярнуўся выконваючы абавязкі міністра абароны Беларусі генерал-лейтэнант Леанід Мальцаў. Ён заклікаў салдат і афіцэраў, нягледзячы на перажываемыя рэспублікай і яе Узброенымі Сіламі эканамічныя і сацыяльныя цяжкасці, прыкласці ўсе сілы і ўменне для забеспячэння высокай баегатоўнасці войскаў маладой беларускай арміі, працэс фарміравання якой уступае ў якасна новую фазу. Ад майстэрства, стараннасці і дысцыпліны кожнага воіна будзе залежаць выкананне патрабаванняў Прэзідэнта рэспублікі — стварыць высокамабільную, добра аснашчаную сучасным узбраеннем і баявой тэхнікай армію, у якой кожны салдат, афіцэр, генерал будуць прафесіяналамі высокага класа.

Пасля афіцыйнай часткі воіны прымалі віншаванні родных і блізкіх, удзельнічалі ў культурнай праграме.

БЕЛІНФАРМ.

## ЗАМІНІРАВАНАЯ ЗЯМЛЯ

*І сёння дае знаць аб сабе мінулая вайна. То ў адным, то ў другім кутку Жлобінскага раёна людзі знаходзяць іржавыя снарады і міны. Асабліва ўзрастае колькасць заявак на размініраванне ў перыяд палявых работ.*

Не сталі выключэннем і апошнія тыдні. Снарады былі выяўлены ў вёсках Мормаль, Клыбаўка, Малыя Казловічы, а таксама ў Жлобіне. Апошняй такой небяспечнай знаходкай стала бомба, якую заўважылі будаўнікі на будаўнічай пляцоўцы ў густанаселеным 19-м мікрараёне горада.

На шчасце, усе баявыя зарады былі паспяхова абясшкоджаны снайперамі.

## СЛУЖЫЦЬ ІМ НЯМА КАЛІ

*Усё больш негатыўныя адносіны да службы ў арміі назіраюцца сярод прызыўнікоў Віцебскай вобласці. У час асенняга прызыву, напрыклад, ухілілася ад службы каля 140 чалавек.*

Тая ж карціна назіраецца і ў гэты вясенне-летні тэрмін. Найбольшую колькасць адмоўнікаў даў Наваполацк, а таксама Першамайскі раён абласнога цэнтра. Адпаведна 68 і 34 юнакі праігнаравалі воінскі абавязак.

Службамі ваенкаматаў сумесна з міліцыяй вядуцца пошукі адмоўнікаў. Звычайна імі з'яўляюцца юнакі, якія займаюцца дробным "чаўнаковым" бізнесам і лічаць службу ў войску дарэмнай тратай часу.

86.

## КАНЦЛЕР – ЗА ДРУЖБУ

*Федэральны канцлер Германіі Гельмут Коль адзначыў дружбу з Польшчай як важную мэту палітыкі Германіі.*

"У XXI стагоддзі не будзе сапраўднага міру, калі паміж Германіяй і Польшчай не ўсталююцца такія адносіны, як паміж Германіяй і Францыяй" — падкрэсліў ён. Канцлер адхіліў таксама заяву Масквы супраць уступлення Польшчы ў НАТО і выказаў свае спадзяванні на хуткі прыём Польшчы ў Еўрапейскі Савет.

## ПАГАДНЕННЕ НЕ ПАДПІСАНА

*Прэзідэнт Ізраіля Рабін мае намер заключыць з Іарданіяй пагадненне аб палесцінскіх аўтаномных правах да сярэдзіны ліпеня.*

Як паведаміў міністр замежных спраў Ізраіля Перэс, пагадненне ўжо было амаль падпісана, але ў апошні момант палесцінскі бок папрасіў аб адтэрміноўцы на некаторы час. Нягледзячы на тое, што падпісанне дакумента было адкладзена, па-ранейшаму вядуцца перагаворы з Перэсам і Арафатам.

## ВЫКРАДЗЕНЫ ТРЫ НЯМЕЦКІЯ ІНЖЫНЕРЫ

*На мінулым тыдні 'пакістанцамі былі выкрадзены 3 нямецкія інжынеры.*

Адзін з іх быў вызвалены. 56-гадовы мужчына, работнік нямецкай фірмы "Sumens", ноччу збег. Самаадчуванне ўцякача здавальняючае, паведамляе нямецкае пасольства ў Ісламабадзе. Аб іншых выкрадзеных ніякіх звестак няма.

## ЧАРГОВАЯ ДЫВЕРСІЯ "АУМ СІНРЫКЁ"

*На чатырох станцыях Такійскага метро зноў былі знойдзены ёмістасці з ядавітым газам.*

Паліцыі ўдалося своечасова прыняць меры і тым самым выратаваць ад смерці тысячы пасажыраў. Аднак чатыры чалавекі ўсё ж атрымалі цяжкія атручванні.

## ВАЯВАЦЬ БУДЗЕМ РАЗАМ

*Сумесныя расійска-амерыканскія ваенна-марскія вучэнні, прысвечаныя чарговай гадавіне заканчэння Другой Сусветнай вайны, пройдуць у верасні непадалёку ад Гавайскіх астравоў.*

З расійскага боку ў іх прымуць удзел караблі Ціхаакіянскага флоту.

## ЮБІЛЕЙ ЗЯМНОГА БОГА!

*У Дэлі адкрыўся міжнародны сімпозіум, прысвечаны 60-годдзю Далай-Ламы.*

У пяцігадовым узросце ён, згодна рэлігійнай традыцыі, быў названы прыемнікам памёршага Далай-Ламы XIII, а ў 16 год стаў правіцелем Цібета. Пасля паўстання 1959 года Далай-Лама эмігрыраваў у Індыю, дзе знаходзіцца і па сённяшні дзень.

У сімпозіуме прымаюць удзел дэлегацыі з розных краін свету. Галоўная яго мэта — садзейнічаць узаемаразуменню паміж народамі і распаўсюджванню ідэй агульнага міру, братэрства і ненасілля.

## ЧЫМ ЗМОЖАМ – ДАПАМОЖАМ

*У Бон прыбыў прэзідэнт Украіны Кучма.*

Пасля двухгадзіннай размовы Кучмы з прэзідэнтам Германіі і федэральным канцлерам Г.Колем з боку Германіі Украіне будзе аказана далейшая эканамічная і фінансавая дапамога. "Па магчымасці мы гатовыя і ў далейшым дапамагаць Украіне", — заявіў Г.Коль у інтэрв'ю з журналістамі.

## НЕ ВЕРЦЕ РЭКЛАМЕ!

*У Германіі афіцыйна забаронена рэклама зубной пасты, якая гарантуе пазбегнуць карыесу.*

Вучоныя ўстанавілі, што гэта не так. На самай справе такая паста толькі часткова захоўвае зубы ад карыесу, а не цалкам перасцерагае іх ад захворвання, аб чым запэўнівае рэклама. Менавіта з гэтай прычыны яе і забаранілі.

## МЭЙДЖЭР АТРЫМАЎ ПЕРАМОГУ!

*Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Джон Мэйджэр зноў абраны старшынёй Кансерватыўнай партыі.*

З 329 членаў-дэпутатаў фракцыі 218 аддалі яму свае галасы. 89 чалавек прагаласавалі за Джона Рэдвуда — адзінага канкурэнта Мэйджэра. Перамога на выбарах азначае для прэм'ер-міністра тое, што ён застанецца і кіраўніком урада. Адразу пасля выбараў Мэйджэр патрабаваў стварэння новага ўрада.

## ХІЛАРЫ КЛІНТАН – У ЯКАСЦІ ПЕРШАЙ ЛЭДЗІ І ЖУРНАЛІСТА

*Першая лэдзі ЗША Хілары Клінтан збіраецца кожны тыдзень пісаць рэдакцыйную калонку, якая будзе распаўсюджвацца па краіне самым буйным у ЗША інфармацыйным сіндыкатам.*

Хілары заявіла, што яна хоча падзяліцца з амерыканскім народам сваімі ўражаннямі і ўрокамі, атрыманымі ёю за час яе знаходжання ў Белым доме ў якасці першай лэдзі.

## ДЫЕТОЛАГІ ДАЗВАЛЯЮЦЬ ЕСЦІ САЛОДКАЕ

*Шведскія дыетолагі правялі эксперымент і прыйшлі да нечаканай высновы.*

Аказваецца, што вугляводы, якія лічыліся бічом таўсцякоў, зусім не прыводзяць іх да такога стану. Праўда, пры ўмове: чалавек не павінен злоўжываць тлустай ежай. Так што можна есці цукар, хлеб, бульбу і, вядома, садавіну і агародніну.

87.

## СКАРАЧАЕЦЦА КОЛЬКАСЦЬ ЗЛАЧЫНСТВАЎ

*У мінулым годзе колькасць злачынстваў, здзейсненых супраць пражываючых у Германіі іншаземцаў, скарацілася больш чым удвая.*

Адначасова павысіўся і ўзровень раскрывальнасці правапарушэнняў (з 22 да 30 працэнтаў).

## КРАІНА ЛАСКАВАГА СОНЦА І АЎТАМАБІЛЯЎ

*У Італіі на кожных двух жыхароў, уключаючы старых і нованароджаных, цяпер прыпадае па аднаму аўтамабілю. Гэта — адзін з самых высокіх паказчыкаў у свеце.*

На адным з першых месц у свеце Італія знаходзіцца і па другім паказчыку: на кожны кіламетр яе дарожнай сеткі прыпадае больш як 100 аўтамашын.

## САКРЭТ ПОСПЕХУ – ВЕТЛІВАСЦЬ

*Адзін з вядучых банкаў Кітая дабіўся павышэння ўкладаў у яго аддзяленнях.*

Адбылося гэта зусім не таму, што банк стаў плаціць больш высокі працэнт: проста касіры і іншыя служачыя банка перасталі грубіць кліентам у час работы. Праўленне выдал інструкцыю, якая забараняе супрацоўнікам некаторыя фразы, напрыклад, такія: "Я не ве даю", "Гэта не ўваходзіць у мае абавязкі" "Чакайце, вы што, не бачыце, што я заняты!"

## ЯСЕР АРАФАТ ХУТКА СТАНЕ БАЦЬКАМ

*Аб гэтым паведаміла яго жонка Саха інтэрв'ю часопісу "Парыз'ен".*

Нарадзіць дзіця яна збіраецца ў Парыжы не ў Сектары Газа, дзе яе муж заняты кіраваннем тэрыторыі, якая атрымала аўтаномію ад Ізраіля.

## ЛЮДЗІ ПАМІРАЮЦЬ АД ГОЛАДУ

*Баснійскімі сербамі абстраляны генеральны штаб ААН у Сараева.*

Паранены 5 чалавек. Да гэтага французскія "блакітныя каскі" ўварваліся ў раёны сербаў каля гары Ігман. Звестак аб гэтым інцыдэнце пакуль няма. Але ўжо ўстаноўлена, што ў занятым сербамі раёне Біхач людзі пачалі паміраць ад голаду.

## ТАЯМНІЧЫ ВЫБУХ

*У Германіі ў раёне Біберак пацярпеў крушэнне спартыўны самалёт.*

Усе чатыры пасажыры загінулі. Згодна з данымі паліцыі, машына мела праблемы пры старце. Праз некалькі мінут пасля ўзлёту самалёт узарваўся. Ідзе расследаванне.

## ЛЯСНЫ ПАЖАР У ІЗРАІЛІ

*Каля 28 чалавек паранены пры пажары ў Ізраілі.*

Два з іх атрымалі цяжкае атручванне чадным газам. Насельніцтва пяці прыгарадных раёнаў Іерусаліма эвакуіравана, паведамляе Ізраільская паліцыя.

У выніку пажару згарэлі тысячы гектараў сасновага лесу. Прычына яго невядомая. Зараз у Ізраілі моцная спёка. У Тэль-Авіве — +37° у цені.

## ХТО ПАКЛАПОЦІЦЦА ПРА БЕЖАНЦАЎ?

*Турэцкая армія правяла налёт на мірнае насельніцтва курдаў у Паўночным Іраку.*

Больш за 700 сем'яў былі вымушаны пакінуць свае месца жыхарства. Зараз некаторыя з іх знаходзяцца ў сваіх блізкіх, але большасць сем'яў засталіся без прытулку.

## НОВЫ ВІД ДЫНАЗАЎРА

*Вучоныя Францыі знайшлі новы від дыназаўра. Яны даследавалі шкілет дыназаўра, якому прыблізна 75 мільёнаў гадоў. Харчаваўся ён выключна раслінамі.*

З 10 ліпеня турыстам дазволена наведаць месца раск пак.

## НЕВЯСЁЛЫЯ КАНІКУЛЫ

*На поўдні Францыі ў выніку дарожна-транспартнаг. здарэння загінула 22 пасажыры.*

Аўтобус, у салоне якога знаходзіліся ў асноўным сту дэнты з Іспаніі і Нідэрландаў, абганяў грузавік. Вадзіцел не справіўся з кіраваннем, і аўтобус перавярнуўся.

## ПЕРШЫ АФІЦЫЙНЫ ВІЗІТ

*Кароль Бельгіі Альберт II разам з каралевай Паулай знаходзіцца ў Германіі з афіцыйным 4-дзённым візітам.*

Прэзідэнт Германіі сустрэў каралеўскую пару ў Боне. Кароль з каралевай збіраюцца наведаць Берлін, Брандэнбург і Цюрынген. У канцы візіту прадугледжана сустрэча з федэральным канцлерам Гельмутам Колем.

## "GREENPEACE" І БЫЛЫ ПРЭЗІДЭНТ – СУПРАЦЬ!

*Карабель "Rainbow Warrior II", які належыць міжнароднай арганізацыі "Greenpeace", адправіўся ў паўднёвы раён Ціхага акіяна, дзе Францыя будзе праводзіць выпрабаванні ядзернай зброі.*

"Greenpeace" рэзка крытыкуе такое рашэнне Францыі.

Былы прэзідэнт Францыі Мітэран таксама выступіў з пратэстам і заявіў, што ўжо прыйшоў час пакласці канец ядзернаму ўзбраенню.

## АЛЕ ПРЫНЦ НЕ ЗГОДЗЕН

*Два гады таму ўрад Брытаніі прапанаваў прынцэсе Дзіяне стаць паслом, каб прадстаўляць інтарэсы краіны за мяжой.*

Прынцэса і сама даўно жадала займацца палітыкай. Але вось прынц Чарльз катэгарычна супраць такога рашэння.

## АСЦЯРОЖНА, КІТАЙСКІЯ МЕДЫКАМЕНТЫ!

*Як паведаміла кітайская цэнтральная "Народная газета", рынак краіны перапоўнены небяспечнымі для здароўя медыкаментамі, якія выпускаюцца ў Кітаі.*

Вучоныя папярэджваюць, што людзі, якія прымалі гэтыя лекі, могуць пазбавіцца зроку ці слыху.

## НОВЫ РАУНД ПЕРАГАВОРАЎ

*Міністр замежных спраў Германіі Клаўс Кінкель працягвае весці перагаворы з сірыйскім урадам.*

На першым плане перагавораў — узаемаадносіны Сірыі з іншымі дзяржавамі Блізкага Усходу. Кінкель сустрэўся з міністрам замежных спраў Сірыі Шарам і прэзідэнтам Асадам. У час перагавораў ён заявіў, што Германія не стане пасрэднікам у адносінах дзяржаў Блізкага Усходу, а будзе падтрымліваць ЗША ў палітыцы збліжэння Сірыі і Ізраіля.

## КЛОПАТЫ РАБІНА

*Яўрэйскія перасяленцы пачалі падрыхтоўку да будаўніцтва жылля ў Заходняй Іарданіі.*

Прэзідэнт Ізраіля Рабін у 1992 годзе заявіў, што ўсё будаўніцтва ў Заходняй Іарданіі будзе спынена. Зараз, напярэдадні падпісання дагавора з Палесцінай, ён даў дазвол на будаўніцтва жылля для яўрэяў.

## ШЛЯХІ ВЫРАШЭННЯ КАНФЛІКТУ

*Праяўляць "максімальную стрыманасць" і шукаць шляхі палітычнага ўрэгулявання канфлікту ў Чачні заклікала ўдзельнікаў перагавораў у Грозным парламенцкая асамблея Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (АБСЕ).*

Нягледзячы на шматлікія крытычныя заўвагі ў адрас расійскіх улад з нагоды вырашэння чачэнскай праблемы, рэзалюцыя асамблеі пацвердзіла неабходнасць вырашэння чачэнскага крызісу ў рамках Канстытуцыі Расіі, прадугледжваючай непадзельнасць яе тэрыторыі.

## ЕС – НЕ СУПРАЦЬ

*Еўрапейскае супольніцтва "крайне зацікаўлена" ў выхадзе КНР з ізаляцыі і яе ўваходжанні ў сусветную эканоміку і палітыку.*

За гады рэформаў тавараабарот КНР з краінамі ЕС узрос у 14 разоў, але ўзровень прамых інвестыцый еўрапейскіх дзяржаў у кітайскую эканоміку застаецца "безнадзейна нізкім" і яўна прайграе канкурэнтам з іншых краін.

## У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ – ФРАНЦЫЯ

*Рэзкае асуджэнне рашэння Францыі аднавіць ядзерныя выпрабаванні выказала Парламенцкая асамблея Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, сесія якой штогод праходзіць у канадскай сталіцы.*

Асамблея заклікала кабінет Жака Шырака перагледзець гэта рашэнне.

## А ТЫМ ЧАСАМ...

*Міністр замежных спраў Босніі запатрабаваў неадкладнага вываду міжнародных войск з гэтай краіны.*

А тым часам баснійскія сербы ўварваліся ў зону ААН.

## АХВЯРА ПАЛІТЫЧНЫХ ІНТРЫГ

*Больш за 10 тысяч жыхароў Багдада выйшлі на дэманстрацыю ў знак пратэсту супраць эмбарга, прынятага рашэннем ААН.*

Садам Хусейн пагражаў парваць адносіны з гэтай арганізацыяй, калі санкцыі не будуць зняты. Ён лічыць, што Ірак стаў ахвярай палітычных інтрыг.

## ГУМАНІТАРНАЯ ДАПАМОГА

*Урад Германіі выдзеліў гуманітарную дапамогу д. баснійскіх бежанцаў.*

Міністр замежных спраў Кінкель сам заняў размеркаваннем грошай. У Боснію адпраўлены 20 машы з харчаваннем і медыкаментамі.

## НЕ ВЫТРЫМАЎ ПАКУТ ХВАРОБЫ

*Намеснік міністра абароны Ізраіля Гур скончы самагубствам.*

У сваім развітальным лісце ён папрасіў прабачэння блізкіх і прызнаўся, што не мае больш сіл цярпець. 60 гадовы Гур больш за 10 год пакутаваў ад рака.

## СОТНІ ЗАГІНУЎШЫХ САЛДАТ

*Ваенныя крыніцы баснійскіх сербаў паведамляюць пра страты, панесеныя урадавымі войскамі Босніі і Герцагавіны за апошнія чатыры дні ў баях на плато Трэскавіца на поўдзень ад Сараева.*

Адпаведна з інфармацыяй камандавання арміі баснійскіх сербаў, у выніку яе контратак у працiўніка адбіты ўсе стратэгічна важныя аб'екты, а на полі бою засталіся "сотні загінуўшых мусульманскіх салдат".

## ЗАМЕНА ВАЛЮТЫ

*Іарданскі дынар заменіць Ізраільскі шэкель у якасці існуючай валюты палесцінскай аўтаноміі на Заходнім беразе ракі Іардан.*

Аб гэтым заявіў у пятніцу на прэс-канферэнцыі ў туніскай сталіцы дырэктар Палесцінскай фінансавай арганізацыі Фуад Бсісу.

## АДНАГО ФАКТА – НЕ ДАСТАТКОВА!

*Прызнанне Багдадам факта праводзення работ па стварэнню бактэрыялагічнай зброі недастаткова для аднаўлення поўнага даверу да іракскага рэжыму, заявіў афіцыйны прадстаўнік амерыканскага Дзяржднепа Нікалас Бэрнс.*

Паводле яго слоў, ЗША будуць "пільна сачыць" за пазіцыямі "іншых краін" пры галасаванні ў ААН пытання аб зняцці санкцый з Багдада, да таго ж у якасці перспектыўных "працiўнікаў" Белага дома былі ўпамянуты Расія і Францыя.

## УЛЬТЫМАТУМ

*Баснійскія сербы запатрабавалі вызваліць тэрыторыю Срэбніка. Яны далі 48 гадзін для таго, каб войскі ААН і 42 тысячы жыхароў пакінулі гэты раён.*

Але камандаванне ААН цвёрда вырашыла не прымаць ультыматум і не пакідаць тэрыторыю.

## КАБ ПАЗБЕГНУЦЬ КАТАСТРОФЫ

*Аўстралійскае грузавое судна з нафтай было выкінута на рыфы. У выніку чаго 300 тон нафты трапіла ў ваду.*

Спецыялісты імкнуцца сабраць гэтую нафту, каб пазбегнуць яшчэ адной экалагічнай катастрофы.

## ЛЕС ПАДПАЛІЛІ НАЎМЫСНА

*У заходняй Турцыі ў выніку пажару загінула каля 80 гектараў лесу.*

З-за моцнага ветру агонь распаўсюджваецца з неверагоднай хуткасцю.

Паліцыя яшчэ не ведае прычыны пажару, але падазрае, што зроблена гэта наўмысна — агонь успыхнуў адначасова ажно ў чатырох месцах.

## СУСТРЭЧА ПРЭЗІДЭНТАЎ

*Паміж лідэрамі Францыі і Германіі адбылася сустрэча на вышэйшым узроўні.*

Галоўнай тэмай для перагавораў стала падрыхтоўка да новай канферэнцыі, якая павінна вызначыць будучае ЕС. На сустрэчы таксама разглядаліся пытанні аб'яднання еўрапейскіх валют і ўключэнне ў састаў ЕС краін Усходняга блоку.

Акрамя гэтага, Гельмут Коль збіраеццаправесці размову з Жакам Шыракам аб выпрабаваннях ядзернай зброі ў Ціхім акіяне.

## ЗАСТАЛАСЯ Ў ЖЫВЫХ

*Пад руінамі універмага, разбуранага 12 дзён таму, выратавальная каманда знайшла 18-гадовую дзяўчыну.*

Яна 286 гадзін знаходзілася пад руінамі ёй пашчасціла застацца ў жывых.

Як паведаміла паліцыя, пад руінамі універмага загінула 200 чалавек, 900 — паранены, 200 лічацца прапаўшымі без вестак.

## ЦАНА НА КАВУ БУДЗЕ РАСЦІ

***Галоўныя экспарцёры кавы вырашылі з кастрычніка 1995 года скараціць на 20 працэнтаў пастаўкі ў розныя краіны свету.***

Гэтым яны спадзяюцца ўстанавіць больш высокія цэны на каву.

Лацінаамерыканскія экспарцёры лічаць, што цэны на каву зніжаны ў выніку розных спекуляцый на біржы.

## ЯКІЯ БРАТЫ Ў АДНОЙ СЯМ'І?

*"Вядома, што беларусы разам з рускімі і ўкраінцамі адносяцца да адной моўнай сям'і — славянскай. А да якой моўнай сям'і належаць нашы суседзі — літоўцы і латышы, а таксама іншыя народы былога Саюза?*

Кацярына МІСЕВІЧ,
Ганцавіцкі раён".

Ёсць такая моўная група — балтыйская, да яе і належаць латышы і літоўцы. А суседзі нашых суседзяў — эстонцы — адносяцца да фіна-угорскай сям'і. Да яе належаць таксама мардва, удмурты і марыйцы. Узбекі, казахі, азербайджанцы, татары, туркмены, кіргізы, башкіры складаюць цюркскую моўную сям'ю, грузіны, народнасці Дагестана, чачэнцы — каўказскую, армяне — армянскую, немцы і яўрэі — германскую, таджыкі і асеціны — іранскую.

Групе славянскіх моў, якія бяруць пачатак з праславянскай мовы і адносяцца да індаеўрапейскай сям'і, адпавядаюць 12 нацыянальных літаратурных моў. Акрамя ўсходнеславянскіх (руская, беларуская, украінская), у сям'ю ўваходзяць таксама балгарская, сербска-харвацкая, македонская, славенская, польская, славацкая і чэшская мовы.

## НА ФРАНЦУЗСКАЙ ВУЛІЦЫ Ў ГРОДНА

*Гродна мае тры гарады-пабрацімы: Беласток — у Польшчы, Міндэн — у Германіі і Лімож — у Францыі. У гонар Ліможа названа нават вуліца ў буйным мікрараёне "Дзевятоўка".*

Чарговая сустрэча беларускіх і французскіх падлеткаў адбылася ў Гродна, куды прыбылі 30 вучняў і 5 настаўнікаў з французскага горада-пабраціма. Віталі гасцей у гродзенскіх СШ № 8, 9 і 25, былі падрыхтаваны розныя цікавыя мерапрыемствы і экскурсіі.

## ШТО ХУТЧЭЙ: МАТАРОЛЕР ЦІ КАРТЫНГ?

У Слоніме ля гатэля "Шчара" прайшла выстава юных тэхнікаў горада. Сярод іх работ — спартыўны аўтамабіль, мапед, матаролер, мікраматацыкл, шматлікія радыёпрыстасаванні. Прадэманстравалі гледачам сваё ўменне і авіямадэлісты, адбыліся спаборніцтвы картынгістаў.

## Смеласць гарады бярэ

*Але на гэта, лічыць 27-гадовы віцяблянін Валерый Ганчарэнка, патрабуюцца немалыя грошы. Задуманы ім велапрабег ад горада на Дзвіне да горада Ном у ЗША (на Алясцы) павінен каштаваць 40—50 мільёнаў беларускіх рублёў.*

Зразумела, такіх грошай у веласіпедыста няма, таму ён звярнуўся да спонсараў, да тых, хто жадаў бы рэкламаваць сваю прадукцыю ва ўсіх краінах СНД і ў Паўночнай Амерыцы.

Ці атрымаецца падарожжа на трасе больш як 12 тысяч кіламетраў — невядома.



Упраўленнем крымінальнага вышуку УУС Мінгарвыканкама адшукваецца прапаўшы без вестак малалетні АКУЛІК Кірыл, 1983 года нараджэння, што пражываў у г.Мінску па вул.Р.Люксембург, дом 90 "А", кв. 41, вучань 4-га класа СШ № 101, які 5.04.1995 г. каля 11 гадзін пайшоў з дому і не вярнуўся.

Прыкметы дзіцяці: на выгляд 11 гадоў, хударлявага целаскладу, рост 145 см, валасы цёмнарусыя хвалістыя, каротка падстрыжаныя, твар авальны.

Быў апрануты ў сінюю шапачку-"бейсболку", куртачку з плашчовай тканіны бэжавага колеру з белым футравым каўняром, сінія штаны ў белую палоску, чырвоныя красоўкі.



Паводле слоў відавочцаў, хлопчыка павёў мужчына на выгляд 28—32 гадоў, хударлявага целаскладу, рост каля 175 см, валасы кароткія, цёмныя.

Асаблівая прыкмета: на твары, ля вока, свежы шрам шырынёй прыкладна 2 мм, даўжынёй каля 3 см, са слядамі нядаўна знятых швоў.

Быў апрануты ў пацёртую куртку светла-карычневага колеру на запінках і на маланцы, шэрыя штаны, чорныя чаравікі.

Просім грамадзян, якія бачылі або ведаюць што-небудзь аб месцазнаходжанні ўказаных асоб, паведаміць па тэлефонах: 56-47-69, 20-21-09, 20-55-36 або 02.

*Навука ўважліва і дакладна аналізуе і даследуе перавагі аднаго полу перад другім. Вось да якіх высноў прыйшлі вучоныя, якія правялі параўнанне жанчын і мужчын па некаторых параметрах.*

## У КАГО МАЦНЕЙШАЕ ЗДАРОЎЕ?

Пачынаючы з моманту зачацця, дзяўчынкі больш жыццядольныя, чым хлопчыкі. Пасля хваробы жанчыны таксама хутчэй устаюць на ногі. Яны радзей бяруць бальнічныя, як сведчыць даследаванне, праведзенае ў Англіі, адсутнічаюць на рабоце па прычыне хваробы 7 дзён, а мужчыны — 12 дзён у год. І, нарэшце, жанчыны жывуць на 7 гадоў больш.

## Ветэран чытае пра сябе

*Кожны ветэран вайны — жыхар Гродна, які атрымліваў юбілейны медаль да свята Перамогі, у дадатак меў добра ілюстраваную кнігу "Гродна ў гады вайны 1941—1945 гадоў".*

Кніга была зроблена дзякуючы намаганням навукоўцаў з кафедры гісторыі Беларусі Гродзенскага дзяржуніверсітэта і выдадзена накладам у 7 тысяч асобнікаў. На старонках кнігі змешчаны прозвішчы усіх тых, хто ўдзельнічаў у вызваленні Гродна.

Юрый АЛЯКСЕЕЎ.

91

*Цяперашні год аб'яўлены Годам аховы навакольнага асяроддзя. У рамках рэспубліканскай экалагічнай акцыі "Дзень зямлі" ў віцебскай сярэдняй школе № 6 прайшло экалагічнае свята.*

*У яго праграме былі сустрэчы з матухнай-Прыродай і царом Берандзеем, выступленні юных танцораў і спевакоў, гульні, экалагічныя віктарыны, спаборніцтвы.*

*На здымку: удзельніца свята важатая школы Алена БЕЛЯНІЦКАЯ.*

**Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛІНФАРМ.**

## СПОРТ

*У сталічным спарткомплексе "Спартак" адбылося адкрытае першынство беларускай асацыяцыі "Акінава Годзю-Ру каратэ-до" сярод спартсменаў дзіцячага і юнацкага ўзросту. У ім прынялі ўдзел каля 200 юных барцоў з клубных каманд Беларусі, Літвы, Эстоніі.*

**ГАНДБОЛ.** "Позняй перамогай" можна назваць поспех нашай зборнай на чэмпіянаце свету па гандболе ў Ісландыі. У матчы з камандай гаспадароў беларусы перамаглі з лікам 28:23. Поспех, здавалася б, у наяўнасці. Аднак радасці ад яго мала. Цяпер яны атрымалі магчымасць змагацца толькі за 9-12 месцы.

Хоць, на думку спецыялістаў, састаў нашай каманды быў як ніколі моцны. Яе галоўны трэнер Спартак Міравовіч змог сабраць пад сцяг зборнай самых выдатных ігракоў, якія выступаюць цяпер у розных замежных клубах. Але ўжо два пройгрышы на старце паказалі, што "ў гандбольнай сям'і" не ўсё добра, асабліва ў абароне, якая дапускала часам недаравальныя памылкі. І цяпер, якое б месца мы ні занялі на чэмпіянаце, галоўная страта ў тым, што каманда пазбавілася пуцёўкі на алімпіяду ў Атланце.

**САМБА.** У мінскім Палацы спорту 19 мая пачынаецца чэмпіянат Еўропы па барацьбе самба. Спаборнічаць будуць атлеты больш чым дваццаці краін блізкага і далёкага замежжа, у тым ліку Германіі, Італіі, Швецыі, Бельгіі, Галандыі... Сярод іх неаднаразовыя ўладальнікі самых высокіх тытулаў расіяне Мікалай Ігрушкін і Аляксандр Дунаеў, прадстаўнікі Беларусі Яўген Далінін, Мікалай Цыпандзін, Уладзімір Емяльянаў, Таццяна Масквіна і Вераніка Казлоўская. Спаборніцтвы пройдуць па трох групах — дарослыя, юнакі і юніёры. Чэмпіянат закончыцца 21 мая.

**БАДМІНТОН.** Сярод амаль ста каманд, якія ўдзельнічаюць у чэмпіянаце свету па бадмінтоне, што пачаўся ў Швейцарыі, за ўзнагароды будуць змагацца і нашы майстры валана. У складзе нацыянальнай зборнай рэспублікі Віталь Шмакаў, Міхаіл Коршук, Вячаслаў Рудніцкі, Улада Чарняўская, Таццяна Герасімовіч і Вольга Ільюшчанкова. Гэта вельмі вопытныя спартсмены, а таму будзем чакаць іх з узнагародамі.

**ВОЛЬНАЯ БАРАЦЬБА.** Шостае з трыццаці трох каманднае месца — такі вынік выступлення беларускіх барцоў вольнага стылю на праведзеным чэмпіянаце Еўропы. Аднак у асабістым заліку толькі гамяльчанін Сяргей Смаль /62 кг/ змог заваяваць бронзавую ўзнагароду. Чацвёртым быў суперцяжкаатлет з Мінска Аляксей Мядзведзеў. "Нашы хлопцы, асабліва моладзь, не вытрымалі псіхалагічнага прэса, звязанага з даволі вострай канкурэнцыяй, — адзначыў галоўны трэнер зборнай Валянцін Мурзянко.— А таму да наступных адказных спаборніцтваў перад Алімпійскімі гульнямі абавязкова зробім на гэта папраўку".

**БЕЛІНФАРМ.**

# ГАЛОЎНАЕ — ДОБРАЯ РЭКЛАМА

***Не ўсе ведаюць пра справы калгаса імя Леніна, што на Слонімшчыне, таму і вырашыў кіраўнік калгаса ліквідаваць гэты недахоп і напісаў кнігу з паэтычнай, хаця і прыдуманай ужо да яго, назвай — "Зямля пад белымі крыламі".***

У ёй аўтар вядзе гаворку і пра людзей, якія працуюць у калгасе, і пра прыгожыя мясціны наваколля. Выйшла кніга ў Мінску накладам у 1000 асобнікаў на рускай і беларускай мовах, аздоблена добрымі каляровымі здымкамі і ілюстрацыямі.

# І ЎСЁ Ж ЛЕПШ НЕ ХВАРЭЦЬ

***Першых пацыентаў прыняла ў Жлобіне новая чыгуначная паліклініка. Па сутнасці, гэта дыягнастычны цэнтр, абсталяваны па апошняму слову тэхнікі. Амаль усё медыцынскае абсталяванне для паліклінікі было закуплена ў ЗША.***

Прыём тут будзе весціся ў дзве змены, кожная з якіх здольна абслугоўваць 250 пацыентаў.

У Жлобіне сёння таксама дзейнічае раённая паліклініка. Такую ж медустанову будуюць сабе і жлобінскія металургі. Так што, палячыцца ёсць дзе, і ўсё ж лепш не хварэць.

## НЕСЛУХАЎ — З ПОЛЯ!

***Трэнер баскетбольнай каманды "San Antonio Spurs" не церпіць непаслухмянасці нават ад зорак.***

Так, Дэніс Родман праігнараваў заўвагу трэнера ў час перапынку, за што Боб Хіл пасадзіў яго на штрафную лаўку. У выніку чаго каманда стала слабейшай і прайграла. Але трэнер застаўся задаволены: "Дысцыпліна — перш за ўсё!"

## МІЛАСЕРЫЯЛ "THE BLACK CROWES"

***Група "The Black Crowes" вырашыла дапамагчы ахвярам трагедыі ў штаце Аклахома (ЗША), якая прынесла няшчасце многім людзям.***

"The Black Crowes" дала канцэрт, грошы ад якога пайшлі на дапамогу людзям. Гэты ўчынак быў высока ацэнены ў музычным свеце.

## ПЕРШАЯ АТАКА ХАЛЕРЫ НА БЕЛАРУСЬ АДБІТА

***Паведамленні інфармацыйных агенцтваў прынеслі трывожныя весткі з Украіны: там зноў абвастрылася эпідэміялагічная сітуацыя. Цяпер у суседняй рэспубліцы больш за 160 чалавек захварэлі на халеру, і колькасць інфіцыраваных павялічваецца кожныя суткі.***

Не абышла бокам страшная хвароба і Беларусь. Як паведаміў галоўны эпідэміёлаг рэспублікі Анатоль Кажамякін, цяпер становішча нармалізавалася.

Дзякуючы намаганням урачоў Мінскай гарадской інфекцыйнай бальніцы жыццю шпіталізаванага каля дзесяці дзён таму грамадзяніна Індыі нічога не пагражае, лячэнне практычна закончана. Днямі былі выпісаны з бальніцы і людзі, якія кантактавалі з хворым. Халерай, на шчасце, яны не заразіліся.

Тым не менш, супакойвацца рана: сітуацыя можа змяніцца ў любы момант. 4 ліпеня адбылося пасяджэнне калегіі Міністэрства аховы здароўя рэспублікі, на якім яшчэ раз былі ўзняты пытанні прафілактыкі халеры. Акрамя гэтага, праводзяцца пастаянныя лабараторныя даследаванні проб з вадаёмаў і рэк рэспублікі.

## КАГО СКАРАЧАЕШ?

***У вымушаныя водпускі пайшлі ўсе медыцынскія сёстры міласэрнасці Магілёўскага абласнога таварыства Чырвонага Крыжа, а гэта больш як 50 чалавек.***

Прычына ў наш час даволі распаўсюджаная: няма грошай для выплаты іх больш чым сціплай зарплаты. У маі з той жа прычыны таварыству прыйшлося скараціць 17 штатных адзінак. У выніку практычна без догляду засталіся тысячы адзінокіх хворых людзей, якім аказвалі дапамогу магілёўскія сёстры міласэрнасці.

### *ЧАРОЎНАЯ ВАКЦЫНА*

Як вядома, у 1988 годзе Сусветная арганізацыя аховы здароўя ўзяла на сябе абавязак па ліквідацыі поліяміліту да 2000 года.

Для гэтай мэты вакцынацыю супраць поліяміліту дзецям неабходна рабіць з 3-х месяцаў трохразова з інтэрваламі паміж прышчэпкамі 1,5 месяца. Затым праводзяць рэвакцынацыю ў 18 месяцаў, 2, 7 і 14 гадоў.

Як паведаміла нам загадчыца супрацьэпідэміялагічным аддзяленнем Святлана Крэтава, у Мінску ў мінулым годзе вакцынацыя дзяцей да 1 года склала толькі 80, 2 працэнта.

### *АСЦЯРОЖНА, ХВОРЫЯ БАДЗЯГІ*

Колькасць бадзяг у Мінску павялічваецца. Гэта, у асноўным, людзі 40—60 гадоў, якія пакутуюць на хранічны алкагалізм, псіхічныя захворванні і хваробы, якія спадарожнічаюць ім: кароста, туберкулёз.

— Гэта вельмі трывожна, — паведамілі ў цэнтры дэзінфекцыі, — таму што бадзягі з'яўляюцца на вуліцах, у транспарце, дзе шмат людзей. І небяспека захворванняў ад гэтага павялічваецца. Бо калі ў 1994 годзе быў саніраваны 101 чалавек, то за 4 месяцы гэтага года — ужо 205 чалавек.

### *АДНАРАЗОВЫЯ ШПРЫЦЫ І ІНШАЕ*

Да пачатку восені ў Беларусі будзе праходзіць акцыя Нямецкага і Беларускага Чырвонага Крыжа сумесна з Міністэрствам Беларусі па вакцынацыі 30 працэнтаў насельніцтва рэспублікі супраць распаўсюджвання адзёру, дыфтэрыі, слупняку.

— Аказаць дапамогу Беларусі нам даручыла Еўрапейская камісія гуманітарнай дапамогі, — сказаў старшыня нямецкага Чырвонага Крыжа Пітэр Клаўс Эні, — для гэтага яна выдзеліла 1 млн. 200 тысяч нямецкіх марак. На гэтыя грошы мы закупілі 2 мільёны аднаразовых шпрыцоў, тэрмометраў, тэрмаіндыкатараў, 1000 тэрмасумак і 5 тысяч халадзільных тэрмаэлементаў, у якіх захоўваецца вакцына.

— Гэта акцыя, — каменціруе галоўны спецыяліст Беларускага Рэспубліканскага камітэта грамадства Чырвонага Крыжа Сяргей Юрлоў, — выклікана цяжкім становішчам у рэспубліцы, ростам інфекцыйных захворванняў.

### *ЭКАЛОГІЯ НАРАЧЫ*

На возеры Нарач прайшоў навукова-практычны семінар «Нарач — экалогія сёння і заўтра». Яе арганізатары — Беларуская інжынерная акадэмія, Мінскі абласны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі, Мядзельскі райвыканкам, Фонд імя Фрыдрыха Эберта, рэдакцыя Рэспубліканскай газеты «Ваша здароўе».

На семінар сабраліся спецыялісты і вучоныя зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў рэспублікі, якія разгледзелі экалагічныя, санітарна-гігіенічныя праблемы, жамчужыны адпачынку і лячэння рэспублікі — нарачанскай курортнай зоны. Усе даклады маюць практычны характар і потым увойдуць у спецыяльны зборнік рэкамендацый, што дапамогуць зрабіць зону адпачынку яшчэ больш прывабнай.

## СЦЕРАГУЦЦА ЛІХАМАНКІ

***На Гомельшчыне забаронены ўсе т… паездкі і абмежаваны камандзіроўкі ў Анго… Конга, Судан і іншыя афрыканскія краін…***

Гэта звязана са з'яўленнем у гэтым р… бяспечнай хваробы, якая атрыма… "ліхаманка Эбала". Па той жа прычыне… ны і чартэрныя паветраныя рэйсы ў … Заір.

## ЯПОНІЯ — У СТРА…

***У бальніцы Японіі з прыкметамі … ядавітымі газамі трапілі 6 чалаве…***

У горадзе Ёкахама таксама ёсц… насельніцтва на галаўны боль і дра… адчуванне. Паліцыя падазрае, што… зноў правялі акцыю, падобную да … метро. Пасля здарэння ў Токіо жых… знаходзяцца ў пастаянным страху.

## САМАЛЯЧЭННЕ

***Статысты падлічылі, што ўрачы ў 5 ра… часцей карыстаюцца медыкаментамі, чым … татняе насельніцтва.***

Прычынай з'яўляецца высокая нагрузка… рабоце.

# ТАКОЕ ВОСЬ БЯСПЛАТНАЕ ЛЯЧЭННЕ

*Практычна бездапаможнай стала медыцына Віцебскай вобласці. Асабліва пагоршылася становішча ў апошнія два месяцы. Не выключэннем сталі выпадкі, калі ў бальніцах з-за адсутнасці антыбіётыкаў і абязбольваючых сродкаў паміраюць людзі. Адным з такіх аказаўся малады мужчына з Оршы, у якога засталося трое дзяцей.*

У палатах няма прасцін, адсутнічаюць перавязачныя сродкі, донарская кроў, плазма і кровазамяніцелі. Стала немагчымым рабіць і экстранныя аперацыі, бо нечым зрабіць наркоз. І гэта, калі толькі ў 3-ю гарадскую бальніцу ў аддзяленні хірургіі, траўматалогіі, гінекалогіі і апёкавы цэнтр штодзённа паступаюць па 40 і больш тэрміновых хворых.

Толькі за год бальніца за медыкаменты, мыццё бялізны завінавацілася 1 мільярд 115 мільёнаў рублёў. З 5 сакавіка медыкі так і не атрымалі зарплаты. Плаціць няма чым, і гарвыканкам заклікаў сабраць сродкі для выплаты зарплаты з усяго раёна, дзе знаходзіцца 3-я бальніца. Каля 500 мільёнаў знайшлося, а вось для ўсёй аховы здароўя горада пытанне застаецца адкрытым. Бо патрабуюцца 3 мільярды 861 мільён рублёў.

Праўда, Кабінет Міністраў у асобе М.Чыгіра падпісаў паперу на выдзяленне віцебскім медыкам 4 мільярдаў рублёў крэдыту. Але грошай да гэтага часу няма. Затое ў горад едзе чарговая камісія з праверкай работы бальніц. Магчыма, яна там яшчэ застане праапераванага прафесара медінстытута, якому нават калегі не могуць дапамагчы набыць моцныя антыбіётыкі шырокага спектра дзеяння, адна ўпакоўка якіх каштуе 221 тысячу рублёў, а на тыдзень лячэння сума пацягне на мільёны.

# БАМОНД "У МАЙСТРА"

*Вечарыны ў стылі бамонду сталі традыцыйнымі пад час адкрыцця выстаўкі ў гродзенскай галерэі "У майстра". Тут з задавальненнем збіраюцца вядомыя ў горадзе творчыя асобы і каб паглядзець новую экспазіцыю, і каб проста пабачыцца.*

"Букет" мастацкай публікі сабрала і выстаўка маладога мастака Сяргея Асапрылка. Яго творы, якія ўжо пабывалі ў многіх краінах Еўропы і аднесены замежнымі крытыкамі да бяручага пачатак у пасляваенных ЗША цячэння мінімал-арт, знайшлі прыхільнікаў і сярод землякоў.

З поспехам аўтара павіншавалі яго калегі і сябры — выкладчык Гродзенскага універсітэта Ларыса Гусакоўская і яе нядаўні калега, зараз жыхар Бостана Барыс Клейн, а таксама абаяльная гаспадыня галерэі Алена Пілічава.

**Лілія АСТРАВЕЦКАЯ.**

# НОВЫЯ ПРАЕКТЫ "КРАМЫ"

*9 чэрвеня ў мінскім Альтэрнатыўным тэатры адбудзецца імпрэза-прэзентацыя новых музычных праектаў папулярнага ў краіне рок-гурта "Крама".*

Беларускамоўная каманда прадставіць на суд гледача сонгі з праграм "Крама-Камендант" і "Лянівыя танцы".

# ЧАРГА НА КВАТЭРУ. ХТО АПОШНІ?

*Чарга ў Гродна на атрыманне жылля складала ў красавіку лічбу ў 32 тысячы сем'яў і мае тэндэнцыю да павелічэння. Напрыклад, у мінулым годзе гарвыканкам знайшоў магчымасць выдзеліць кватэры толькі для 16 сем'яў гарадзенцаў, якія стаяць у чэргах — дзяржаўнай і кааператыўнай. І гэта з улікам ільготнай чаргі, дзе зараз знаходзіцца 3 тысячы чалавек.*

Значную палёгку маглі б прынесці для горада 27 жыллёвых кааператываў, якія распачалі будаўніцтва шматкватэрных дамоў, нават зрабілі ўжо "каробкі". Але — няма грошай, і будоўля "замарудзілася. А калі б толькі гэтыя 27 кааператываў здолелі закончыць будаўніцтва — адразу 1850 сем'яў жыхароў Гродна згулялі б наваселле, і чарга б паменшылася.

# ГАЗЕТА ВАСЬМІ РАЁНАЎ У МАЛАДЗЕЧНА

*У Маладзечна пачала выходзіць новая газета.*

Інфармацыйна-рэкламнае выданне пад назвай "Рэгіянальная газета" разлічана на чытачоў раёнаў, якія ўваходзяць у Маладзечанскі рэгіён. Гэта Маладзечанскі, Вілейскі, Смаргонскі, Ашмянскі, Валожынскі, Мядзельскі, Астравецкі, Мінскі раёны. З першых нумароў газета знайшла сваіх прыхільнікаў. Яна не толькі распаўсюджваецца ў гэтых раёнах, а ўжо займела сваіх падпісчыкаў. Гэта выданне знаёміць чытачоў з цікавымі навінамі суседніх раёнаў, друкуе аб'явы, рэкламу.

Выходзіць на роднай мове раз у тыдзень на 4-х палосах і мае ўжо наклад першых двух нумароў у 10 000 асобнікаў.

Мяркуецца ў далейшым выдаваць газету два разы на тыдзень на 8 палосах.

Поспеху табе, "Рэгіяналка"!

# СУРОВЫЯ ЛІЧБЫ

Рэзкае пагаршэнне здароўя школьнікаў на Брэстчыне становіцца адной з самых трывожных сацыяльных праблем. Так, паводле звестак медыкаў, за апошнія паўтара дзесятка гадоў колькасць вучняў з захворваннямі печані і нырак павялічылася ў чатыры разы, сардэчна-сасудзістай сістэмы — у 6,3 раза, крыві — амаль у 13 разоў. Прычыны такой катас[т]рафічнай сітуацыі спецыялісты бачаць не толькі ў выніках Чарнобыля (на забруджанай радыенуклідамі тэрыторыі ў вобласці пражывае 57 тысяч дзяцей і падлеткаў), але і ў недастатковай увазе да фізкультуры і спорту, у харчаванні школьнікаў, якое значна пагоршылася.

# ХТО БАІЦЦА СНІДу?

*"У нашай краіне вельмі ма[ла] ўвагі, на мой погляд, удзяляе[цца] барацьбе са СНІДам. Пашум[елі], пагаварылі і заціхлі. А на сё[н]няшні дзень адзінае лякарства [ад] гэтай хваробы — прафілактыка. [Ці] ёсць у Мінску такая арганізацыя, якая вя[дзе] работу на прафілактыцы СНІДу?*

**М.І.ПЯТРОЎ, г.Мін[ск]**

Вы, безумоўна, маеце рацыю, паважаны с[па]дар Пятроў.

На жаль, яшчэ па сённяшні дзень вучо[ныя] не ведаюць лекаў супраць гэтай жудаснай х[ва]робы. І каб папярэдзіць людзей, мы пав[інны] напамінаць ім пра тое, што СНІД існуе.

Менавіта з гэтай мэтай у 1990 годзе быў ст[вораны] рэспубліканскі цэнтр прафілакт[ыкі] СНІДу. Ён знаходзіцца па адрасу: вуліца Ул[ья]наўская, 3. У цэнтры працуе эпідэміялагі[чнае] аддзел, амбулаторыя і лабараторыя. Це[нтр] займаецца прафілактыкай хваробы. Тут таксама можна ананімна прайсці абследаванне, атрымаць кансультацыю ўрача.

94

## СВЕТ АПРАНЕМ У КАШУЛІ

*Прадукцыю Аршанскага льнокамбіната ведаюць у свеце. Тэкстыльшчыкі вырашылі павялічыць яе аб'ём, у тым ліку і швейных вырабаў. На прадпрыемстве створана яшчэ адна швейная фабрыка. Яна выпускае жаночыя касцюмы, мужчынскія кашулі і іншую прадукцыю.*

Адкрыццё новага прадпрыемства дае магчымасць прадаставіць рабочыя месцы маладым спецыялістам — выпускнікам навучальных устаноў нашай рэспублікі, якія рыхтуюць кадры для швейнай і тэкстыльнай прамысловасці.

## ЗАЗВІНЯЦЬ ЦЫМБАЛЫ...

*Віцебскі ансамбль цымбалістак "Расіца" вярнуўся з Міжнароднага фестывалю выканаўцаў, што іграюць на народных інструментах.*

Фестываль, на які з'ехаліся з усіх куткоў СНД, быў прысвечаны 50-годдзю Вялікай Перамогі.

Кампетэнтнае журы вызначыла пераможцаў. Віцебскім цымбалісткам было прысуджана І месца і прадастаўлена права ўдзельнічаць у святочным канцэрце 9 мая.

Яўгенія ВІЦЬБА.

## КОЛЬКІ ЖЫХАРОЎ У БЕЛАРУСІ?

*У Міністэрстве статыстыкі і аналізу паведамілі, што насельніцтва рэспублікі зменшылася за год на 22 тысячы чалавек і склала 10 мільёна 297 тысяч. 69 працэнта з іх цяпер пражываюць у гарадах і гарадскіх пасёлках, а 31 працэнт – у сельскай мясцовасці.*

У Мінску налічваецца 1 мільён 694 тысячы чалавек. Самыя населеныя гарады — у Мінскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях. Менш за ўсё гарадскіх жыхароў на Гродзеншчыне. Што датычыць сельскага насельніцтва, то яго больш за ўсё ў Мінскай і Брэсцкай абласцях. Менш за ўсё вяскоўцаў на Магілёўшчыне і Гродзеншчыне.

БЕЛІНФАРМ.

## ПРЭЗІДЭНТ НАВЕДАЎ ГРОДЗЕНШЧЫНУ

*Рэспубліканскі семінар "Кормавытворчасць. Апрацоўка, вытворчасць і перапрацоўка цукровых буракоў" адбыўся на Гродзеншчыне. У падвядзенні яго вынікаў прыняў удзел Прэзідэнт А.Р.Лукашэнка.*

У семінары таксама ўдзельнічалі намеснік прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь У.Гаркун, міністр сельскай гаспадаркі В.Лявонаў, старшыня Нацыянальнага банка С.Багданкевіч, старшыні абласных, гарадскіх і раённых выканкамаў рэспублікі.

Удзельнікі нарады наведалі сельскагаспадарчыя калектыўныя прадпрыемствы "Абухава", "Прагрэс", "Кастрычнік" Гродзенскага раёна.

Пад час свайго выступлення А.Р.Лукашэнка закрануў шматлікія праблемы эканамічнага і палітычнага жыцця Беларусі. Прэзідэнт сустрэўся таксама з працоўнымі Гродзеншчыны і адказаў на іх пытанні.

## РАСТУЦЬ ВЫДАТКІ – ЗМЯНШАЮЦЦА ДАХОДЫ

*Прадаўжэнне росту выдаткаў вытворчасці і абварачэння прыводзіць да росту цэн на прадукцыю прадпрыемстваў рэспублікі. У выніку ўсё цяжэй збываць і папаўняць за кошт рэалізацыі абаротныя сродкі. Адсюль цяжкае фінансавае становішча вялікай колькасці калектываў, калі людзям няма чым нават плаціць за працу.*

Паводле даных статыстыкі, цяпер у рэспубліцы налічваецца каля дзвюх тысяч стратных прадпрыемстваў, ці 24 працэнты іх агульнай колькасці. У прамысловасці доля стратных прадпрыемстваў склала 10,8 працэнта, у будаўніцтве — 21,6, гандлі і грамадскім харчаванні — 51, жыллёва-камунальнай гаспадарцы — 61 працэнт.

Накопленая дэбіторская запазычанасць на 1 сакавіка гэтага года склала 21,2 трыльёна рублёў і крэдыторская — 25,9 трыльёна. Сумарны аб'ём запазычанасці больш чым у 2 разы перавышае даходную частку кансалідаванага бюджэту на ўвесь бягучы год. У выніку працягваецца зніжэнне жыццёвага ўзроўню насельніцтва. Рэальныя яго даходы за першы квартал скараціліся на 33 працэнты.

## СЛУЦКАЯ ЭКАНОМІКА

*Падаражаў праезд у гарадскіх аўтобусах у Слуцку: раней талон каштаваў 300 рублёў, цяпер — 500. Дагналі ўсё ж сучаснае сталіцу.*

Праўда, ёсць і прыемная навіна: масла ў Слуцку стала таннейшае — з 22 тысяч рублёў да 18 тысяч за кілаграм.

Але гэта мала каго радуе, бо многія прадпрыемствы горада спыніліся, а на тых, якія працуюць, рабочыя атрымліваюць зарплату па 200—500 тысяч рублёў. Не надта раскашэлішся і на таннае масла.

## ПОМНЯЦЬ

*Каля 400 ураджэнцаў Жлобіншчыны прайшлі праз пекла афганскай вайны. Шаснаццаці з іх не суджана было вярнуцца дамоў жывымі.*

З мэтай ушанавання імёнаў загінуўшых землякоў у свой час па ініцыятыве жлобінскага гарадскога клуба былых воінаў-інтэрнацыяналістаў "Абавязак" і быў устаноўлены Дзень памяці, які быў адзначаны і сёлета. Прыйшлі былыя воіны, іх родныя і блізкія, усклалі вянкі і кветкі на Цэнтральнай плошчы горада ля абеліска воінам-вызваліцелям, наведалі месцы пахаванняў загінуўшых "афганцаў".

## ПАСЛУХАЦЬ СЛОВА БОЖАЕ

*Чацвёрты год пры Жлобінскай праваслаўнай Свята-Троіцкай царкве дзейнічае дзіцячая нядзельная школа. Зараз тут Слова Божае вывучаюць дзвесце дзяцей.*

А нядаўна пры царкве пачала дзейнічаць нядзельная школа і для дарослых. Заняткі, якія наведваюць некалькі дзесяткаў чалавек, праводзяцца пакуль у форме лекцый і дыскусій.

95

## Даходы...

*У красавіку гэтага года самая высокая з трох краін Балтыі мінімальная заработная плата была ў Латвіі — 55,12 даляра ЗША, самая нізкая — 25 даляраў — у Літве. У Эстоніі мінімальная зарплата склала 40,60 даляра ЗША. Ва ўсіх трох балтыйскіх краінах, у параўнанні з сакавіком, мінімальная заработная плата засталася на ранейшым узроўні. Аб гэтым сведчаць даныя Дэпартамента статыстыкі Літвы.*

Налічаная сярэдняя зарплата ў красавіку ў Латвіі была 186,65 даляра ЗША /у параўнанні з сакавіком вырасла на 0,7 працэнта/, у Літве ўсяго 120,21 даляра ЗША, яе рост, у параўнанні з сакавіком, склаў 6,5 працэнта.

Сярэдняя пенсія па старасці ў красавіку ў Латвіі дасягнула 59,98 даляра ЗША. У Эстоніі ў першым квартале гэтага года сярэдняя пенсія па старасці была 48,99 даляра ЗША, што на 3 працэнты больш, чым у чацвёртым квартале мінулага года. У Літве ў першым квартале бягучага года сярэдняя пенсія па старасці была ўсяго 31,37 даляра ЗША, праўда, гэта на 22,8 працэнта больш, чым год таму.

## МУЗЕЙ-СЯДЗІБА РЭПІНА

***"Хацелася б ведаць: ці ёсць у Мінску або Мінскай вобласці музей мастака Ільі Рэпіна?***

**Сярожа АЎСЕЕЎ, г.Гомель".**

**Такі музей ёсць на Віцебшчыне, музей-сядзіба. У ім сабраныя літаратура і матэрыялы, звязаныя з жыццём і творчасцю мастака, а таксама прадметы інтэр'еру і быту канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Калі вы жадаеце наведаць мясціны, якія натхнялі вялікага рускага мастака, вам трэба ехаць у Віцебск. З Віцебска да музея "Пенаты" можна даехаць ад аўтастанцыі "Смаленскі рынак".**

**На жаль, у мінулым годзе на сядзібе здарыўся пажар, і цяпер музей моцна пашкоджаны. Але, будзем спадзявацца, што агульнымі сіламі ён будзе адноўлены.**

**Музей запрашае ўсіх жадаючых да супрацоўніцтва і будзе вельмі ўдзячны за дапамогу.**

## "А Ў МЯНЕ ТАКАЯ ПРАБЛЕМА..."

***"Я нядаўна ажаніўся. Жонку сваю кахаю, але ў нас узніклі праблемы інтымнага характару. Нам неабходна дапамога сексолага, а ў вёсцы, як вядома, яго няма. Парайце, што нам рабіць?***

**П.С., Барысаўскі раён".**

**Калі вам неабходна дапамога сексолага, звяртайцеся па адрасу: г.Мінск, вул.Чырвоная, 2. Тэлефоны: 36-64-11, 36-62-33.**

**У цэнтры працуюць два ўрачы-сексапатолагі і два сексолага-кансультанты, якія дапамогуць вам вырашыць усе вашы інтымныя праблемы. Кансультацыі і лячэнне праводзяцца ананімна.**

## Рэктар не забывае пра сябе

***Самая чытаемая ў Літве газета "Летувас рытас" выступіла з сенсацыйным паведамленнем.***

У артыкуле "Той, хто прасіць дапамогі навукі, не забывае і сябе" прыводзяцца факты, выкрытыя нядаўна органамі дзяржаўнага кантролю, якія сведчаць аб тым, што цяперашні рэктар Вільнюскага універсітэта Раландас Павіленіс змог прыватызаваць рэзідэнцыю рэктараў універсітэта, размешчаную ў памяшканнях гэтай навучальнай установы. Шыкоўную пяціпакаёвую кватэру ён купіў за 200 даляраў, а ўласны стары аўтамабіль ВАЗ-2104 прадаў універсітэту за 400 даляраў.

Сам рэктар лічыць, што гэта публікацыя, як, зрэшты, і сама праверка, — помста за яго падтрымку тых людзей, якія не схільны прызнаваць дыпломы вышэйшых партыйных школ, у тым ліку і Акадэміі грамадскіх навук.

## Інфляцыя...

***Паводле даных Дэпартамента статыстыкі Літвы, у красавіку інфляцыя ў рэспубліцы была такая ж, як і ў сакавіку, і склала 1,4 працэнта. Самая нізкая інфляцыя ў красавіку сярод балтыйскіх краін была ў Эстоніі — 1 працэнт. У Латвіі інфляцыя 1,9 працэнта.***

З красавіка мінулага года па красавік бягучага ў Літве інфляцыя вырасла на 44,9 у Латвіі — на 25,7, у Эстоніі — на 25,3 працэнта. У Літве, як і ва ўсіх іншых суседніх дзяржавах, у красавіку прамысловай прадукцыі было прададзена менш, чым у сакавіку на 5,8 працэнта, у Латвіі — на 18,5, у Эстоніі — на 8,1 працэнта. Абарот рознічнага гандлю ў супастаўных цэнах у красавіку ў параўнанні з сакавіком-ва ўсіх краінах, акрамя Эстоніі, таксама знізіўся. З трох краін Балтыі самая высокая зарплата і самыя вялікія пенсіі — у Латвіі.

## Беспрацоўе...

***Да канца красавіка гэтага года самы высокі ўзровень незанятасці насельніцтва з трох Балтыйскіх краін, зафіксаваны афіцыйна, назіраўся ў Латвіі — 6,5 працэнта. У Літве ён склаў 5,8 працэнта, у Эстоніі — 3,1 працэнта, паведаміў Дэпартамент статыстыкі Літвы.***

Самая вялікая колькасць непрацуючых і тых, хто шукае работу, у красавіку была ў Літве — 107900 чалавек. У параўнанні з сакавіком іх у рэспубліцы паявілічылася на 0,2 працэнта, а ў параўнанні з красавіком мінулага года — на 63,3 працэнта. У Латвіі ў красавіку бягучага года не працавалі 83,5 тысячы чалавек. У параўнанні з сакавіком іх стала на 2,5 працэнта менш, а калі супаставіць з мінулым годам, то колькасць непрацуючых зменшылася на 4,5 працэнта. У Эстоніі дапамогу па беспрацоўю ў красавіку атрымлівалі 16800 чалавек.

Злачынства 96.

**ІНФА-КРЫМ**

## АДКУЛЬ ФАЛЬШЫЎКІ?

Стодаляравыя фальшыўкі выяўлены ў Магілёве. А падкінулі іх два віцябчаніны. Прачытаўшы ў рэкламнай газеце аб тым, што магіляўчанін прадае за даляры відэамагнітафон, яны і нанеслі яму візіт дамоў. Легкавую аўтамашыну, на якой прыехалі, наўмысна паставілі за вугал, каб не было відаць. Для выгляду патаргаваліся з гаспадаром і далі яму тры купюры вартасцю па сто даляраў кожная. Калі развіталіся, то цікаўны магіляўчанін усё ж глянуў за вугал: на чым прыехалі госці. Заўважыў колер і марку аўтамашыны. Ну, а потым пачаў любавацца далярамі і знайшоў, што на ўсіх трох адзін і той жа нумар. Тут і радасць знікла. Але не разгубіўся, а хутчэй пабег у міліцыю з заявай.

Трэба аддаць належнае магілёўскім вартавым парадку, якія літаральна на працягу гадзіны па прыкметах маркі і колеру машыны затрымалі фальшываманетчыкаў. Цяпер ідзе высвятленне — адкуль падробкі?

## ПАМЕРАЎ — І ДРАПАНУЎ

*В.Галубіцкі, які раней неаднаразова быў асуджаны, на рынку ў Рагачове папрасіў у гандляра-прыватніка памераць красоўкі. Нацягнуў шыкоўны абутак на ногі, патупаў на месцы, як спартсмен перад забегам, і — драпануў.*

Далёка аматар лёгкай нажывы не ўцёк. А суд вызначыў яму чатыры гады зняволення. Куды яшчэ можна было забегчы ў крадзеным абутку?

**Васіль БАРХАНАЎ.**

## МІЛІЦЫЯ ПЕРАЎЗЫШЛА СЯБЕ

*4 ліпеня ў 15.40 у Фрунзенскі РАУС Мінска звярнуўся грамадзянін, які паведаміў, што 40 мінут таму на вуліцы Прытыцкага тры невядомыя пад выглядам абмену валюты заманілі яго ў аўтамашыну "Жыгулі", адвезлі на вуліцу Лынькова і, пагражаючы пісталетам, забралі 30 даляраў ЗША, 205 нямецкіх марак, 420 тысяч расійскіх рублёў і 840 тысяч беларускіх. Пасля чаго, зразумела, зніклі.*

Ужо праз 20 мінут пасля гэтай заявы патрульны нарад Цэнтральнага РАУС затрымаў на плошчы Бангалор машыну грабежнікаў. Праўда, знаходзіўся ў ёй толькі вадзіцель – 21-гадовы студэнт Беларускага аграрна-тэхнічнага універсітэта. Але пасля гэтага аператыўнікі без асаблівай цяжкасці затрымалі і астатніх членаў злачыннай шайкі, якія ў гэты час дзялілі здабычу ў інтэрнаце 7-й клінічнай бальніцы. Акрамя нарабаваных грошай, у іх быў канфіскаваны і газавы пісталет.

## ЧЫМ НАЙПРАСЦЕЙШЫ АЎТАМАБІЛЬ, ТЫМ МАЦНЕЙШЫ СОН

*Замежны дыпламатычны корпус у Варшаве трапіў у поле зроку "аўтаматараў". У адзін дзень пазбавіліся сваіх аўтамабіляў работнікі трох пасольстваў: угнаны "Аўдзі" пасла Расіі, "Форд" работніка пасольства Літвы і "Хонда" японскага дыпламата. Пакуль польская паліцыя не можа адказаць, дзе яны.*

Увогуле, як адзначае газета "Жычэ Варшавы", з пачатку гэтага года ў Варшаве і сталічным ваяводстве ўгнана 8012 аўтамабіляў, 553 з іх належалі іншаземцам.

**БЕЛІНФАРМ.**

## ЗНАХОДКА Ў ЛЕСЕ

*Леанід Казлоў, трактарыст Аляксандраўскага лесапункта Рэчыцкага раёна, зачапіў пальцам гусеніцы скрыню, выцягнуў яе з зямлі і жахнуўся — у скрыні былі гранаты часоў мінулай вайны.*

Трактарыст паведаміў аб сваёй знаходцы ў лесапункт, адкуль пазванілі ў Рэчыцу. Небяспечная знаходка знішчана спецыялістамі па размініраванню, якія імгненна адрэагавалі на трывожны званок.

## КРАДУЦЬ ТАМ, ДЗЕ ДРЭННА ЛЯЖЫЦЬ

*Паводле даных работнікаў праваахоўных органаў, у р*
*пачалі больш красці на прадпрыемствах, ва ўстановах і к*
*ных структурах. І крадуць, як правіла, там, дзе гаспад*
*клапоцяцца аб захаванасці ўласнай маёмасці.*

Супрацоўнікі Кастрычніцкага райаддзела ўнутраных спра
абследавалі на прадмет умення захоўваць уласнасць любой ф
прадпрыемствы, установы і арганізацыі, а таксама 228 кам
структур. Кіраўнікам прадпрыемстваў накіравана 141 прадс
складзена 25 адміністрацыйных пратаколаў. Толькі 39,7 прац
належным чынам успрынялі гэтую інфармацыю і далі пісьмов
аб тым, якія меры прымаюцца на вытворчасці па захаванасці
Маўчанне астатніх - сведчанне абыякавасці да ўласнасці.

Начальнік пазаведамаснай аховы раёна Анатоль Гнацюк
найбольш неабароненыя прадпрыемствы: гандлёвыя кропкі кам
структур, прадпрыемствы прамысловай зоны ў Калядзічах і
роднінныя магазіны, якія не ахоўваюцца.

## ЧАМУ Ж Я НЕ СОКАЛ?..

*На Віцебшчыне пачасціліся выпадкі выпадзення людзей з балконаў шматпавярховых дамоў. У асноўным «лятаюць» грамадзяне нападпітку, пасля няўдалай спробы зазірнуць з балкона ўніз.*

Як правіла, палёты «пад мухаю» заканчваюцца вялікімі непрыемнасцямі, а часта і смерцю. Так што, калі напіўся, не ўяўляй сябе сокалам, бо, як вядома, народжаны поўзаць лятаць не можа.

## ПАЖАРНІК УТАПІЎСЯ...

*Сумную статыстыку дыктуе летні адпачынак на вадзе: гінуць людзі, часцей за ўсё знаходзячыся ў нецвярозым стане.*

У Асіповіцкім раёне ў рацэ Сіняя знайшлі 25-гадовага К. Ля вёскі Камарына ў Пцічы ўтапіўся малады пажарнік з мясцовай пажарнай часці. Лезуць п'яныя ў ваду — і вось вынік...

## ЛЮДЗІ, ШТО КРУМКАЧЫ

*Не паспела высахнуць кроў у салоне легкавіка, у якім загінулі 7-га чэрвеня на дарозе Мінск—Нарач усе чатыры пасажыры, як на пакалечаную, раструшчаную ў аварыі машыну накінуліся, нібы крумкачы, марадзёры.*

Яны знялі з аўтамабіля колы, а з загінуўшых паздымалі дарагія рэчы.

## У ПАЛКУ БЕЛАРУСКАЙ МІЛІЦЫІ ПРЫБЫЛО

*У Акадэміі міліцыі МУС Рэспублікі Белар*
*ліпеня адбыўся чарговы выпуск. 160 ма*
*лейтэнантаў папоўняць рады работнікаў пр*
*хоўных органаў. Хоць у нейкай меры выр*
*кадравую праблему ў судовай экспе*
*асабліва ў рэгіёнах, дапамогуць 22 выпу*
*судова-медыцынскага факультэта.*

Дыпломы і лейтэнанцкія пагоны ўпершы
рымалі 13 курсантак. 28 выпускнікоў па
працаваць у Расію, а 1 — у Таджыкістан, па
вучыліся яны ў Беларусі па накіраваннях
гэтых дзяржаў.

Выпускнікам, якія дасягнулі асаблівых п
хаў у вучобе, уручаны, акрамя дыпломаў, га
выя граматы і грашовыя прэміі.

На свяце выпускнікоў акадэміі прысу
міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларус
Юрый Захаранка.